МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УА “ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ”

**УДК 572.9**
№ дзяржрэгістрацыі **20091312**
Інв.№

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
к.т.н.______________Д.А. Глухаў
____________________2011 г.

Polotsksu

С П Р А В А З Д А Ч А
**аб навукова-даследчай рабоце**

# “ТРАДЫЦЫІ ВЫХАВАННЯ І ПОБЫТУ ДЗЯЦЕЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ Ў КАН. XIX – ПАЧ. XXI СТСТ.”

(выніковая)

дамова с БРФФД **№ Г 09 Пл - 007** ад 01. 04. 2009 г.

Навуковы кіраўнік НДР
к.г.н., дацэнт ___________________С.У. Андрыеўская

" " _________________ 2011 г.

Нормакантралёр _________________Л.В. Дзмітрачэнка

" " _________________ 2011 г.

Наваполацк, 2011

СПІС ВЫКАНАЎЦАЎ:

Кіраўнік тэмы,
кандыдат гістарычных навук ____________________ Андрыеўская Святлана Уладзіміраўна

Выканаўцы тэмы:

____________________ Мішына Вера Іванаўна

_____________________ Даўгяла Наталля Віктараўна

_____________________ Магалінскі Ігар Уладзіміравіч

PolotskSU

# РЭФЕРАТ

Праца складаецца з 82 стар., 3 частак, выкарыстана 110 крыніц.

ТРАДЫЦЫЙНАЕ ВЫХАВАННЕ, ПОБЫТ ДЗЯЦЕЙ, НАРОДНАЯ ПЕДАГОГІКА, ГУЛЬНЯ, ЦАЦКА, АБРАД, СВЯТА, ПРЫКМЕТЫ, ПАВЕР'І, САНІТАРНА-ГІГІЕНІЧНЫЯ ЎМОВЫ, НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца традыцыі выхавання і побыт дзяцей у канцы XIX – пач. XXI стст. Мэтай даследавання з'яўляецца даследаванне традыцый выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння ў іх гістарычным генезісе з кан. XIX да пач. XXI стст. Для дасягнення мэты ставяцца наступныя задачы:

1. Вывучыць этнапедагагічныя прыёмы і метады выхавання дзяцей на тэрыторы Падзвіння з кан. XIX да пач. XXI стст.

2. Разгледзіць народныя медыцынскія і гігіенічныя прыёмы ў доглядзе дзяцей на тэрыторыі Падзвіння;

3. Вывучыць і праслядзіць змены у бытавых ўмовах выхавання дзяцей (харчаванне, прадметы быту, адзенне, абутак і інш.) з кан. XIX – пач. XXI стст.;

4. Даследаваць гульні і цацкі, іх ролю ў выхаванні дзяцей у кан. XIX – пач. XXI стст. на тэрыторыі Падзвіння;

5. Выявіць ролю і месца дзяцей у абрадах, вераваннях традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння.

У працэсе працы па навуковай тэме праведзена палявое этналагічнае даследаванне мэтай якога быў збор першаснай інфармацыі аб традыцыях выхавання і догляду дзяцей на тэрыторыі Падзвіння ў XX – пач. XXI стст. Сабраная інфармацыя апрацавана, выкарыстана ў тэксце працы. Абагулена інфармацыя аб калекцыях музеяў Падзвіння ў якіх захоўваюцца цацкі, прадметы дзіцячага быта. У даследаванні таксама выкарыстаны матэрыялы з архіваў, прымяняўся аналіз апублікаваных крыніц і літаратуры па тэме.

У даследаванні раскрываецца змест традыцыйных педагагічных уяўленняў адносна выхавання дзяцей, характэрных для тэрыторыі Прыдзвіння. Разгледжана месца дзяцей у сістэме роднасных сувязяў, роля традыцыйных гульняў і цацак у працэсе выхавання, прыкметы, павер'і, рытуальныя дзеянні, звязаныя з дзецьмі, санітарна-гігіенічныя ўмовы выхавання дзяцей, традыцыйныя метады і сродкі іх лячэння. У даследаванні паказана змены, якія адбыліся ў сферы выхавання і побыце дзяцей на працягу з канца XIX да пачатку XXI стст.

Матэрыялы, атрыманыя ў выніку даследавання, выкарыстаны ў вучэбным працэсе Полацкага дзяржаўнага універсітэта пры выкладанні курса "Гісторыя Беларусі (акт ад 29.06.2010 г.).

Вынікі даследавання таксама могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, пры напісанні навуковых прац па блізкай праблематыцы. Праблемы сучаснага грамадства ў сферы выхавання дзяцей патрабуюць пераасэнсавання лепшых набыткаў народных традыцый і ўкаранення іх у сучасны педагагічны працэс, таму матэрыялы, атрыманыя ў выніку даследавання, могуць быць скарыстаны ў педагагічнай практыцы сучасных сямей.

PolotskSU

ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ 5

1 ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ 7

2 ТРАДЫЦЫЙНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАЗВІННЯ 13
2.1 Народныя педагагічныя ўяўленні і сродкі выхавання дзяцей у сям'і на тэрыторыі Падзвіння 13
2.2 Дзеці ў сістэме роднасных і сваяцкіх адносінаў 24
2.3 Гульні і цацкі дзяцей на тэрыторыі Падзвіння 30
2.4 Дзеці ў традыцыйных абрадах, святах, вераваннях на Падзвінні 35
2.4.1 Узел дзяцей у абрадах і святах календарнага цыклу 35
2.4.2 Роля дзяцей у сямейных абрадах 43
2.4.3 Дзеці ў прыкметах і павер'ях 53
2.4.3.1 Прыкметы, павер'і і рытуальныя дзеянні, звязаныя з ростам і развіццём дзіцяці 53
2.4.3.2 Пабытовыя прыкметы і павер'і, звязаныя з дзецьмі 55

3 УМОВЫ ЖЫЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ І АСАБЛІВАСЦІ ПОБЫТУ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАДЗВІННЯ 58
3.1 Змена дэмаграфічнай сітуацыі з кан. XIX да пач. XXI ст. 58
3.2 Санітарна-гігіенічныя і бытавыя ўмовы жыцця, харчаванне дзяцей 61
3.3 Традыцыйны метады і сродкі лячэння дзяцей 65
3.4 Дзіцячай мэбля, вопратка 68

ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ І ПРАКТЫЧНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ АТРЫМАНЫХ ВЫНІКАЎ 72

ЗАКЛЮЧЭННЕ 74

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ 75


Polotsksu

# УВОДЗІНЫ

Цэласная сістэма выхавання дзяцей у беларусаў у мінулым існавала ў межах усеабдымнай сістэмы традыцыйнага ладу, з якой была цесна звязана і пастаянна ўзаемадзейнічала. Парушэнне або разбурэнне адной з іх выклікала адпаведныя працэсы ў другой. Традыцыйная культура беларусаў існавала і развівалася ў межах сям'і – роду – вясковай абшчыны. Перадача народнай культуры паміж пакаленнямі адбывалася паводле прынцыпу: рабі, як я (так званая дэманстратыўная антрапатэхніка). Грамадства праз сям'ю і абшчыну кантралявала працэс фарміравання новага члена і, перш чым прыняць яго ў дарослы калектыў, падвяргала даволі складаным іспытам. З першых дзён жыцця дзіцяці ішло паступовае, нязмушанае і адпаведнае ўзросту ўвядзенне фальклорна-этнаграфічнага локуса: калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, гульні, цацкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, казкі, дзіцячыя песні, паданні і легенды. Назіранні над прыродай, вопыт, веды аб навакольным асяроддзі ў значнай ступені былі зафіксаваны ў народным каляндары беларусаў, які арганізоўваў жыццядзейнасць селяніна дзень за днём на працягу года, адлюстроўваў цыклічнасць часу, паўтор сезонаў і месяцаў, кліматычных умоў кожнага з іх, у якім працоўныя будні рытмічна чаргаваліся са святамі [6, с. 4]. Адметную ролю ў выхаванні дзяцей адыгрываў іх непасрэдны ўдзел у каляндарных і сямейных святах і абрадах, дзе яны выконвалі строга рэгламентаваныя традыцыяй абрадавыя функцыі. Засваенне святочна-абрадавай і фальклорнай спадчыны ішло паэтапна, у адпаведнасці з народным разуменнем сувязі паміж функцыянальным і структурным узростам дзіцяці [6, с. 3].

У пачатку XXI ст. адбылося разбурэнне згаданай сістэмы народных традыцый. Аднак, у тых сферах, якія мала падвержаны мадэрнізацыйным працэсам, напрыклад у сямейным выхаванні дзяцей, традыцыі аказаліся больш трывалымі. Некаторыя прыёмы догляду дзяцей у сялянскіх сем’ях, вопыт народнай медыцыны, традыцыйнай народнай педагогікі ў адносінах да дзяцей захаваўся з XIX ст. да пач. XXI ст. Тэрыторыя Падзвіння з’яўляецца недастаткова даследаваным рэгіёнам, які мае свае адметнасці не толькі ў адносінах культуры дарослых, але і ў адносінах дзіцячага побыту і культуры. Крынічнай базай для рэгіянальных даследаванняў Падзвіння з’яўляюцца захаваныя этнаграфічныя матэрыялы XIX – XX ст., а таксама сучасныя палявыя даследаванні.

Для даследчыкаў традыцыйнага побыта дзяцей цікавасць прадстаўляе вывучэнне трансфармацыі некаторых звычаяў, сямейных народных традыцый у адносінах да дзяцей у XX – XXI стст. Невывучанымі застаюцца аспекты захавання традыцый народнага выхавання ў сучаснай беларускай сям’і. На тэрыторыі Падзвіння на працягу з XIX да пач. XXI стст. адбыліся значныя якасныя змены, што з’яўляецца натуральным. Аднак, некаторыя метады, прыёмы догляду за дзецьмі засталіся амаль некранутымі за такі значны прамежак часу.



Polotsk.su

Падзвінне з’яўляецца ўнікальным этнаграфічным рэгіёнам, які адрозніваецца ад іншых сваімі ланшафтнымі, прыроднымі, гістарычнымі асаблівасцямі. Спроба вывучэння асаблівасцей выхавання і побыта дзяцей на тэрыторыі Падзвіння ажыццяўляецца ў дадзенай працы ўпершыню.

Звязаныя з доглядам дзяцей забабоны, прыкметы, забароны не зніклі ў XXI ст., а працягваюць існаваць і перадавацца сярод насельніцтва беларускага Падзвіння. Застаючыся перыферыйнай сфера дзяцінства ў побыце беларусаў захоўвае шмат архаічных, традыцыйных элементаў. Даследаванне такіх элементаў дапаможа зразумець механізм іх захавання, дазволіць больш дасканала вывучыць народную культурную спадчыну Падзвінскага рэгіёна, паказаць этнакультурныя асаблівасці вывучаемага рэгіёна з пункту гледжання этнаграфіі дзяцінства. Асноўнай крыніцай інфармацыі ў дадзенай працы сталі этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя ў выніку палявога даследавання, ці здабытыя ў выніку працы ў бібліятэках і архівах. Асноўнымі метадамі для здабычы інфармацыі павінны стала этнаграфічнае назіранне і фіксаванне інфармацыі. У межах пазначанай тэмы для збора інфармацыі выкарыстаны метад уключанага назірання.

Мэтай даследавання з’яўляецца пабудова цэласнай карціны побыта дзяцей і традыцый народнай педагогікі ў выхаванні на тэрыторыі беларускага Падзвіння ў іх гістарычным генезісе з кан. XIX да пач. XXI стст.

Праблема традыцый сямейнага выхавання і побыту дзяцей патрабуе даследавання наступных аспектаў: сямейныя адносіны і міжпакаленная трансмісія культуры, абрады пераходу з адной узроставай групы ў другую, сродкі і метады сямейнага выхавання ў сям’і.

Вывучэнне такой жыццёвай фазы, як дзяцінства, яго межаў, нацыянальна-адметных рыс, ролі ў полаўзроставай структуры грамадства і сям’і ў розныя часы, у сямейным жыцці, сямейных святах і абрадах робіць даследаванне гэтага пытання актуальным. У сямейна-бытавых уяўленнях беларусаў вылучаюць пяць фаз узроставай дыферанцыяцыі: дзеці, палеткі, моладзь, дарослыя, старыя. Заканчэнне дзяцінства ў народнай свядомасці звязвалася не столькі з біялагічнай сталасцю, колькі з сацыяльнай самастойнасцю, псіхалагічнай спеласцю, таму супрацьпаставіць дзяцінству як асобнай сацыяльнай фазе можна толькі дарosласць, што патрабуе падзелу дзяцінства на больш дробныя этапы. Дзяцінства ў многіх народаў інстытуцыіравана перыядам ад нараджэння да 18 гадоў [84, с. 43]. Вызначаныя межы з’яўляюцца ўмоўнымі. У дадзенай навуковай працы выкарыстана такая сістэма вызначэння перыяда дзяцінства.

Дадзеная тэма выкоўваецца ў межах навуковага накірунку, вызначанага як фундаментальны для Полацкага дзяржаўнага універсітэта “Гістарычныя і сацыялагічныя даследаванні грамадскага і культурнага развіцця Полацкай зямлі.”

# 1 ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

Гістарыяграфія праблемы вывучэння традыцый сямейнага выхавання і побыту дзяцей у кан. XIX – пач. XXI стст. дастаткова багатая ў адносінах да тэрыторыі Беларусі ўвогуле, але толькі невялікая яе частка датычыцца тэрыторыі беларускага Падзвіння.

Асаблівасцю навуковых прац з'яўляецца адсутнасць рэгіянальнай дыферынцыяцыі, г.зн. даследчыкі вывучалі дзіцячы побыт, выхаваўчыя народныя традыцыі на тэрыторыі Беларусі, не вылучаючы рэгіянальнай спецыфікі. Як слушна пазначае даследчыца Л.В. Ракава, літаратура, у якой разглядаюцца традыцыі выхавання і побыту дзяцей, бязмежная. Аднак, ступень навуковай каштоўнасці літаратуры неаднолькавая [80, с. 27].

Даследаванні па праблеме можна падзяліць на некалькі напрамкаў: педагагічны, культуралагічны і этналагічны. Для кожнага напрамка характэрны свае акцэнты і асаблівасці. Для педагагічнага напрамка характэрны акцэнт на вывучэнне традыцый народнай культуры беларусаў як крыніцы педагагічных традыцый. Найбольш даследчыкаў гэтага накірунку цікавіць выхаваўчы “патэнцыял” бацькоў, дзіцячай субкультуры і г.д. Асноўнымі для напрамка сталі праблемы грамадскага і сямейнага выхавання, фарміраванне этнапедагагічнай культуры бацькоў.

Для культуралагічнага напрамку цікавасць уяўляюць роля ў традыцыйным выхаванні дзяцей вуснай народнай творчасці, рамёстваў, народных звычаяў, абрадаў, рытуалаў, свят і г.д.

Для этналагічнага напрамка найбольшую цікавасць прадстаўляць спосабы трансмісіі этнічнага вопыту, сацыяцыялізацыя дзяцей у традыцыйным грамадстве, этнічныя традыцыі выхавання.

Аналітычны агляд літаратуры паказаў, што першыя спробы навуковага асэнсавання і сістэматызацыі матэрыялаў па праблеме традыцыйнага выхавання ў сям'і і побыце дзяцей былі зроблены ў XIX ст. Неабходнасць ведання народных традыцый, вызначэнне ступені іх захаванасці ў сучаснасці абумовіла цікавасць да праблемы з пункту гледжання этнаграфіі. Вывучэнне і асэнсаване каштоўнасцей народнай педагогікі беларусаў пачалося ў кан. XIX ст., калі з'явіліся працы этнографаў, у якіх змяшчаліся некаторыя звесткі аб традыцыйных нормах выхавання, педагагічных прынцыпах і прыёмах, ролі сям'і ў выхаванні і перадачы этнічных традыцый. Увагу працоўнай дзейнасці дзяцей, гульням, звычаям і абрадам з удзелам дзяцей на тэрыторыі Беларусі надавалі даследчыкі XIX – пач. XX ст.: М.Я. Нікіфароўскі [70 – 72], М.В. Доўнар-Запольскі [29], А.К. Сержпутоўскі [90], П.В. Шэйн [57 – 60], Е.Р. Раманаў [86]. У іх працах закрануты асобныя аспекты выхавання дзяцей [38, с. 138]. Напрыклад, некаторыя звесткі аб побыце дзецей у Падзвінскім рэгіёне ўтрымліваюцца ў “Материалах для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края...” [57 – 60], сабраных П.В. Шэйнам. У т.

PolotskSU

1. “Бытавое і сямейнае жыццё беларуса ў абрадах і песнях” [57] апісваецца радзінны абрад і хрэсьбіны, павер’і і прыкметы, якія датычацца дзяцей, прадстаўлены хрэсьбінныя песні, калыханкі і дзіцячыя песенкі з Віцебскай і Віленскай губерняў. У другім томе ”Матэрыялаў” [59] змешчаны казкі жывёльнага свету, міфічныя і бытавыя, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы ад дзіцячых хвароб. Н. Анімеле ў раздзеле “Хрэсьбіны” апісвае абрады “радзін”, “адведак”, “хрышчэння” у Віцебскай губерні [5]. У працы А. Кіркора таксама змешчаны некаторыя дадзеныя аб святкаванні радзінаў і хрэсьбінаў у Віленскай губерні [42]. Некаторыя этнографы звярталі ўвагу на прыёмы догляду за дзецьмі. Е.А. Пакроўскі падрабязна апісвае працэс загортвання дзяцей у пялюшкі, традыцыйныя спосабы карэкцыі чэрапа немаўлят, такі прыём народнай педыятрыі, як масаж, некаторыя спосабы фізічнага выхавання дзяцей [78]. Значнае месца ў апісанні дзіцячых гульняў займаюць матэрыялы М.Я. Нікіфароўскага, сабраныя ім ў Віцебскай губерні [70 – 72]. Вельмі каштоўнымі для выяўлення механізма трансмісіі традыцыйнай культуры з’яўляюцца змешчаныя ў артыкуле “Игры и игроки” [70] апісанні адносінаў паміж старымі бабулькамі, дзядулькамі і дзецьмі ў працэсе гульні.

У адносінах збора першаснай інфармацыі па праблеме традыцыйнага сямейнага выхавання і побыта дзяцей у XX ст., сітуацыя наступная: тэма разглядалася толькі ў кантэксце іншых праблем. Аб актывізацыі палявых этналагічных даследаванняў у 1990 – я г. сведчыць распрацоўка шэрагу апытальнікаў для збору матэрыялаў і публікацыі сабраных матэрыялаў. З’явіліся апытальнікі для збору матэрыялаў па каляндарнай абраднасці беларусаў, сучаснаму стану традыцыйнай культуры, беларускаму народнаму касцюму, беларускаму танцавальнаму фальклору, па народнай прозе; у тым ліку, і для вузкарэгіянальных даследаванняў (напрыклад, Іванцаўскага р-на Брэсцкай вобласці, Мазырскага Палесся) [91]. Сярод іншых найбольшай тэматычнай блізкасцю вылучаецца апытальнік, складзены І.С. Сычовай [92] па народнай педагогіцы. Нажаль, падобнай метадычнай распрацоўкі для Падзвіння няма. Інфармацыя аб побыце дзяцей утрымліваецца ў этналагічных зборніках па іншай тэматыцы. Напрыклад, у “Полацкім этнаграфічным зборніку” [76; 77], прысвечаным народнай медыцыне беларусаў Падзвіння, сустракаецца апісанне традыцыйных метадаў лячэння дзяцей. Цікавасць уяўляе дапаможнік, выдадзены ў Віцебскім педагагічным універсітэце імя П.М. Машэрава ў 2007 г. “Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах” [26], складзены на падставе экспедыцыйных палявых запісаў. Зборнік змяшчае калыханкі, забаўлянкі, песні, заклічкі, дражнілкі, лічылкі, жэраб’ёўкі, сабраныя і сітэматызаваныя студэнтамі і выкладчыкамі навучальнай установы. Фальклорныя тэксты з Віцебскай вобласці таксама ўтрымліваюць: зборнік, складзены з экспедыцыйных матэрыялаў студэнтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка “Дзіцячы фальклор: зборнік матэрыялаў” [27], пад рэдакцыяй У. А. Васілевіча, выдадзены ў 2006 г. і акадэмічны зборнік “Дзіцячы



Polotsk SU

фальклор” 1972 г. [28]. У 2004 г. выйшла калектыўная праца, прысвечаная малым жанрам дзіцячага фальклору [52], якая змяшчае не толькі аналітычныя матэрыялы, але і фальклорныя тэксты. У ХХ ст. выйшла некалькі буйных прац, прысвечаных вывучэнню дзяцінства, ажыццяўляецца спроба разглядаць гэты напрамак, як асобны ў рамках этналагічнай навукі.

Даследчык пачатку ХХ ст. М. Каспяровіч прыйшоў да высновы, што побыт дзяцей мае асаблівасці не толькі ў розных нацыянальнасцей, але і ў горадзе і ў вёсцы [41, с. 16 – 19]. У 30 – 40 гг. ХХ ст. адбылося фарміраванне этнапедагогікі як навуковага напрамку. У савецкай навуцы гэты тэрмін упершыню пачаў ужываць у 70-я г. ХХ ст. акадэмік Г.Н. Волкаў. Найбольш грунтоўна ў савецкі перыяд вывучала беларускія народныя педагагічныя традыцыі Г.П. Арлова [6 – 8], яна на шматлікіх фальклорных матэрыялах (у першую чаргу, прыказках, прымаўках, казках, песнях) прааналізавала педагагічныя ідэі і выхаваўчы вопыт беларускага народа. Даследчыца вызначыла маральны і фізічны ідэал беларускага народа, прынцыпы эстэтычнага выхавання, таксама разгледзіла народна-педагагічныя сродкі і метады выхавання ў беларускім народам падрастаючага пакалення [6]. У.М. Конан упершыню ў айчыннай навуцы прапаноўвае гісторыка-метадалагічны падыход да высвятлення сутнасці і ўзаемасувязі паняццяў "этнапедагогіка," "этнічная культура" [45]. У 1996 г. выйшла калектыўная кніга “Народная педагогіка беларусаў” [65], у якой разглядаюцца народныя традыцыі і іх выкарыстанне ў пач. ХХ ст., нажаль, рэгіянальныя асаблівасці ў выхаванні не аналізуюцца.

У 90 г. ХХ ст. ролю этнічных традыцый у духоўнай культуры беларусаў даследавалі І.В. Казакова [34], І.І. Калачова [35 – 37] і інш. І.І. Калачова вылучае народныя традыцыі і звычаі выхавання, даследуе традыцыі і звычаі беларусаў і прадстаўнікоў іншых этнасаў, што жылі на Беларусі. Цікавай у адносінах да пазначанай тэмы даследавання з’яўляецца манаграфія І.І. Калачовай “Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям’і беларусаў у апошняй чвэрці ХХ – пачатку ХХІ ст.” [36]. У манаграфіі прапануецца тэарэтыка-метадалагічная канцэпцыя дынамікі этнакультурных працэсаў у гарадской сям’і беларусаў у апошняй чвэрці ХХ – пачатку ХХІ ст. Даследчыца надае значнае месца даследаванню механізма пераемнасці традыцый як фундаментальнага прынцыпу функцыяніравання этнакультурных працэсаў у сям’і беларусаў, акрэсліваецца іх уплыў на этнакультурныя працэсы, іх абнаўленне, паскарэнне і ўзбагачэнне новымі тэндэнцыямі ў шлюбна-сямейных і роднасна-сваяцкіх адносінах; прапануецца прагнозная мадэль развіцця этнакультурных працэсаў праз фарміраванне сістэмы сацыякультурнай, адукацыйнай і выхаваўчай працы.

Асаблівасці народнай педагогікі, традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы разглядала ў сваіх манаграфіях і артыкулах Л.В. Ракава [80 – 84]. У артыкулах яна скіроўвае ўвагу на разгляд праблемы сямейнага міжпакаленнага ўзаемадзеяння ў час народных святаў, абрадаў [80; 81; 83]. У 2009 г. выйшла новая манаграфія Л.В.



Polotsk SU

Ракавай “Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст.” [84], у якой упершыню ў беларускай этнаграфіі на падставе матэрыялаў шматгадовых экспедыцыйных даследаванняў, дакументальных і літаратурных крыніц аналізуецца працэс эвалюцыі традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. ва ўзаемасувязі з сацыяльнай структурай грамадства, тыпам, структурай і сацыяльным статусам сям’і. У працы акцэнт зроблены на ролі сям’і як найважнейшага інстытута выхавання і сацыялізацыі ў традыцыйным і сучасным грамадстве. У манаграфіі апісаны выхаваўчыя традыцыі не толькі сялян, але і гараджан, шляхты. Даследчыца выкарыстала надзвычай шырокая кола крыніц, сярод якіх этнаграфічныя запісы, архіўныя матэрыялы, літаратурныя творы.

Этнолаг і фалькларыст А.С. Фядосік [97], аналізуючы беларускую сямейна-абрадавую паэзію, закранае тэму дзяцінства. Ён прыводзіць класіфікацыю забарон, накіраваных на засцярогу немаўляці, а ў хрэсьбінных песнях навуковец вылучае рэшткі міфалагічнага мыслення беларусаў. Г.А.Барташэвіч у кнізе “Вершаваныя жанры беларускага дзяцічага фальклору” [11] вывучае дзіцячыя лічылкі, прыказкі, вершы іншыя вусны формы народнай творчасці, звязаныя з дзецьмі. Датычацца вывучэння побыту дзяцей і іншыя яе працы [12]. У зборніку “Гульні, забавы, ігрышчы” [23], сярод гульняў, звязаных са святамі і абрадавых гульняў, сабраны і дзіцячыя гульні. Шэраг аўтараў у межах этнаграфіі дзяцінства вывучалі радзінную абраднасць. На думку даследчыцы І.С. Махоўскай [61] інтэграцыя немаўляці ў культурнае асяроддзе, пераразмеркаванне “калектыўнай Долі” і наданне дзіцяці культурных прызнакаў і “індывідуальнай Долі” з’яўляецца адзіным працэсам, прадстаўленым у традыцыйнай радзіннай абраднасці, якая мае складаную шматузроўневую структуру [61, с. 91]. Т.І. Кухаронак [51; 52] разглядае радзінныя звычаі і абрады беларусаў, адносіны сялян да дзяцей. Даследчыца вывучае традыцыйную радзінную абраднасць як першапачатковы этап перадачы соцыякультурнага вопыту [51, с. 15]. Цікавыя высновы і фактычны матэрыял утрымліваецца ў грунтоўнай калектыўнай працы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора НАН Беларусі “Беларусы. Т.5. Сям’я” [13]. Асобныя часткі тома прысвечаны дзіцячаму побыту, у тым ліку харчаванню, адзенню, прадметам дзіцячай мэблі і г.д. У кнізе грунтоўна апісаны і прааналізаваны гульні і забавы дзяцей. Значная частка прац беларускіх даследчыкаў закранае этнапедагагічныя аспекты. Манаграфія даследчыцы Міхайлавай А.Л. [62; 63] прысвечана праблемам фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы кан. XIX – пач. XX ст. У працы выяўлены ўзаемасувязі паміж маральным і фізічным здароўем у беларускай народнай педагогіцы. Да асобных праблем выхавання ў беларускай народнай педагогіцы звяртаюцца А.А. Грымаць [20; 21], Л.М. Варанецкая, Ю. В. Мялешка [18]. Іх навуковыя распрацоўкі маюць як тэарэтычнае, так і практычнае значэнне, цікавыя для даследчыкаў, бацькоў, настаўнікаў і выхавальнікаў. Даследчык В.С. Болбас [14; 15] дасканала даследаваў

праблему маральнага выхавання ў народнай педагогіцы беларусаў. Ён з'яўляецца аўтарам шэрагу навуковых артыкулаў, кніг, у якіх пададзены тэарэтыка-метадалагіны падыход да даследавання этычных аспектаў народнай педагогікі беларусаў [14 – 15]. Т. Яцкевіч праводзіць аналіз дзіцячых прадметаў мэблі другой паловы XIX – першай паловы XX стагоддзяў [109]. Даследчыкі народнай педагогікі І.С. Сычова [91 – 92], С.Р. Туболец [96], вывучаюць прынцыпы эстэтычнага выхавання, іх вытокі і рэалізацыю ў народнай педагогіцы беларусаў. Народную педагогіку беларусаў як крыніцу захавання маральных каштоўнасцей разглядаюць педагогі А. Рудкоўская [87], В. Сямёнава [93], П. Ражнова [85]. Этнолаг А.Д. Якубінская [108] – разглядае сацыялізацыю беларускіх дзяцей. Аспектамі вывучэння А.Д. Якубінскай сталі: вызначэнне спосабаў і сродкаў сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян, вывучэнне заканамернасцяў трансляцыі і рэпрадукцыі этнічнай культуры беларусаў у кан. XIX – пач. XX ст. Вылучыць рэгіянальную спецыфіку даследчыца не ставіць у якасці задачы.

Такім чынам, падсумоўваючы вышэй прааналізаваныя працы, прыходзім да высновы, што большасць з іх разглядае традыцыйнае сямейнае выхаванне, побыт дзяцей на тэрыторыі Беларусі "ўвогуле", не вылучаючы рэгіянальныя асаблівасці. Акрамя таго, некаторыя праблемы засталіся па-за ўвагай этнолагаў, педагогаў, культуролагаў.

Тэрыторыя Падзвіння з'яўляецца цэласным і недастаткова даследаваным (як бачна з гістарыяграфічнага аналіза) рэгіёнам, які мае свае адметнасці не толькі ў адносінах культуры дарослых, але і ў адносінах дзіцячага побыту. Некаторыя прыёмы догляду дзяцей у сем'ях, вопыт народнай медыцыны, традыцыйнай народнай педагогікі ў адносінах да дзяцей захаваўся з кан. XIX ст. аж да пач. XXI ст.

**Мэтай даследавання з'яўляецца даследаванне традыцый выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння ў іх гістарычным генезісе з кан. XIX да пач. XXI стст.** Для дасягнення мэты ставяцца наступныя **задачы:**

1. Вывучыць этнапедагагічныя прыёмы і метады выхавання дзяцей на тэрыторы Падзвіння з кан. XIX да пач. XXI стст.

2. Разгледзіць народныя медыцынскія і гігіенічныя прыёмы ў доглядзе дзяцей на тэрыторыі Падзвіння;

3. Вывучыць і праслядзіць змены у бытавых ўмовах выхавання дзяцей (харчаванне, прадметы быту, адзенне, абутак і інш.) з кан. XIX – пач. XXI стст.;

4. Даследаваць гульні і цацкі, іх ролю ў выхаванні дзяцей у кан. XIX – пач. XXI стст. на тэрыторыі Падзвіння;

5. Выявіць ролю і месца дзяцей у абрадах, вераваннях традыцыйнай культуры беларусаў Падзвіння.

Абраная методыка даследавання – этнаграфічнае назіранне, апісанне і абагульненне сабранага матэрыяла. У даследаванні прымяняецца аналіз апублікаваных крыніц і літаратуры па тэме. У працы асноўнымі метадамі



PolotskSU

з’яўляюцца гістарычна-генетычны і гістарычна-параўнальны метады, у асобных выпадках – метад гістарычнай рэтраспекцыі. Асноўнымі навуковымі прынцыпамі з’яўляюцца: прынцып аб’ектыўнасці і гістарызму.

Асноўнай крыніцай інфармацыі з’яўляюцца этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя ў выніку палявых даследаванняў, а таксама звесткі, здабытыя ў выніку працы ў бібліятэках, архівах, музеях.

Матэрыялы, атрыманыя ў выніку даследавання могуць знайсці практычнае выкарыстанне ў педагагічным працэсе сучасных устаноў адукацыі для стварэння спец. курсаў і асобных лекцый для студэнтаў і школьнікаў у межах вывучэння гісторыі роднага краю, гісторыі педагогікі, этнаграфіі, краязнаўства, а таксама могуць быць выкарыстаны для навуковых прац па этналогіі.

PolotskSU

# 2 ТРАДЫЦЫЙНАЕ ВЫХАВАННЕ ДЗЯЦЕЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАЗВІННЯ

## 2.1 Народныя педагагічныя ўяўленні і сродкі выхавання дзяцей у сям'і на тэрыторыі Падзвіння

Традыцыя – устойлівая этнакультурная з' ява (звычай, норма), якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, з'яўляецца феноменам культуры і асновай народнай творчасці. Яна адыгрывае галоўную ролю ў працэсе трансмісіі культурных каштоўнасцей, тым самым забяспечвае развіццё этнасу.

Сям'я з'яўляецца персанальным асяроддзем жыцця чалавека ад нараджэння да смерці, бо ад яе залежыць фізічнае, маральнае, сацыяльнае развіццё чалавека на працягу ўсяго жыццёвага цыклу. У сярэдзіне XIX – пач. XX стст. на Беларусі існавалі дзве формы сям'і: непаздзельная бацькоўская ці непадзельная брацкая (складалася з некалькіх шлюных пар з прамым ці бакавым сваяцтвам), якія вялі агульную гаспадарку і малая (адна шлюбная пара, часам, з адным з бацьком ці нежанатым родзічам). Непаздзельная бацькоўская сям'я вылучалася большым захаваннем традыцыйных рыс, што было звязана з неабходнасцю цэнтралізаванага кіраўніцтва, а таксама большай колькасцю дзяцей [84, с. 180].

У канцы XIX ст. адбывацца змены ў беларускай сям'і: спрашчаецца яе структура, змяншаецца пакаленны і колькасны склад. У вясковай сям'і, па дадзеных беларускага этнографа Г.М. Курыловіч, у неразделенай сям'і ў сярэднім было 8-10 дзяцей, а кожная шлюная пара мела 3-4, радзей 5-6 дзяцей. У гарадской сям'і, па дадзеных этнографа Л.В. Ракавай, дзе пераважала малая нуклеарная сям'я, звычайнай была сям'я з 2-3 дзецьмі [84, с. 92].

На працэс захавання элементаў народных традыцый у выхаванні дзяцей моцна ўплываюць змены, якія адбываюцца ў сям'і. Калі для традыцыйнай сям'і беларусаў характэрны ўстойлівасць, стабільнасць, высокая статусная роля сям'і ў жыцці кожнага чалавека, якая ў многім забяспечвалася ўстойлівасцю норм традыцыйнага права і сямейнымі традыцыямі, то для сучаснай сям'і характэрна павышаная аўтаномнасць асобы, высокая ступень матэрыяльнай незалежнасці партнёраў па шлюбе. Калі стратэгічнай лініяй выжывання традыцыйнай сям'і было збераджэнне ладу жыцця старэйшага пакалення, сацыялізацыя дзяцей у межах існуючых каштоўнасцей, то ў сучаснай сям'і значны ўплыў на выхавання дзяцей аказваюць грамадскае асяродзе, сацыяльныя інстытуты адукацыі [84, с. 100].

Для разумення ўмоў сямейнага выхавання ў беларусаў важнае значэнне мае разгляд умоў побыту, асаблівасцей харчавання, догляду дзяцей. Паколькі, у этнічным выхаванні кожнага канкрэтнага этнаса прысутнічаюць канкрэтныя дамінанты выхавання і навучання, якія залежаць:

- ад ланшафту, клімата, біялагічных і хіміка-біялагічных уплываў жыццёвага асяродку;



Polotsksu

- ад гісторыі народа, моўных асаблівасцей, псіхалагічных асаблівасцей этнаса, якія ўключаюць у сябе пераважаючы тып тэмперамента, традыцыйныя срокі вырашэння канфліктаў;

- харызматычных і культурных герояў, якія характэны для дадзенага этнаса;

- пераважаючага сацыяльнага ладу, галоўных тыпаў жыццядзейнасці па яго забеспячэнні;

- традыцый, звычаяў, нораваў, правілаў і нормаў паводзінаў, адлюстраваных у культуры этнаса;

- знешнепалітычнага асяроддзя і эканамічных сувязей, а таксама шэрагу іншых фактараў [69, с. 70].

Народныя педагагічныя традыцыі беларусаў арганічна ўпляталіся ў сістэму ўзаемадзеяння традыцыйнага грамадства і навакольнага асяроддзя. Народная педагогіка – гэта сукупнасць ведаў і навыкаў выхавання, якая захавалася ў этнакультурных традыцыях, народнай паэтычнай творчасці, устойлівых формах камунікацыі і ўзаемаадносін дзяцей з дарослымі і адзін з адным [69, с. 71].

Некаторыя даследчыкі не праводзяць мяжы паміж этнапедагогікай і народнай педагогікай, апісваючы традыцыйны народны вопыт у выхаванні, выкарыстоўваюць тэрмін “этнапедагогіка.” Паспрабуем размежаваць два паняцці.

Этнапедагогіка як навуковая галіна сфарміравалася ў 30-40 г. XX ст. Яна з’явілася як міждысцыплінарная галіна ведаў на сутыку этналагічных, энтрапалагічных і псіхолагічна-педагагічных навук. Пачатак даследаванням у ёй паклалі навукоўцы Маргарэт Мід і Джон Уайтінг, якія вывучалі традыцыйную бытавую культуру, шлюбныя і сямейны адносіны, полаўзроставы падзел працы, спосабы выхавання і сацыялізацыі дзяцей. У савецкую навуку тэрмін “этнапедагогіка ” быў уведзены ў 70-я гады акадэмікам Г.Н. Волкавым у працы “Этнапедагогіка.” Этнапедагогіку ён вызначыў як навуку аб вопыце народных масс па выхаванню падрастаючага пакалення; аб народных педагагічных поглядах, навуку аб педагогіцы побыта, аб педагогіцы сям’і, роду, племені, нацыі [69, с. 68]. Ён жа вызначыў і асноўныя адрозненні паміж тэрмінамі “народная педагогіка” і “этнапедагогіка”: народная педагогіка мае адносіны да вопыта, яго апісання, этнапедагогіка – сфера тэарытычнай думкі, сфера навукі [69, с. 69].

Народная педагогіка – гэта сукупнасць педагагічных звестак і выхаваўчага вопыту, што захаваліся ў вуснай народнай творчасці, звычках, святах, гульнях, дзіцячых цацках і г.д.

Народная педагогіка з’яўляецца фундаментам на якім узнікла і развівалася педагагічная навука. Народная педагогікай можна назваць увесь традыцыйны выхаваўчы вопыт этнаса, які ўключае як народнае, г.зн. уласцівае многім народам, выхаванне, так і этнічнае, якое фарміруе сярод прадстаўнікой дадзенага этнаса самабытную этнічную культуру, этнічную самасвядомасць і нацыянальны менталітэт.

Polotsksu

Навуковая педагогіка разглядае выхаванне як спецыяльна арганізаваны мэтанакіраваны працэс, як скіраваны на ўсебаковае развіццё асобы. У арозненні ад яе, выхаванне ў народнай педагогіцы заўсёды носіць скрыты характар. Яно арганічна ўплецена ў жыццё, быт і працу народа. У традыцыйнай сем'і спецыяльна не займаюцца выхаваннем, дзяцей выхоўвае само жыццё. У народнай педагогіцы і выхаванцы і выхавацелі не з'яўляюцца ўдзельнікамі спецыяльных выхаваўчых мерапрыемстваў. У працэсе самаго жыцця народ арыентуе дзяцей на прадметную дзейнасць: дапамога ў хатніх справах, праца ў садзе, на агародзе, поле, догляд за хатнімі жывёламі і г.д. Пры гэтым у дзяцей фарміруцца каштоўнасныя арыентацыі, маральныя якасці. Сутнасць і мэта народнага выхавання – у тым, што дзіця не рыхтуецца да жыцця, а жыве. Крыніцамі вывучэння народнай педагогікі з'яўляюцца фальклор, этнаграфічныя, антрапалагічныя матэрыялы, археалагічныя знаходкі, мемуарная літаратура і інш. Нарматыўныя патрабавані народнай педагогікі пераважна змяшчаюцца ў вуснай народнай творчасці (традыцыйная, народная, фальклорная педагогіка). Прадстаўленая ў фальклорных тэкстах і абрадах, народная педагогіка ў сукупнасці складае цэласную выхаваўчую канцэпцыю [69, с. 69].

Сэнс выхавання ў традыцыйнай беларускай сям'і заключаецца ва ўмацаванні пераемнасці пакаленняў на аснове традыцый. Можна пагадзіцца з даследчыцай Л.В. Ракавай у тым, што паняцце "выхаванне" адрозніваецца ў навуковым і народным разуменні. На падставе аналіза актавых дакументаў XVI – XVII стст. яна прыходзіць да высновы, што пад выхаваннем у сем'ях беларусаў разумелася не толькі мэтанакіраванае педагагічнае ўздзеянне на асобу дзіцяці, але і забеспячэнне яго ўсім неабходным: жыллём, адзеннем, ежай [84, с. 176]. Такое разуменне тэрміна выхаванне дайшло да нашага часу, найбольш дакладна сэнс сямейнага выхавання перадаюць народныя выразы "гадаваць," "узгадаваць," "выгадаваць дзяцей".

Элементы народных педагагічных уяўленняў фіксуюцца ў вуснай народнай творчасці: прымаўках, прыказках, казках, песнях, анекдотах, жартах і г.д. Народная педагогіка ўплецена ў само жыццё народа, таму важнае значэнне для выхавання маюць побыт, звычаі, традыцыі, святы, абрады.

Існуе значная колькасць аўтарскіх класіфікацый сродкаў і метадаў выхавання ў беларускай народнай педагогіцы. Адна з даследчыц традыцый беларускай народнай педагогікі Міхайлава А.Л. [63, с. 47] прапануе наступную класіфікацыю сродкаў фарміравання маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы:

1. практычныя сродкі (праца і гульня);

2. этнакультурныя сродкі (*моўныя*: прыказкі, прымаўкі, анекдоты, жарты; *традыцыйна-пабытовыя*: казкі, песні, звычаі, традыцыі).

Даследчыца Г.П. Арлова [6, с. 7] асаблівую ўвагу надае працоўнаму выхаванню. Яна падкрэслівае, што гістарычныя і прыродна-геаграфічныя ўмовы паўплывалі на развіццё характэрных для беларусаў відаў працоўнай дзейнасці,

сфарміравалі такія маральныя якасці, як працавітасць, патрыятызм, цярплівасць, настойлівасць, сумленнасць, сціпласць, ашчаднасць, паважлівыя адносіны да людзей працы, да хлеба надзённага [6, с. 8]. Даследчыца А.Л. Міхайлава называе працоўнае выхаванне сярод практычных сродкаў.

Такім чынам, даследчыкі сходзяцца ў тым, што асновай народнага выхавання з'яўляецца працоўнае выхаванне. Гэты тэзіс падцвярджае і праведзенае ў межах тэмы палявое даследаванне.

**Працоўнае выхаванне.**

Праца – самы старажытны і апрабаваны сродак народнай педагогікі, паколькі народнае выхаванне ўзнікла і развівался, як працоўнае.

Для традыцыйнага грамадства характэрна ранняе ўключэнне дзіцяці ў працоўную дзейнасць. Этнографы XIX – пачатку XX ст., якія апісвалі побыт сялян на тэрыторыі Падзвіння, падкрэслівалі ранняе далучэнне дзяцей да працы.

У XX – пачатку XXI стст. традыцыі працоўнага выхавання дзяцей ў сям'і працягваюцца. У аповедзе кожнага з інфарматараў, апытаных ў межах палявой часткі даследавання тэрыторыі Падзвіння, важнае месца надаецца працоўнаму выхаванню. Інфарматары дэтальна апісвалі што дапамагалі рабіць дзеці сваім бацькам, да якой працы прывучаліся. У сялянскай сям'і, якая з'яўлялася гаспадарчай адзінкай, была вялікая патрэба ў рабочых руках. Таму ўсе дзеці разглядаліся не як абуза, а як памочнікі, сяляне змалку прывучалі дзяцей да працы. Гэта адбывалася паступова, у залежнасці ад ўзроста дзіцяці. Ужо пяці-шасцігадовыя дзеці мелі абавязкі па доме, ім даручаліся нескладаныя гаспадарчыя работы: падмесці ў хаце, на двары, пільнаваць агарод ад курэй, пасвіць гусей, глядзець за малодшымі. Абавязкам дзяцей было збіранне ягад, грыбоў, выпас жывёлы. Раннее ўключэнне дзяцей ў працу характэрна для традыцыйнага грамадства многіх народаў. У беларусаў Падзвіння панавала перакананне, што ўсе *"павінны працаваць з малых гадоў"* [9, фонд 6. – воп.11. – спр. 247. – л. 17]. Сярод рэспандэнтаў распаўсюджана меркаванне аб тым, што варта дзяцей прывучаць да працы, каб яны маглі дасягнуць дабрабыту, багацця ў дарослым жыцці. Частай матывацыяй ранняга ўключэння дзяцей у сялянскую працу з'яўлялася беднасць сям'і, шматдзетнасць, хвароба аднаго з дарослых членаў сям'і (ці яго смерць) і г.д. *"Мамка мая дужа хварэла, дык я малая, гадоў у восем і карову даіла і есці варыла"*[1]. Працалюбства лічылася важнай якасцю, што ўздымала прыстыж сям'і ці асобнага чалавека. Сяляне імкнуліся развіваць матывацыю працы ў дзяцей ("ніякай працы не баяліся"), інтуітыўна яны разумелі, што гэтага можна дасягнуць праз гульню і заахвочвалі гульні з цацкамі, сярод якіх пераважалі прадметы хатняга ўжытку, прылады працы. Працоўнаму выхаванню спрыялі і імітацыйныя гульні, у якіх узнаўляліся працоўныя аперацыі. Ёсць шмат і беларускіх народных танцаў, паўтараюць працоўныя аперацыі. З

[1] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэнка А.П., 1935 г.н., в. Федарэнкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці.

ранняга дзяцінства дзецям унушалася, што праца не толькі крыніца існавання, але і апірышча ў жыцці ("рамясло за плячамі не насіць"). Працоўныя традыцыі складваліся стагоддзямі і няўхільна падтрымліваліся ў сям'і. Па словах, П.В. Шэйна, з 10 – 12 гадоў падлетак актыўна ўключаўся ў выкананне сельскагаспадарчых мужчынскіх абавязкаў (касіў, араў), да гэтага з 6 – 7 гадоў ён выконваў пастухоўскія абавязкі [57, с. 79]. Многія з рэспандэнтаў, дзяцінства якіх прайшло ў 1-й палове ХХ ст. узгадваюць аб раннім уключэнні ў працу.

Здольнасць дзяўчыны ці хлопца да працы ўлічвалася пры выбары жаніха ці нявесты. *"Добрая дзеўка была, і прасці і ткаць умела, усю сям'ю абшывала…"*. [2]

Працоўнае выхаванне адбывалася дыферынцыянавана ў залежнасці ад пола дзіцяці. Для хлопчыкаў, па словах П.В. Шэйна, з 7 гадоў пачынаўся "пастухоўскі век." [57, с. 79]. Традыцыя аддаваць "у пастушкі" на тэрыторыі Падзвіння захавалася сярод бяднейшых, шматдзетных сямей да 1-й пал. ХХ ст. Адна з рэспандэнтак (1934 г.н.) з Браслаўшчыны расказвала: *"А аднага брата Янку да людзей аддалі ў сям'ю, авечак пасьціць. І кароў пасьціў, усіх… Далёка, аж ў Замошша, доўга ехаць па лесе. Вясной бацька адвязець, а як на зіму, то – забіралі… Сем гадоў было і авечак пасьціў і кароў…"*. [3] Калі хлопчыкі падрасталі, бацька браў іх на працу ў полі: яны павінны былі араць, касіць, баранаваць і г.д. Хлопчыкі, такім чынам, паступова прывучаліся да "мужчынскай працы," спазнавалі таямніцы добрага гаспадарання. Уплыў на іх бацькі станавіўся усё больш моцным, роля маці – змяншалася. Частай з'явай у пач. ХХ ст. для бедных, шматдзетных сямей на Падзвінні быў адыход дарослых нежанатых хлопцаў "*на заробкі"*. Аб гэтай з'яве неаднаразова ўзгадвалі рэспандэнты.[4]

Дзяўчынка ў 6 – 8 гадоў разглядалася ўжо як памочніца ў доглядзе малодшых братоў і сястёр. Да ХХІ ст. захавалася на Падзвінні прымаўка: "*Радзі спярша няньку, а потым – ляльку*"[5] Важная жаночая справа – прадзенне даручалася дзяўчынцы пачынаючы прыкладна з 8 – 10 гадоў. Спачатку дазвалялася прасці так званую "атропачную кудзелю." Больш тонкую і якасную "верхачысную кудзелю" пралі звычайна дзяўчаты 10 – 14 гадоў і гэта быў іх асноўны абавязак [106, с. 195]. З 10 – 12 гадоў дзяўчаты садзіліся за ткацкі станок. Вось як успамінае навучанне ткацтву адна з рэспандэнтак: *"Матка, бывала, што сатчэ тое і носім. Мы тожа ткаць вучыліся і прасьці… Сначала паўсукеннік рабілі, тады ўжэ кужаль. Кужаль дужа матка не давала. Не ўмелі, сама рабіла…"*.[6] Калі ў кан. ХІХ ст. абавязкам кожнай дзяўчыны было наткаць сабе да вяселля "поўны кубел," то да 2-й пал. ХХ ст. гэты

---

[2] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэц Р.І., 1937 г.н., в. Зялькі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[3] Запісала Андрыеўская С.У. ад Этміновіч Я. І., 1934 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.
[4] Запісала Андрыеўская С.У. ад Міцкевіч Е.Д., 1937 г.н., в. Горкі Верхнядзвінкага раёна Віцебскай вобласці.
[5] Запісала Андрыеўская С.У. ад Антонавай Н.В., 1946 г.н., в. Перапечкі Верхнядзвінскі раёна Віцебскай вобласці.
[6] Запісала Андрыеўская С.У. ад Этміновіч Я. І., 1934 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

занятак знікае. Ва ўжытку шырока распаўсюджваюцца фабрычныя тканіны, што прыводзіць да заняпаду ткацтва. Аднак, акрамя гэтых заняткаў у вясковай дзяўчыны быў безліч іншых абавязкаў: праполка агарода, догляд за хатняй жывёлай, гатаванне ежы і інш. Уплыў маці на дачку з цягам часу толькі павялічваўся, паколькі дзяўчынку рыхтавалі, перш за ўсё, да сямейнага жыцця. У 1-й пал. ХХ ст. важным заняткам для вясковай дзяўчыны была выпечка хлеба: *"Я яшчэ сама хлеб пякла сабе на свадьбу… Вот раньшэ нада было, каб дзежачка такая была для хлеба з крыжкай. Ну, як мы пяклі… Бульбу пракруціш на машынке, тады туды мукі. Мука была іржаная. У дзежачку вады, мукі, бульбы. Замесіш. Мaлолі муку ўручную, на жорнах, дзержалі зярно, курам і свінням не кармілі… Пранікам малолі пшаніцу, дужа-дужа мякка і тады ўжо к празнікам самі пяклі дужа ўкусныя пірагі".*[7]

Увогуле, для традыцыйнага ладу жыцця на тэрыторыі Падзвіння характэрны падзел працы на мужчынскую і жаночую: *"Вот, пахаць, сеяць, касіць – гэта мужчынская работа. А вот пол памыць – гэта жэнская работа… Што я магла рабіла, то я рабіла… Вот палоць, садзіць, сціраць, карову даіць, есьці варыць – гэта бабская работа… У нашай сям'і мальчыкі большэ з бацькам, а дзяўчаты большэ з маткай… Матка з узрослымі дзеўчатамі мыла бяльё. А старшыя брацці з бацькам хадзілі касіць…".*[8] Адпаведна, дзяўчынак больш прывучалі да жаночай працы, а хлопчыкаў – да мужчынскай.

Па меркаванні асобных беларускіх даследчыкаў, у беларусаў склалася дзве стратэгіі сацыяльнай адаптацыі для хлопчыкаў і для дзяўчынак – "школа мацярынства" і "школа пастухоўства" [108, с. 13].

У беларусаў на працягу некалькіх стагоддзяў дзейнічаў прынцып "як бацькі нашы працавалі, так і мы працаваць будзем," характэрны для традыцыйнага аграрнага грамадства, які адлюстроўваў кансерватызм мыслення старэйшага пакалення [84, с. 239]. Для 2-й паловы ХХ ст., як адзначаюць даследчыкі, характэрны змены: вопыт папярэдніх пакаленняў адрозніваўся ад сучаснага і адбываецца разрыў паміж традыцыйнай свядомасцю і жыццёвымі рэаліямі. Так, напрыклад, павышаецца роля адукацыі ў грамадстве. Па перапісу 1897 г. у Віцебскай губерні пісьменных толькі 24,6% ад усяго насельніцтва губерні [74, с. 1]. Па перапісу 1926 г. па БССР на 100 чалавек прыходзіцца ўжо прыкладна 47,6 пісьменных (старэйшых за 9 гадоў) [110]. Па сведчанні этнографаў ХІХ ст. сяляне з неахвотай аддавалі дзяцей вучыцца, бо не бачылі для іх іншай долі, акрамя працы на зямлі, то ў 2-й палове ХХ ст. нават для сялян становіцца відавочным, што адукацыя – адзін з "сацыяльных ліфтаў" (сродак "*выбіцца ў людзі*"). Таму яны імкнуцца даць дзецям хаця б пачатковую адукацыю. Падмацоўвала гэтую тэндэнцыю палітыка

[7] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэц Р.І., 1937 г.н., в. Зялькі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[8] Запісала Андрыеўская С.У. ад Аўсеенка Н.П., 1927 г.н., в. Нурава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.

савецкай улады, накіраваная на ўвядзенне усеагульнай пачатковай, а потым і сярэдняй адукацыі.

**Разумовае выхаванне.**

З пашырэннем усеагульнай сярэдняй адукацыі назіраецца яшчэ адна тэндэнцыя XX ст. – зніжэнне выхаваўчай ролі сям'і. Большую частку часу дзеці праводзяць у школе, што ўплывае на працэсы іх сацыялізацыі. Калі для традыцыйнага грамадства XIX – пачатку XX стст. важнейшымі асяродкамі сацыялізацыі была сям'я і аднавяскоўцы, то для 2-й паловы XX ст. іх уплыў на працэс сацыялізацыі дзяцей змяншаецца за кошт школы, дзяржавы, якая актыўна ўмешваецца ў выхаванне.

Разам з тым, не апошняе месца сярод вартасцей чалавека займае яго розум. Згодна з народнай традыцыяй, разумовае выхаванне – абавязак сям'і. Па народных уяўленнях, разумнымі не нараджаюцца, а становяцца. Тым не менш, на будучыя разумовыя здольнасці дзіцяці можна паўплываць некаторымі магічнымі дзеяннямі. Напрыклад, у кан. XIX ст. – пач. XX ст. для таго, каб дзіця было разумным, бабка-павітуха адразала пупавіну на кнізе [86, с. 79]. Пра гэты звычай нашы рэспандэнты ўзгадваюць яшчэ ў 40-я г. XX ст.: *"Мама казала, што адразала ўсім пупавіну на кніжцы"*.[9] Акрамя таго, пасля адлучэння ад грудзей імкнуліся вызначыць будучы лёс немаўляці: раскладвалі перад ім розныя рэчы, у тым ліку і кнігу; да якой рэчы пацягнецца, да таго і будзе мець схільнасць. Калі да кнігі, то будзе дужа разумны, пісьменны.

Акрамя магічных сродкаў паўплываць на розум дзіцяці, жыхары Падзвіння карысталіся іншымі прыёмамі. Іх прымяненне пачыналася з самага ранняга дзяцінства. Перш за ўсё, гэта вербальныя сродкі: калыханкі, песенькі, забаўлянкі для немаўлят. Існуюць значныя выданні ў якіх сабраны падобныя тэксты [26; 66]. Так, на тэрыторыі Падзвіння даследчыкамі зафіксавана значная колькасць варыянтаў тэкстаў калыханак [26, с. 6 – 10]. Цікавыя тэксты зафіксаваны ў межах палявых даследаванняў распрацоўшчыкамі дадзенай тэмы. Напрыклад, на Ушаччыне распаўсюджаны такі варыянт калыханкі:

"Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі гулі
Селі на вароты
Сталі сакатаці,
А што ж Насці даці:
Ці ячменьку жменьку,
Ці жытца карытца,
Ці гарошку трошку,

[9] Запісала Андрыеўская С.У. ад Царовай В.Я., 1931 г.н., в. Дарошкавічы Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.

Ці бобу каробу,
Ці пшанічкі-ярычкі,
Ці курку-сакатурку,
Ці петушка-пеюшка,
Ці казелька-скакунка,
Ці цялушку-дравушку,
Ці быка палавога,
Ці мальца маладога,
Ці чырвоны злоты,
Насценьцы на боты”[10]

На тэрыторыі Браслаўшчыны гэтая ж калыханка мае іншы варыянт:

“Люлі – люлі – люлі,
Прыляцелі куры,
Селі на вароты
У чырвоных ботах,
Сталі сакатаці,
Нечага ім даці,
Можа бобу каробу,
Ці яшменю жменю,
Ці гароху троху.
Ці карыта жыта?” [11]

Цікавымі зя’ўляюцца запісаныя на тэрыторыі Падзвіння ў выніку палявых даследаванняў забаўлянкі для гульні з немаўлятамі. Напрыклад:

“Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Кую-кую другую,
Паеду ў Друю,
Пан дасць піражок
І табачкі ражок” [Шынкевіч А.І.].

Ці наступная:

“Гоп, гоп, іга-га!
Едзець Янка на Буланке,
Паўтараста рублёў санкі!

Дзіця чула родную мову, што садзейнічала больш хуткаму яе засваенню. Прыгаворы суправаджаліся фізічнымі практыкаваннямі для немаўлят, гімнастыкай, якую рабіла маці. Што таксама спрыяльна адбівалася на разумовым развіцці.

[10] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэнка А.С., 1939 г.н., в. Федарэнкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці.

[11] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шынкевіч А.І., 1915 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.



PolotskSU

Прызначаныя для дзяцей фальклорныя тэксты можна падзяліць па наступных жанрах: калыханка – песня дарослых, найперш маці, адрасаваная дзіцяці з мэтай закалыхаць і спуакоіць яго. Калыханка не толькі заспакойвала дзіця, але і ўводзіла яго ў жыццёвы свет, вучыла народнай мудрасці, спрыяла росту і развіццю дзіцяці [22, с. 103]; забаўлянка – кароткі верш або песенька, якія выконваліся для забавы дзіцяці, або суправаджаліся фізічнымі практыкаваннямі (пагладжванне, развядзенне ручак, гульні з пальчыкамі, гушканне на каленях) і своеасаблівы масаж; калыханкі і забаўлянскі выконваліся для дзяцей перыяда ранняга маленства. Наступны жанр дзіцячага фальклору – заклічкі – звароты-выкрыкі дзяцей да жывёл, сіл прыроды з просьбамі альбо пытаннямі. Для заклічак характэна рэчытатыўнасць, яны прыстасаваны як для калектыўнага так і для індывідуальнага выканання.

Напрыклад, адна з рэспандэнтак, успамінаючы дзяцінства, прыгадала наступную заклічку:

“Дожджык-дожджык, дзікі,
Дзерані вялікі!
Жожджык-дожджык, дзерані!
Нас із поля прагані! [12]

Такая заклічка выковалася дзецьмі у час цяжкай працы на полі, калі адзінай магчымасцю адпачыць быў дождж. Надакучлівы дождж, які перашкаджаў гульні, па словах інфарматараў праганялі наступным чынам: “*Дожджык-дожджык, перастань, Я паеду на Варстань… ”.* [13]

Наступны жанр дзіцячага фальклору – дражнілкі – кароткія вершаваныя гумарыстычныя ці сатырыстычныя творы, якія выконваліся дзецьмі каб высмеяць, прынізіць праціўніка. Дражнілкі з’яўляліся важным рэгулятарам дзіцячага права, своеасаблівым рэгулятарам паводзінаў. У дражнілках асуджаюцца такія якасці, як скнарнасць, лянота, неахайнасць, задзірыстасць. Ім супрацьстаўляюцца добрыя якасці адпаведна народнай маралі [22, с. 104]. На тэрыторыі Падзвіння былі шырока распаўсюджаны дражнілкі з ужыванне імёнаў. У палявой экспедыцыі запісаны наступныя: “*Андрэй, не дурэй!*
*Не дзяры сарочкі!*
*Не ты праў, не ты ткаў –*
*Хадорыны дочкі*!” [14]

Разумоваму развіццю таксама садзейнічалі скарагаворкі, лічылкі, маўчанкі, дзіцячыя песні, прыпеўкі і г.д. У XX ст. распаўсюджанне атрымаў школьны дзіцячы фальклор як сярод вясковых, так і гарадскіх дзяцей [24, с. 105 – 106].

---

[12] Запісала Андрыеўская С.У. ад Гердовай Л.М., в. Заазер’е Полацкага раёна Віцебскай вобласці.
[13] Запісала Андрыеўская С.У. ад Канапелькінай Т.П., в. Стаўюцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.

[14] Запісала Андрыеўская С.У. ад Антонавай Н.В., в. Перапечкі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.



PolotskSU

Для дзяцей перяду маленства (ці гульнёва-імітацыйнага перыяду) асноўнымі сродкамі разумовага развіцця з'яўляліся цацкі і гульні. Зразумела, што дзеці і гэтай узроставай групы былі ўключаны ў народныя каляндарныя і сямейныя абрады.

У беларускай народнай педагогіцы склаўся ўласны крытэрый ацэнкі разумовага развіцця чалавека. У такой якасці выступае ўменне крытычна ставіцца да ўласных разумовых здольнасцей, сціпласць [6, с. 39]. Таму дзецям з маленства прывівалі такія якасці, як сарамлівасць, сціпласць.

**Рэлігійнае выхаванне.** Адносна асаблівасцей рэлігійнага выхавання ў сем'ях беларусаў Падзвіння канца XIX – пачатку XX ст. можна адзначыць наступныя тэндэнцыі: калі ў дарэвалюцыйны перыд рэлігійнаму выхаванню надавалася значная ўвага на ўзроўні дзяржавы (царкоўна-прахадскія вучылішчы), то пасля рэвалюцыі рэлігійнае выхаванне цалкам залежыць ад сямейнай традыцыі.

Паводле паведамленняў Е.Р. Раманава, маці навучае дзіця малітвам ў 4 – 6 гадоў. Спачатку гэта раняшняя малітва тыпу: *“Нейца, Сына, духа свентего, амен. Дзякую табе, Пане Божа, што захуваў ночаньку і пріждаў дня святого!”* [86, с. 78] і вечаровая, тыпу: “*Дзякую Табе, пане Божа, што дзенёк перажыў і очанькі святою дождаўся”* [86, с. 79]. На 8 – 9 годзе маці навучала дзіця больш доўгім малітвам, якія ведала сама. З гонарам даследчык адзначае, што “Так было да 1863 года. В настоящее же время дети крестьян наших учаться молитвам как следует, чисто православным, благодаря существованию везде в крае министерских и церковно-приходских училищ” [86, с. 79].

Для тэрыторыі Падзвіння асаблівасцю з'яўляецца наяўнасць прадстаўнікоў розных канфесій (праваслаўныя, каталікі і інш.), што спарадзіла талерантнае стаўленне да суседзяў-іншаверцаў, якое выхоўвалася ў дзяцей. Напрыклад, неаднаразова апытваемыя рэспандэнты падкрэслівалі, што іх сям'я не планавала працу ў рэлігійнае свята суседзяў іншай канфесіі, каб не пакрыўдзіць рэлігійныя пачуцці апошніх. Акрамя таго, частымі былі шлюбы паміж прадстаўнікамі *“розных вер”.* Трэба ўлічваць і размежаванне Падзвіння на ўсходнюю і заходнюю часткі да 1921 – 1939 г. Моцная пазіцыя каталіцкага касцёла на заходніх тэрыторыях да 1939 г. адбілася ва ўспамінах рэспандэнтаў. Так, адна з жыхарак Браслаўшчыны ўзгадвае, што калі дзяўчына-каталічка выходзіла замуж за праваслаўнага, то ў “*касцёле званы званілі, нібыта па мёртвай*”.[15] Увогуле, рэспандэнты-каталікі часцей за рэспандэнтаў праваслаўнага веравызнання ўзгадвалі пра рэлігійнае выхаванне дзяцей ў іх сем'ях: “*Толькі помню, мама мне ўсё цвічыла, каб Богу малілася… А я не хацела, вот… Дык там дзе мы жылі разам “рускія” (аўт.: праваслаўныя) жылі, а рускія дзеці нам ніколі не гаварылі, што там іх вучаць… А нам кумуніі нада было вывучыць. Я з сябрамі сваімі сабяруся, а яны не кажуць, што нешта вучаць, там кумуніі ці што… Дык і мне не хацелася…”*.[16] Для савецкіх часоў характэрна

[15] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шынкевіч А.І., 1951 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.
[16] Запісала Андрыеўская С.У. ад Усовіч А.Ф., 1936 г.н., в. Горкі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.

адмоўнае стаўленне дзяржавы да рэлігіі. Аднак, большасць рэспандэнтаў адзначалі, што ў сем'ях захоўваліся рэлігійныя традыцыі. Перш за ўсё, праявай захавання традыцый было імкненне большасці ахрысціць дзяцей (часам для гэтага ехалі ў іншы населены пункт, раён і г.д.), выканаць пахавальны абрад з запрашэннем святара.

**Маральнае выхаванне.**

У беларусаў сфарміраваўся свой маральны ідэал чалавека. Ён адпавядае характару, псіхіцы народа і вызначаецца асаблівасцямі яго гістарычнага развіцця, прыродна-нгеаграфічнымі і сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі жыцця. Уяўленні беларусаў аб ідэальным чалавеку зафіксаваны ў прымаўках, прыказках, казках, песнях, што складае ў цэлым маральны кодэкс [8, с. 47]. У паняцце маральнага ідэалу ўкладваюцца наступныя якасці: чэснасць і праўдзівасць ("*Хлеб-соль еш, а праўду рэж"*), павага да людзей ("*Шануй людзей, то і цябе пашануюць*"), сумленнасць, сціпласць ("*Слухай многа, а гавары мала," "Добрая слава даражэй за багацце*"), дабрыня ("*Добрага добра і ўспамінаюць*"), гонар і пачуццё ўласнай годнасці (Беражы адзежу знову, а чэсць з моладу"). Адмоўнымі якасцямі ў беларусаў лічыліся: хітрасць, нядобрасумленнасць ("*Сядзіць ціха, а думае ліха*"), залішняя гаварлівасць ("*Гаварыць гавары, ды меру знай*"), безхарактарнасць, слабавольнасць ("*Ні богу свечка, ні чорту качарга*"), сквапнасць ("*Снегу зімой не дапросішся*") і г.д. [63, с. 32 –33]. Рэгіянальныя асаблівасці ў канструяванні маральнага ідэала вызначыць немагчыма. Таму можна сказаць, што беларусы Падзвіння вылучалі тыя ж станоўчыя і адмоўныя рысы ў чалавека, што і ў іншых рэгіёнах.

**Фізічнае выхаванне.**

Важнае значэнне ў развіцці асобы з пункту гледжання народных педагагічных традыцый займае фізічнае развіццё. Для традыцыйнага грамадства характэрна імкненне выхаваць чалавека здольнага для цяжкай фізічнай працы, выканання сямейных і сацыяльных абавязкаў. Фізічнае выхаванне дзяцей пачыналася з уключэння іх у працу поруч з дарослымі. У беларускіх сем'ях было прынята, што дзеці рана пачыналі выконваць хатнюю працу, што развівала іх валявыя і маральныя якасці [8, с. 88]. Больш мэтанакіравана развіццё фізічных якасцяў дзяцей адбывалася ў народных гульнях.

Жыццё вясковых дзяцей на Падзвінні праходзіла ў цесным кантакце з прыродным асяродкам, што спрыяла іх загартоўванню ў натуральных умовах. Купанне ў адкрытых вадаёмах, хаджэнне босымі ад ранняй вясны да позняй восені, пастаяннае знаходжанне на свежым паветры спрыялі таму, што дзеці выраслі фічна моцнымі і загартаванымі. Трэба ўлічваць і высокую дзіцячую смяротнасць ад інфекцыйных і прастудных хваробаў, якая існавала ў кан. XIX - пач. XX ст., што прыводзіла да выжывання найбольш моцных. Да сярэдзіны XX ст. гэтая праблема

была пераадолена, акрамя таго, клопат аб фізічным выхаванні дзяцей многа ў чым узяла на сябе школа.

Такім чынам, асноўнымі сродкамі выхавання, якімі карысталіся ў сем'ях беларускага Падзвіння з'яўляліся: народныя традыцыі, праца, звычаі і абрады, вусна-паэтычная творчасць. Выкарыстоўваліся такія метады выхавання, як ухваленне, прыклад бацькоў, аўтарытэт, заахвочване. Нярэдка інфарматары ўзгадвалі аб славесных усчуваннях і фізічных пакараннях з боку сваіх бацькоў. У дадзеным выпадку трэба памятаць, што выхаваўчы працэс у сялянскай сям'і ўплецены ў само жыццё, размова з рэспандэнтам не з'яўляецца тым метадам, які яго ў поўнай ступені зафіксуе. Напрыклад, калі папрасіць суразмоўцу ўзгадаць якую-небузь прымаўку пра бацькоў і дзяцей, то ён, хутчэй за ўсё, гэтага не зможа. У натуральных жа абставінах такое ўзгадваецца само сабой, таму мэтазгодна сумяшчаць метад апытання і назірання.

На наш погляд, цікавыя некаторыя прыклады фальклорных тэкстаў для дзяцей, якія захваліся да пачатку XXI ст. і якія ўдалося зафіксаваць.

Важнымі сродкамі традыцыйнага выхавання былі прыказкі, прымаўкі, пажаданні, загадкі і іншыя жанры вуснай народнай творчасці. Жыхары Падзвіння незалежна ад сацыяльнага і ўзроставага стану ўжывалі іх у паўсядзёным жыцці, прымяркоўваючы да зручнага моманту. Галоўнай іх мэтай было развіццё ў дзіцяці лепшых якасцей, што дасягалася зручнай для запамінання формай [7, с. 12]. Асноўнай устаноўкай выхавання было разуменне эфектыўнасці ранняга ўздзеяння на дзіця: "Вучы дзіця, пакуль ляжыць упоперак лаўкі, а не ўздоўж". Вусная народная творчасць служыла сродкам дапасавання дзяцей да народнай традыцыі [21, с. 179]. Яго эфектыўнай рэалізацыі садзейнічаў ўдзел дзяцей у сямейных абрадах, святах календарнага цыкла. Таму асноўнымі прынцыпамі сямейнага выхавання з'уляюцца: цесная сувязь з жыццём, улік узроставых асаблівасцей, непарушнасць і пераемнасць выхаваўчага працэсу.

## 2.2. Дзеці ў сістэме роднасных і сваяцкіх адносінаў.

Дзіця ў сям'і адразу пасля нараджэння ўключаецца ў сістэму роднасных сувязяў, займаючы там сваё месца. Прыход новага члена сям'і ў свет не астаўляў абыякавым нікога з прадстаўнікоў роду, аб чым сведчыць, напрыклад, усведамленне членамі сям'і важнасці надання імені немаўляці. Паводле інфармацыі, сабранай у палявой экспедыцыі найбольш часта імя для немаўляці выбіралі па дні святога ў які нарадзілася дзіця, у гонар каго-небудзь з сям'і, ці паводле суб'ектыўных меркаванняў бацькі ці маці.

Вось як апісвае гэта дзеянне адна з рэспандэнтак з Браслаўшчыны: *“Як яна (маці) родзіць, бацька – ксёнжку ў рукі і выбіраіць імя… Матка яшчэ ляжыць, а ён ужо імена па святых ксёнжках выбіраў: на які дзень выпадала, так і называлі…”*.[17]

Першымі, хто сустракаў з'явіўшаеся на свет дзіця ў традыцыйным грамадстве былі маці, бацька і бабка-павітуха.

Ва ўсіх, без выключэння, раёнах Падзвіння *“радней”* лічылася павівальная бабка (хаця б і не знахозілася ў кроўным радстве з парадзіхай), аб чым сведчаць выказванні рэспандэнтак. Частымі з'яўляюцца выпадкі, калі пачэсная роля “бабкі” даставалася маці ці свякроўцы парадзіхі, што лагічна супадала з бытавымі абставінамі (маладая сям'я жыла пад адным дахам з бацькамі). Праслежваецца сувязь радзільна-хрэсьбіннага абрада з сімволікай вады: значнасць першага купання дзіцяці, у час хрэсьбін “бабку” садзілі і вазілі на Падзвінні, часцей за ўсё, у “начоўкі”, карыта, куды налівалі ваду, і яна, едучы, аблівала ўдзельнікаў шэсця вадой. [18]У сувязі з гэтым можна выказаць меркаванне аб традыцыйнай функцыі “бабкі” не толькі як павітухі, але і як важнага ўдзельніка “ачышчальных” мерапрыемстваў у радзільна-хрэсьбінным абрадзе (вада як сродак ачышчэння). Па сведчанні рэспандэнтаў на Падзвінні традыцыйныя элементы радзільнага абрада захоўваліся да пачатку 90-х г. XX ст.

Істотныя змены ў бок спрашчэння адбыліся ў XX ст. радзільна-хрэсьбінным комплексе, што паўплывала на значэнне сацыяльнай ролі бабкі-павітухі. З апісаных этнографамі 2-й пал. XIX – пач. XX ст. “класічных” для Віцебшчыны радзільнага і хрэсьбіннага абрадаў [4, с. 3 – 36] у 2-й пал. XX ст. захаваліся толькі некаторыя элементы. Рэспандэнткі, якія нараджалі дзяцей дома, адзначалі, што да іх прымаць роды запрашалі мясцовую “бабку,” якую ведала ўся акруга. Усе, без выключэння, добра памяталі яе імя (што паказальна). Адразу ж пасля родаў “бабка” ажыццяўляла купанне дзіцяці. Тыя рэспандэнткі, якія нараджалі дзяцей ў медыцынскіх установах маглі не памятаць імя ўрача, ці акушэркі, якія прымалі роды, але добра памяталі тую жанчыну, якая ажыццяўляла першае купанне дзіцяці дома, больш таго, да яе выбара ставіліся з увагай (што таксама паказальна). Яе і называлі “бабкай”. Такая тэндэнцыя заважаецца ў Полацкім, Ушачскім, Чашніцкім, Расонскім, Верхнядзвінскім раёнах. Такім чынам, калі ў 1-й пал. XX ст. “бабкай” называлі мясцовую “спецыялістку”, якая прымала роды, то ў 2-й пал. XX ст. адбылося перанясенне: “бабкай” называлі не тую жанчыну, якая непасрэдна прымала роды, а тую якая першы раз купала дзіця. Пры гэтым, па-ранейшаму вясковыя жанчыны лічаць што быць “бабкай” – гэта прэстыжна, былі вельмі задаволены, калі іх запрашалі.[19] Ва ўсіх раёнах Падзвіння, дзе правозілася апытанне назіраецца сувязь

[17] Запісала Андрыеўская С.У. ад Этміновіч Я.І., 1934 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.
[18] Запісала Андрыеўская С.У. ад Царавай В.Я., 1931 г.н., в. Дарошкавічы Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.
[19] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шэмет Н.Ф., 1939 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk.su

паміж першым купаннем дзіцяці і наданнем жанчыне, якая яго ажыццяўляла статуса “бабкі”:*“я суседку запрасіла, каб купаць паказала, дык яна майму сыну – бабка. Мы ўжо з ёй бальшая радня”*[20]; *“мы з адной у бальніцы разам ляжалі, яна мяне дужа ўлюбіла, дык запрасіла пакупаць за бабку”*[21]; *“свякроўка мне першага купала, дык яе тады і ў начоўках каталі”*.[22]

Асаблівае месца ў сістэме роднасных і сваяцкіх адносінаў належыць хросным бацьку і маці немаўляці (кумам). Хросныя бацька і матка садзейнічалі хутчэйшаму ўключэнню немаўляці ў грамадства, шляхам далучэння яго “да веры.”

Паводле апісанняў, сабраных П.В. Шэйнам у кан ХІХ ст. на Віцебшчыне, кумам адводзілася пачэснае “кутнае” месца ў хрэсьбінным застоллі [57, с. 7].

Ва ўсіх даследаваных раёнах Падзвіння лічылася, што быць кумам ці кумой (хросным бацькам, маці) – пачэсна. Пры гэтым, большасць рэспандэнтаў адзначалі, што ад кумаўства не адмаўляюцца. Вельмі рэдка “ў хросныя” запрашалі чужых людзей, напрыклад, калі часта паміралі дзеці. У астатніх выпадках у ХХ ст. у кумы запрашалі ці сваякоў ці сяброў (суседзяў па вёсцы). На Мёршчыне, Верхнядзвіншчыне пераважаюць уяўленні аб тым, што ў кумы трэба запрашаць нежанатых людзей. Ва Ушацкім, Полацкім, Расонскім раёнах гэтая заканамернасць не зафіксавана. Большасць рэспандэнтаў лічаць, што ў кумы можна запрашаць жанатых сваякой ці сяброў. Паўсюдна распаўсюджана ўяўленне аб тым, што шлюбная пара не можа быць кумамі ў аднаго хросніка адначасова, лічыцца, што кумамі павінны быць людзі, якія паміж сабой “чужыя,” т.е. не з’яўляюцца мужам і жонкай. У ХХ ст. на Падзвінні зафіксавана імкненне маладых дзяўчат удзельнічаць у хрышчэнні хлопчыкаў, якое нібыта спрыяе больш хуткаму заключэнню шлюба самой хроснай маці.[23] У Чашніцкім раёне большасць рэспандэнтаў сведчыла аб непажаданасці запрашаць ў кумы незамужніх дзяўчат (асабліва да дзяўчынак) [9]. Паводле звестак Я.Р. Раманава, цяжарная жанчына ні ў якім разе не павінна быць кумой, бо гэта прывядзе да смерці аднаго з дзяцей. Сярод рэспандэнтаў з тэрыторыі Падзвіння, апытаных па тэме, сустракаюцца меркаванні, што цяжарная жанчына не можа быць кумой, бо нанясе шкоду і свайму дзіцяці і хросніку: *“Цяжарных не бралі, а калі такое было, то яна (кума) рабіла два врэды: свайму рабёнку і хрэсніку. У нас случай быў. Пайшла адна ў кумы, а не знала, што бярэменная. Дык свой сын у яе не ажаніўся, а хрэсніца на Купала ў дождж схавалася пад дуб (не адна, іх было многа), і з дуба зваліўся сук і прабіў ёй лёгкія, памёрла. Усе вінавацілі Юньку (яе хросную маці)”*.[24]

[20] Запісала Андрыеўская С.У. ад Якубовіч Р.А., 1939 г.н., в. Арэхаўна Ушацкага раёна Віцебскай вобласці.
[21] Запісала Андрыеўская С.У. ад Налівайка В.М., 1924 г.н., в Зялькі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[22] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шнітковай Н.В., 1938 г.н., в. Заазер’е Полацкага раёна Віцебскай вобласці.
[23] Запісала Андрыеўская С.У. ад Лісоўскай М.М., 1925 н.г., в. Горкі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[24] Запісала Андрыеўская С.У. ад Царавай В.Я., 1931 г.н., в. Дарошкавічы Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.



PolotskSU

Галоўная ж роля ў лёсе дзіцяці належала, безумоўна, маці. Сувязь маці і дзіцяці падкрэсліваюць прымаўкі: "дзіця бярэш за руку, а матку – за сэрца", "якая матка, такое і дзіцятка»", "у каго матка, у таго галоўка гладка" [6, с. 96].

Найбольш цесная сувязь паміж маці і дзіцяці ў першыя гады жыцця дзіцяці. У славянскім фальклоры шырока распаўсюджаны сюжэты аб цеснай сувязі паміж маткай і дзіцём. Маці на адлегласці адчувае небяспеку для свайго дзіцяці, як і яго боль, яна валодае здольнасцю "браць на сябе боль дзіцяці." Сувязь паміж маткай і дзіцём захоўваецца, паводле народных ўяўленняў, нават пасля смерці маці: памарлая маці прыходзіць, каб пакарміць немаўля, з'яўляецца ва сне сваім дзецям каб даць ім парады, выказаць прэтэнзіі (матыў часта сустракаецца ў беларускіх казках). Матэрыяльным увасабленнем сувязі маці і дзіцяці лічыцца матчына малако. З малаком маці, па народных уяўленнях, дзіцёнку перадаюцца не толькі ўсе найважнейшыя каштоўнасці, але і грахі [33, с. 205].

У першыя дні жыцця дзіцяці маці выступае як яго галоўная абаронца. Маці ажыццяўляла прафілактычныя мерапрыемствы, каб абараніць дзіця ад "дурнога вока," лячыла дзіця ў хатніх умовах. У найбольш цяжкіх выпадках хваробы немаўляці, паводле народных уяўленняў беларусаў, маці магла "перарадзіць дзіця," г.зн. імітаваць роды, пасля чаго, лічылася, дзіця стане здаровым.

З пункту гледжання традцыйных уяўленняў маці як увасабленне жаночага пачатку можа несці і небяспеку для дзіцяці. Напрыклад, маці забаранялася ў некаторых мясцовасцях першы раз стрыгчы валасы дзіцяці, бо яна здольна такім чынам "скараціць" яму жыццё. Рэшткі ўяўленняў ад шкоданосным уздеянні маці захаваліся ў дваістых адносінах да маці ў якой памерла дзіця. Аднавяскоўцы, з аднаго боку шкадавалі такую жанчыну, а з іншага казалі, што яна "паёчку дзіцячу з'ела" [33, с. 205].

Такім чынам, маці ў беларусаў Падзвіння ўспрымалася як захавальніца сямейнага дабрабыту, пяшчоты ў адносінах да дзяцей.

У адрозненні ад мацярынскіх функцый важнейшыя функцыі бацькі заключаліся ў забеспячэнні сям'і ўсім неабходным, падтрымцы сямейнага парадку. Як адзначаюць многія рэспандэнты ў этнаграфічным апытанні, бацька выступаў галоўным захавальнікам "дысцыпліны."

Для традыцыйнай беларускай сям'і, дзе існавала строгае размежаванне сацыяльных функцый паміж мужчынай і жанчынай, характэрна і размежаванне ўплыву на дзяцей паміж бацькам і маці. На хлопчыкаў большы уплыў меў бацька, а на дзяўчынак – маці. Існавала шмат пераходных рытуалаў, які сімвалічна акрэслівалі пераход дзіцяці са сферы ўплыву маці ў бацькоўскую сферу. Напрыклад, адлучэнне ад грудзей: ад мацярынскага малака дзіця пераходзіць да ежы, якая суадносіцца з бацькоўскай сферай – да хлеба. У беларусаў Падзвіння гэтая падзея была звязана з вялікай колькасцю вераванняў, бо паводле традыцыйных уяўленняў, моцна ўплывала на далейшы лёс дзіцяці. Так, нельга было два разы адлучаць ад грудзей, у



Polotsk SU

адваротным выпадку, у дзіцяці будзе дурное вока. Пры адлучэнні варажылі на будучы прафесійны занятак для дзіцяці: клалі перад ім розныя рэчы, да якой дзіця пацягнецца, да такой прафесіі (занятка) будзе мець здольнасць.[25]

Бацька сваім аўтарытэтам і ўладай мог спыніць любыя свавольствы дзяцей, непаслухмянасць, непадпарадкаванне яго волі. Для гэтага выкарыстоўваліся розныя аргументы: фізічнае і маральнае пакаранне, пазбаўленне спадчыны і інш. Улада бацькі страчвалася пры ўступленні дзяцей у шлюб і стварэнні ўласнай сям'і, дзе пачынала дзейнічаць свая структура ўнутрысямейных адносін.

Смерць аднаго з бацькоў лічылася вялікім горам для сям'і. Павага да памерлага бацькі ці маці праяўлялася ва ўсіх сямейных абрадах. Напрыклад, у вясельным абрадзе на Падзвінні ў выпадку смерці аднаго з бацькоў, малады і маладая абавязкова заязджалі на могілкі ("будзіць, прасіць благаславення") у памерлага маці ці бацькі.[26]

У беларускіх галашэннях у выпадку смерці кармільца, запісаных П.В. Шэйнам вельмі часта сустракаецца ўзгадка аб невыкананым да канца бацькоўскім абавязку, звязаным з матэрыяльным забеспячэннем сям'і. Напрыклад, калі гаспадар паміраў восенню, жонка галасіла:

"*Куды ж гэта мой господарчік протя зімы выбірався?*
*А хто ж гэта нам, мой господарчік, дров прівезеть із лесу?*
*А теперь жа то помёрзнуть моі деточкі ў хаце…*
*А некому моіх деточек прігледеть.*
*Деткі моі голубяткі!*
*Больше ж нам бацькі не відать, як зімой у полі цветіка…*
*Бывало ж ён, покойнічек, откуля ідзе, то как ні прідя:*
*То бублічков, то балабушек – а всё деткам прівезе…*" [58, с. 651].

Маці ў галашэннях выступае як не толькі абаронца дзяцей, але і адзіны чалавек, які іх песціць, галубіць:

"*А матулечка мая родненькая!*
*Каму ты нас пакідаеш дробных?*
*Чаму ты нас не падрасціла?*
*А мы цяпер наябярэмся гора,*
*Всякій нас будзіць біць і драць.*
*Чаму ты нам парядку не дала якога,*
*Наша і радная прячется от нас.*
*Всі дорожкі і стежкі і где ты ходзіла,*
*Я слёзкамі абалью*" [58, с. 669].

Ідэя сувязі паміж пакаленнямі праз выкананне сваіх абавязкаў, выканання бацькоўскага і сыноўняга доўга закладзена ва ўсёй народнай педагагічнай сістэме,

[25] Запісала Андрыеўская С.У. ад Этміновіч Я.І., 1934 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.
[26] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шэмет Н.Ф., 1939 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.

праўляецца яна праз выкананне неабходных традыцый, абрадаў і г.д. (імкненне "*зрабіць усё па-люцку")*. Трапна заўважыў гэтую асаблівасць народнай культуры П.В. Шэйн, падкрэсліваючы: "Выращивая сына, отец верит, а мать, не скрывая, говорит, что «*он закроет мои смяротныя вочаньки и приховаить мои костачки*»; дочь же так сказать, дополнит «люцкости»: *«прилятить шэрай зязюлей и жалостно покувыкуить»*. На этом покоится последняя надежда крестьянина, в ней он видит венец всем трудам, понесённым при воспитании детей" [58, с. 633 – 634].

У рэальных бытавых умовах, характэрных для пачатку ХХ ст., даволі частымі былі сем'і з матчыхай ці вотчымам. Да гэтага прыводзіла высокая жаночая смяротнасць пры родах, цяжкая, знясільваючая фізічная праца для мужчын і жанчын у вёсцы, распаўсюджанне інфекцыйных захворваннеў. Сярод апрошаных намі рэспандэнтаў, дзяцінства якіх праходзіла ў пачатку ХХ ст., нярэдка сустракаюцца такія, што гадаваліся ў сем'ях з матчыхай ці вотчымам. Традыцыйна, да асобы матчыхі у народнай культуры негатыўнае стаўленне (што замацавана ў казках, дзе матчыха прыцясняе сірату). Аднак, сярод рэспандэнтаў, апрошаных намі, не заўважана негатыўнага стаўлення да матчыхі, яны ўзгадваюць пра яе без адмоўных эмоцый: "*Матчыха нас, як зараблялі, то і наказавала. Быў брацік у мяне маленькі. Нада было яго глядзець, пакуль матчыха карову доіць, у поле выганяіць раннем… Яна мяна разбудзіла і пайшла. Яна прыйшла, а я сплю, а ён – плачыць… Ну, мне і папала… Вот як зарабляла… Якое маё дзецтва… А за стол усе садзіліся: што ейныя дзеці елі, тое і мы… Толькі тады не было чаго даваць…*".[27]

У працэсе сацыялізацыі і выхавання дзяцей у беларускай сям'і разам з бацькам і маці адыгрывалі іншыя прадстаўнікі роду: браты, сёстры, дзядулі, бабулі, цёткі, дзядзькі, пляменнікі і г.д. Дзякуючы наяўнасці вялікай радні дзейнічаў механізм замяшчэння ролевых функцый бацькоў (у выпадку іх смерці) іншымі роднымі. Ролю бацькі здольныя былі выконваць дзеді ці дзядзька, а ролю маці – сястра, цётка ці бабуля. Аб гэтым нярэдка ўзгадвалі рэспандэнты: "*Родам я з дзярэўні тут недалёка ва Ушацкім раёне, радам тут. Мама мая памёрла, мне было 12 гадоў. Нас дваіх з сястрой узяла да сябе баба. А ў вайну бабіна хата згарэла, мы жылі ў баньке…* "[28]

Важную ролю ў выхаванні дзяцей адыгрывалі родныя бабуля і дзядуля. Дзядуля выконваў розныя дробныя работы па гаспадарцы, віў вяроўкі, плёў кошыкі, пасвіў скаціну і г.д. Каля яго завіхаліся дзеці, якія вучыліся майстэрству, слухалі розныя жыццёвыя гісторыі, казкі. Часта выхаваннем унукаў займалася бабуля, яна, па сведчанні этнаграфіяных дадзеных, з большай увагай адносілася да ўнукаў, чым маці, занятая паўсядзённай працай. Пазбаўленыя большай часткі сваіх асабістых інтарэсаў, састарэлыя бабулі былі занятыя клопатам аб сваіх дзецях і асабліва, аб унуках [84, с. 169]. З 2-й паловы ХХ ст., калі вясковыя бабулі і дзядулі сталі

[27] Запісала Андрыеўская С.У. ад Лісоўскай М.М., 1925 г.н., в. Горкі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[28] Запісала Андрыеўская С.У. ад Кавалёвай А.А., 1938 г.н., в. Заазер'е Полацкага раёна Віцебскай вобласці.

атрымоўваць пенсію (а значыць, і матэрыяльную незалежнасць ад працаздольных членаў сям’і) яны імкнуліся парадаваць унукаў не толькі сваёй увагай, але і падарункамі. Традыцыяй для гарадскіх дзяцей на Падзвінні у канцы ХХ ст. стала праводзіць лета ў вясковых бабулі і дзядулі, дзе яны не толькі адпачывалі ў час летніх канікул, але і далучаліся да народнай культуры праз мову і сялянскі побыт.

Сацыяльныя сувязі адыгрывалі важную ролю у сацыяльнай інтэграцыі вёскі. На другой лініі роднасці знаходзіліся дваюрадныя браты і сёстры, дзядзькі, цёткі, пляменнікі і пляменніцы. У традыцыйнай сям’і прызнавалася роднасць траюрадных братоў, сясцёр, а таксама пляменнікаў і пляменніц [84, с. 169]. Ва ўмовах урбанізацыйных працэсаў другой паловы ХХ ст. цесныя сямейныя сувязі, характэрныя для традыцыйнага грамадства разбураліся, найбольш істотнымі фактарамі для падтрымання роднасных сувязяў сталі такія, як ступень адлегласці, пачуццё прыязні ці непрыязні, асабовая несумяшчальнасць і г.д.

### 2.3. Гульні і цацкі дзяцей на тэрыторыі Падзвіння

Да старажытных і важных сродкаў народнай педагогікі адносяцца гульні. Гульня – гэта школа жыцця. Гуляючы, дзіця знаёміцца з цацкамі, якія даюць яму першае ўяўленне пра наваколле, колер, памер, пругкасць, вагу. У гульні дзіця рэалізуе свае жыццёвыя назіранні, капіруе паводзіны дарослых, узнаўляе бачаныя ім сітуацыі, сямейны побыт, працоўныя заняткі. Гульні развіваюць памяць, спрыт, фантазію. Усё жыццё беларусаў суправаджалася народнымі гульнямі. Прастата, даступнасць гульняў робіць іх незаменнымі памочнікамі ў выхаванні. Яны аднаўляюць лепшыя народныя традыцыі, звычаі, святы, абрады [6, с. 12].

Гульня непарыўна звязана з этнічнай культурай. Нацыянальна-адметнае знаходзіць сваё адлюстраванне ў асаблівасцях стылю гульні, у спосабах яе вар’іравання, а таксама ў прыродазгоднасці гульняў, адпаведнасці гульняў прыродзе роднага краю [84, с. 202].

Гульня, як сродак народнай педагогікі, пачынае выкарыстоўвацца з самага ранняга перыяда жыцця дзіцяці. Маці першая ажыццяўляе гульнявыя дзеянні з немаўляці, суправаджае іх прыгаворамі. Адначасова з гульнёй маці прагаворвала забаўлянку тыпу: “Кую, кую ножку, паеду ў дарожку…”, ажыццяўляла фізічныя практыкаванні, гладзіла, злёгку стукала па ножках, калыхала дзіця. Такім чынам, дзіця адначасова чула родную мову, атрымлівала вопыт першых станоўчых эмоцый, а маці ажыццяўляла массаж цела немаўляці. Пачынаючы з 2-3 гадоў дзеці пачынаюць імітаваць паводзіны дарослых у сваіх гульнях, выкарыстоўваць у гульнях прыродны матэрыял. Паводле классіфікацыі, прапанаванай Я. Вількіным, па пераважнаму віду гульнёвай дзейнасці гульні падзяляюцца на: 1. гульні для дашкольнага ўзросту (3 –7 гадоў), 2. гульні для малодшага ўзросту (8 – 11 гадоў), гульні для сярэдняга школьнага ўзросту (12 – 14 гадоў), гульні для старэйшага школьнага (15 – 17 гадоў). Складальнікі зборніка “Гульні, забавы, ігрышчы”



Polotsk SU

прапаноўваюць падзяляць беларускія гульні наступным чынам: 1. каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні (са святочна-абрадавай атрыбутыкай і без яе); 2. гульні, не звязаныя з календаром і абрадамі (сярод іх – гульні з інвентаром і гульні без інвентара або з выпадковымі спадручнымі прадметамі) [23, с. 29]. На матэрыяле, сабраным ў выніку палявога даследавання, цяжка прапанаваную класіфікацыю немагчыма праверыць, паколькі пласт культуры, звязаны з народнымі беларускімі гульнямі ў XX ст. амаль страчваецца. З успамінаў рэспандэнтаў мы даведваемся толькі аб некаторыя традыцыйных гульнях, у якія гулялі дзеці ў 1-й палове XX ст.: “Лапта,” “Пікар,” “Класы,” “Маладуха,” “Камушкі”.[29]

Для 2-й паловы XX ст. характэрна страта гульнямі нацыянальных адметнасцей, інтэрнацыяналізацыя дзіцячых гульняў, асабліва ва ўмовах горада. Па-ранейшаму, дзеці актыўна выкарыстоўваюць прыродны матэрыял для гульняў. Гэта тэндэнцыя характэрна для ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і для Падзвіння.

Адносна дзіцячых цацак можна сказаць, што ў кан. XIX – пач. XX стст. на тэрыторыі Падзвіння шырока былі распаўсюджаны як цацкі для дзяцей, якія рабілі рамеснікі (разбяры па дрэву, ганчары), так і цацкі, што выраблялі самі дзеці. У “Беларускім зборніку” Е.Р. Раманава [86], які складзены ў асноўным на этнаграфічным матэрыяле Віцебскай губерні пачатку XX ст. называюцца наступныя цацкі: “ваўчок”, “кацёлка”, “мяч”, “кароўка”, “жужалка”, “конік”, “пішчалка”, “труба”, “трашчотка”, “лялька” [86, с. 587 – 590]. З 2-й паловы XX ст. у побыт дзяцей на тэрыторыі Падзвіння ўсё больш уваходзяць цацкі фабрычнай вытворчасці, што звязана з ростам дабрабыту сямей (яны ўжо могуць дазволіць купляць цацкі дзецям), заняпадам традыццыйных раместваў (напрыклад, ганчарства). Аднак, па ўспамінах рэспандэнтаў, яшчэ ў 50-я гады XX ст. пакупная цацка была вялікай рэдкасцю для сельскіх дзяцей, а цацкі мясцовых сельскіх майстроў былі даступнымі і таннымі. Адна з рэспандэнтак ўзгадвае: *“Ездзілі па вёсках карабейнікі, яны сабіралі трапкі, металалом, паперу. За тое, што дзеці ім прыносілі гэта, яны давалі дзецям цацкі-свістулькі, ці бусы якія…”* .[30]

Дзеці выраблялі цацкі і самі, з прыроднага матэрыялу: трэсак, травы, галінак дрэў і г.д., таксама ў якасці цацак выкарытоўвалі прадметы дарослага побыту. Да кан. XX ст. самаробныя цацкі майстроў страцілі сваю гульнёвую функцыю і ператварыліся ў сувеніры, паколькі ў побыце іх канчаткова выцеснілі прамысловыя вырабы. Цацкі беларускіх майстроў з гліны, дрэва, косткі, тканіны захоўваюцца, у асноўным, у музейных калекцыях.

У сучаснасці на тэрыторыі Падзвіння дзіцячыя цацкі захоўваюцца ў наступных музеях: Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку (93 адзінкі), Лёзненскім раёным ваенна-гістарычным музеі (58 адзінак).

[29] Запісала Андрыеўская С.У. ад Лісоўскай М.М., 1925 г.н., в. Горкі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.
[30] Запісала Андрыеўская С.У. ад Гердовай Л.М., 1940 г.н., в. Заазер’е Полацкага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk.su

Асартымент цацак-прылад для гульні залежыць ад віда гульні, ад месца, у якім праходзіць гульня (у хаце, у двары), ад фантазіі ўдзельнікаў гульні і правілаў гульні. Агульнай уласцівасцю цацак з'яўляецца іх шматфункцыянальнасць. Функцыі цацак-прылад для гульні выпрацоўваліся ў працэсе іх эвалюцыі. Вялікую колькасць функцый беларускіх традыцыйных цацак можна звесці да наступных: гульнёвая, эстэтычная, выхаваўчая, інфармацыйная, сацыялізуючая. Можна вылучыць наступныя групы цацак-прылад для гульні: *гульнёвы інвентар* – "пыж" ("трапыж"), "кацёлка", мяч ("пірагон", "салавей"), мурмельшпіль, цацка-яйка; *імітацыйныя цацкі* – "качкі́", "кралы", цацачная мэбля, цацачны посуд, цацачная зброя; *гукавыя цацкі* – "буркаўкі", "пішчалкі", "бразготкі", "пукаўкі", "жужалкі", "трашчоткі", "званочкі"; *рухомыя цацкі* – "ваўчкі", "круторы", "каталкі" і г.д. Набор цацак вылучаны ў выніку аналізу музейных калекцый і палявых этнаграфічных матэрыялаў. Паводле працэнтных суадносін у музейных калекцыях, па падліках выканаўцаў даследавання, цацкі-прылады для гульні складаюць 20 %, астатнія 80 % – гэта вобразныя цацкі [39, с. 7]. Самым распаўсюджаным прыёмам вырабу гульнёвага інвентару быў выраб цацак непасрэдна пад час гульні ці пры падрыхтоўцы да яе. Як паказвае аналіз палявых этнаграфічных матэрыялаў, звычайна такія цацкі рабілі самі дзеці. Дакладная рэгламентацыя памераў цацак-прылад для гульні дазваляла ствараць рэчы, прыдатныя для дзіцячых фізічных магчымасцяў. Для дзіцячых гульняў беларусаў характэрна наданне асаблівага наймення кожнаму прадмету гульні, што з'яўляецца імкненнем адаптаваць прадмет, узяты з прыроднага асяродку, да культурнага асяродку, спосабам "засваення" рэчаіснасці дзецьмі. Адной з самых распаўсюджаных цацак з'яўляецца мяч. Семантыка мяча звязана з салярнай сімволікай. У дзіцячых гульнях беларусаў ужываліся мячы з прыродных матэрыялаў: поўсці і скуры жывёл, дрэва, анучаў. У традыцыйных дзіцячых гульнях прымяняліся мячы розных памераў. У этнаграфічных апісаннях гульняў ужываюцца розныя назвы мяча – "салавей", "пірагонь", "кацёлка" і інш. Гульні з мячом развівалі фізічныя здольнасці дзяцей. Галоўная яго функцыя ў XIX – XX стст. – забаўляльная. Яйка – полісемантычны, складаны сімвал, адыгрывае важную ролю шмат у якіх абрадах: аграрных, памінальных. Перыяд дзяцінства да пяці гадоў параўноўваўся ў беларусаў з яйкам: "*да пяці год пястуй дзіця, як яечка, з сямі – пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка*". Беларусы часта выкарыстоўвалі пры лячэнні дзяцей магічныя прыёмы, звязаныя з яйкам. Выкарыстанне яек у абраднасці і магічных прыёмах, іх бяспечная (круглая) форма спрыялі таму, што ў асартыменце дзіцячых цацак з'явілася яйка. Цацкі-яйкі рабілі з дрэва ці гліны. Звычайна гэта былі "бразготкі". Значную групу цацак складаюць імітацыйныя цацкі. Гэта цацкі, якія паўтараюць прадметы побыту дарослых (цацачная мэбля, цацачны посуд, сродкі перамяшчэння, зброя). Гліняны дзіцячы цацачны посуд беларускія майстры выраблялі разам з гаспадарчым посудам і іншымі відамі цацак. Метады апрацоўкі цацачнага посуду былі такія, якімі былі

метады апрацоўкі керамікі ў дадзеным рэгіёне (абпал, задымленне, глазураванне, глянцаванне). З дапамогай гэтай групы цацак дзеці знаёміліся з асартыментам посуду, атрымоўвалі першыя гаспадарчыя навыкі. Цацачная зброя – гэта група цацак, якія капіравалі зброю дарослых (“мячы”, “лукі”, “стрэльбы”, “лівальверы” і г.д.). Імітацыі прадметаў узбраення ў цацках з дрэва, косці і металу даволі частая з’ява. Этнаграфічныя калекцыі цацачнай зброі кан. XIX – пач. XX стст. ёсць у музеях Беларусі, Расійскім этнаграфічным музеі (Санк-Пецярбург, Расія) [40, с. 81]. Пры дапамозе цацак дзеці атрымоўвалі навыкі палявання і карыстання зброяй, што было патрэбным для дарослага жыцця. Акрамя гульнёвай функцыі цацачная зброя магла выконваць таксама і магічныя функцыі. Этнаграфічныя дадзеныя даюць падставу меркаваць, што некаторым мініяцюрным прадметам у выглядзе стрэл, сякерак надаваўся сакральны сэнс. Цацкі беларусаў часта імітавалі прадметы мэблі, гаспадарчыя рэчы, прылады працы (“калыскі”, “ножычкі”, “сякеркі”, “грабельцы” і г.д.). Гульні з такімі цацкамі садзейнічалі азнаямленню дзяцей з прадметамі сялянскага быту, засваенню працоўных аперацый. Пашырэнне асартыменту цацак у XX ст. было вынікам мадэрнізацыі [39, с. 11].

Сярод беларускіх традыцыйных цацак сустракаюцца гукавыя цацкі. Да гэтай групы адносяцца так званыя “буркаўкі”, “пішчыкі”, “бразготкі”, “пукаўкі”, “гудзелкі”, “трашчоткі”, “званочкі” і г.д. Некаторыя з відаў гэтых цацак дзеці выраблялі і ў XX ст. (“гудзелкі”, “пішчыкі”, “пукаўкі”, “дудачкі” і г.д.). Такія цацкі рабілі з прыродных матэрыялаў, звычайна доўга не захоўвалі. Выраб гэтых цацак быў дэтэрмінаваны прыродным асяроддзем і дзіцячай фантазіяй. Некаторыя віды цацак (“трашчоткі”, “бразготкі”) выраблялі дарослыя для дзяцей. Гукавыя цацкі выконвалі ў мінулым і апатрапейную і гульнёвую функцыі адначасова, да XX ст. захавалася толькі гульнёвая функцыя.

Рухомыя цацкі – такія, дзейнасць якіх заснавана на руху. Да гэтай групы адносяць і тыя цацкі, якія імітуюць прадметы быту – “санкі”, “качкі”, “каталкі”, і такія, аналагаў якім ў побыце дарослых няма, – “круторы”, “ваўчкі”, “колцы” і інш. Гэтыя цацкі выконвалі гульнёвую функцыю. Галоўная функцыя цацак-прылад для гульні ў XIX – XX стст. – гульнёвая.

Антрапаморфныя выявы выкарыстоўваліся ў рытуальных дзеяннях і ў гульнях дзяцей, таму вылучаюцца рытуальныя і дзіцячыя лялькі. Дзіцячыя лялькі (“бабы”, “панны”, “каралевы” і інш.) захоўваюцца ў этнаграфічных калекцыях музеяў Беларусі, некаторыя іх віды вырабляліся і ў XX ст. Сярод гэтых цацак ёсць некалькі груп: лялькі-выявы жанчын, лялькі-прафесійныя тыпы, вершнікі, ваяры, “пары”. Характэрнымі рысамі дзіцячых лялек з’яўляюцца ўмоўнасць, прастата выканання, сувязь з гульнямі. Гэты від цацак выраблялі з дрэва, раслін, саломы, анучаў, гліны і г.д. Лялькі майстравалі самі дзеці і дарослыя для дзяцей. Сам працэс вырабу лялек дзецьмі ператвараўся ў гульню. З лялькамі ў беларусаў часцей гулялі дзяўчынкі, хаця ў гульнях часам прымалі ўдзел і хлопчыкі малодшага ўзросту. Традыцыйна

PolotskSU

найбольш распаўсюджанымі былі ролевыя гульні, у якіх дзеці паўтаралі паводзіны дарослых. Напрыклад, гульня “у абедкі,” “у вяселле” і г.д. Гульні з лялькамі дапамагалі дзецям засвойваць сацыяльныя ролі. Лялькі выконвалі таксама эстэтычную функцыю.

Сярод беларускіх цацак сустракаюцца каларытныя тыпы ваяра, гарманіста, музыкі, мужыка. Такія цацкі выконвалі выхаваўчую, гульнёвую, эстэтычную функцыі. Цікавыя кампазіцыі цацак “пары”, што прадстаўляюць паненак з кавалерамі. Прычынай узнікнення гэтага віду вырабаў была рэакцыя майстроў-цацачнікаў на жыццё, імкненне адлюстраваць усё, што бачаць навокал. Антрапаморфныя выявы знаёмілі дзіця з паўсядзённым жыццём, акаляючым асяроддзем, людзьмі. Цацкі-лялькі выконвалі пазнавальную, выхаваўчую, эстэтычную функцыі ў культуры беларусаў. У XX ст. многія віды лялек ператвараюцца ў сувеніры. Лялькі з саломкі, гліняныя, драўляныя антрапаморфныя фігуркі майстры вырабляюць не для дзіцячых гульняў, а для выкарыстання ў якасці сувеніраў.

Распаўсюджанымі ў беларусаў з’яўляюцца цацкі-коннікі (“вершнікі”, “ваяры”, “жаўнеры”, “каралі”). Выявы коннікаў у цацках звязаны з салярнымі культамі, культам св. Юрыя, тэатрам лялек “Ягорыем”. “Коннікі” у беларускіх традыцыйных цацках у XX ст. зведалі мадэрнізацыю пад уплывам сацыяльных і палітычных фактараў [39, с. 7 – 9].

Традыцыйны набор зоаморфных цацак у беларусаў строга акрэслены. Гэта абумоўлена глыбокай традыцыйнасцю беларускіх народных цацак, іх сувяззю са старажытнымі культамі жывёл. Пашырэнне традыцыйнага набора цацак адносіцца да пач. XX ст. і звязана з мадэрнізацыяй гаспадарчага і грамадскага жыцця, павышэннем тэхнічнага ўзроўню вытворчасці, актывізацыяй гандлёвых і культурных сувязяў. Сярод зоаморфных сустракаюцца цацкі-“коні”. Блізкія па семантыцы і стылістыцы да цацак-“коней” цацкі ў выглядзе ласёў (аленяў). Можна меркаваць, што конь, лось (алень) былі некалі сакральнымі жывёламі, таму іх выявы сустракаюцца ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве славян. У беларусаў традыцыйныя цацкі-“конікі” не толькі знаёмілі дзяцей з выглядам жывёл, але і былі сімваламі дабрабыту. Цацкі ў выглядзе птушак (качка, певень) цесна звязаны з народным фальклорам, вераваннямі, абрадамі ў якіх значную ролю адыгрывалі птушкі. Такія цацкі першапачаткова выконвалі ахоўную функцыю. Свіст цацак, па меркаванню беларусаў, павінен быў адганяць злых духаў ад дзяцей. Беларускія цацкі-“птушкі” пазбаўлены падрабязнасцей, выглядаюць больш архаічна ў параўнанні з цацкамі суседзяў. Сярод цацак у выглядзе птушак сустракаюцца двухгаловыя выявы “паўконей-паўптушак”. Гэта найбольш архаічныя цацкі, яны мелі культавае значэнне. Цікавы цацкі-выявы мядзведзяў. Вобраз мядзведзя звязваюць з рэшткамі татэмістычных уяўленняў. Ён лічыцца сімвалам плоднасці, дабрабыту. Мядзведзь сустракаецца і ў беларускіх казках. У цэльнай сістэме

выхавання ў беларусаў значэнне мелі не толькі вербальныя, але і ілюстрацыйныя сродкі. Пры дапамозе цацак дзеці знаёміліся з жывёльным светам. Не выключана, што першапачаткова выявы мядзведзя выконвалі і засцерагальную функцыю. Плоднасць сімвалізавалі цацкі "баранчыкі" і "козлікі." Выраб цацак у выглядзе гэтых жывёл павінен быў спрыяць павышэнню плоднасці. Беларускія майстры XX ст. імкнуліся перадаць прыродныя асаблівасці гэтых жывёл (курчастая воўна – у барана, барада – у казла). Цацкі больш ранніх перыядаў менш дэталізаваны [39, с. 10 – 13].

Страціўшы першапачатковыя магічныя функцыі да пач. XX ст., цацкі ў выглядзе жывёлаў у культуры беларусаў выконвалі ў адносінах да дзяцей пазнавальную, гульнёвую, сацыялізіруючую, выхаваўчую, эстэтычную і інш. функцыі. Беларускія традыцыйныя цацкі ўключаліся ў сістэму выхавання дзяцей, у якой важнае значэнне надавалася кожнаму элементу.

Для 2-й паловы XX ст. характэрна распаўсюджанне цацак прамысловай вытворчасці, што прыводзіць да ператварэння народнай цацкі ў прадмет дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Для канца XX – пач. XXI стст. характэрна шырокае распаўсюджанне цацак замежнай фабрычнай вытворчасці, цацкі канчаткова страчваюць нацыянальны каларыт.

## 2.4 Дзеці ў традыцыйных абрадах, святах, вераваннях на Падзвінні

### 3.4.1. Узел дзяцей у абрадах і святах календарнага цыклу

Аналіз этнаграфічных звестак па традыцыйнаму календару Падзвіння дазваляе меркаваць, што найбольш актыўны ўдзел дзяцей у каляндарных святах назіраецца на працягу першай паловы года – ад Каляд да Купалля. Гэта цалкам лагічна, паколькі павелічэнне сонечнага дня, актывізацыя вегетацыйных працэсаў, што прыпадаюць на гэты час, суадносіцца з ідэяй росту і развіцця дзяцей.

У традыцыйным грамадстве беларусаў існавала перакананне, што ўдзел дзяцей у некаторых абрадах каляндарнага цыкла неабходны з-за іх уласцівасці ўплываць на сілы і з'явы прыроды, ураджай, прыплод жывёлы. Месца і роля дзяцей у гэтых абрадах была дакладна вызначана і абумоўлена іх сацыяльным статусам [106, с. 193].

Нягледзячы на антырэлігійную прапаганду з боку дзяржавы, сярод беларусаў Падзвіння ў XX ст. захаваліся ўстойлівая традыцыя святкавання рэлігійных святаў, цэлы комплес вераванняў, народных традыцый, звязаных з рэлігійнымі святамі.

Без удзелу дзяцей не абыходзіліся святы зімовага цыклу, сярод якіх, у першую чаргу, вызначаюць **Каляды** (хрысціянскае свята – Раство Хрыстова).

Этнограф пачатку XX ст. наступным чынам апісвае святкаванне Раства Хрыстова: "На Ражство ў мястэчках і гарадах пасля канца службы ў царкве хлопчыкі імкнуцца пайсці з віншаваннямі. Пісьменные, заходзячы ў хату, гавораць

polotsksu

малітвы і віншуюць са святам, жадаючы "*етый правесці і наступнага даждацца*"; непісьменыя абмяжоўваюцца віншаваннямі. За віншаванні ім даюць абаранак ці па дробнай манеце" [81, с. 39].

На Каляды традыцыйна варажылі: на добрае замужжа, на ураджай. Сялянскія хлопчыкі варожаць па-своему: у якім баку больш зорак, там будзе больш і грыбоў [31, с. 335]. Сяляне усяляк спрабавалі дапамагчы хлопчыкам-пастушкам, верылі, што калі на першую Куццю "*паслаць па сена хлопца таго, каторы заўсёды валы пасе, то хоць ён і загубіць валы па лету, то шукаць іх не трэба, самі прыйдуць, затым што ён прынёс сена на Куццю"* [31, с. 342].

Дзеці і падлеткі не павінны есці без дазвола, іначай скаціна будзе ласа ўлетку і пераборліва на пастве [Жыцця адвечны лад, с. 342].

Лічылася, што праца ў час вялікага свята можа прынесці шкоду дзецям. "У дзень Новага года жанчыны могуць толькі прасці воўну і шыць новыя рэчы; але прасці лён і пяньку, ладзіць старую адзежыну – нельга. Інакш і дзеці народзяцца калекамі і жывёлы будуць нараджацца ўродамі" [31, с. 358]. У "крывыя вечары" паміж Калядамі і Вадохрышчам нельга плесці лапці, каб дзеці ног не заплятали [31, с. 360].

Удзел дзяцей у разнастайных рытуалах каляндарнага цыклу суадносіўся з сімволікай плоднасці, множнасці, атрымання ўраджаю. М.Я. Нікіфароўскі апісвае натупны звычай з удзелам дзяцей на трэцюю галодную хрышчэнскую куццю перад **Вадохрышчам:** "Гападар бярэ міску з вараным гарохам і разам з дзецьмі абыходзіць усе будыніны, прычым, спынчючыся ў кожнай з іх, сыпле дзецям у прыполы крыху гароху і пытае кожнага паасобку: "Ці поўна?", на што тыя адказваюць: "Поўна!" Тады гаспадар дадае: "Паўні, Божа!" Пасля вяртання ў хату дзеці лічаць атрыманыя гарошыны і па большай ці меншай іх колькасці, па велічыні і разваранасці вызначаюць хатнія і асабістыя дастаткі і нястачы" [31, с. 380; 72, с. 232 ].

**Сарaкі.** Распаўсюджанай з'явай сярод беларусаў Падзвіння было святкаванне "Саракоў" (свята сарака мучанікаў) з удзелам дзяцей. Лічылася, што дзеці здольны заклікаць птушак, паскорыць прыход вясны. Раманаў узгадвае ў сваіх запісах, што на Саракі у многіх мясцінах у гэты дзень маці пякуць дзецям сорак "жаваранкаў з цеста – аржанога ці пшанічнага. Для гэтага раскатваюць цеста ў выглядзе вяроўкі, надаюць яму форму лічбы "8", а канцы падымаюць над кольцамі ў выглядзе галавы і хваста. Калі такія "жаваранкі" спякуцца, аднаго кідаюць у печ, а астатніх аддаюць дзецям і жабракам [86, с. 142]. З Саракамі звязана ўяўленне аб тым, што ў гэты дзень сарока пачынае віць сабе гняздо і прыносіць сорак пруткоў. З выраю прылятаюць сорак жаваранкаў. Хлопчыкі павінны ў гэты дзень перад усходам сонца, з заплюшчынымі вачыма, не памыліўшыся, сабраць на двары сорак трэсак і высыпаць іх пад печ. Хто выканае гэта, той увесну знойдзе сорак птушыных гнёздаў (ці сорак качыных яек), а хто не выканае – не знойдзе ніводнага [86, с. 142]. Адметнасцю

гэтага свята было тое, што маці для дзяцей пяклі адмысловае пячэнне. Вось як узгадвае святкаванне ў 1-й палове XX ст. адна з рэспандэнтак: *“На Саракі пяклі маленькія такія клёцачкі, “сьліжы” звалі іх… Мы з гэтымі сліжамі гулялі, елі, тады хадзілі на вуліцу, абменьваліся гэтымі сьліжамі… Вобшчэм, птушак звалі… Гэтыя пячэнькі звалі “сьліжы” і яшчэ звалі “жаваранкі”… Гэта ў дзецтве было, гэта ўжо ўшло…”* [31]

**Вербная нядзеля**. Дзеці прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да свята Пасхі (Вялікдня), таму Вербная нядзеля ад якой да аднаго з самых шануемых сялянамі на Падзвінні святаў заставаўся тыдзень, была для іх радасным днём. Да таго ж у гэты дзень дазвалялася паслабленне паста, што таксама радавала дзяцей. З гэтым днём на тэрыторыі Падзвіння звязана шмат традыцый і абрадаў. Напрыклад, у весцы Шаркаўшчына Дзісненскага павета Віленскай губерні маці ў Вербную нядзелю забараняла сваім дзецям есці да канца абедні (асвячэння вярбы ў царкве), пасля чаго насча яны мусілі з’есці тры пупышкі свянцонай вярбы, што быццам бы абараняла іх ад ліхаманкі [107, с. 194]. У час палявой экспедыцыі выяўлена, што паўсюль на Падзвінні ў XX ст. і нават ў пачатку XXI ст. бытаваў звычай злёгку біць дзяцей асвечанай ў царкве вербай, каб яны былі здаровыя і паслухмяныя.[32]

**Пасха** (Вялікдзень). Этнографамі XIX – пач. XX стст. запісана значная колькасць традыцыйных вераванняў, забабонаў, звязанных з дзецьмі. Напрыклад, у Вялікі чацьвер соль, якая заставалася пасля вячэры, нясլі ў царкву і асвячалі на Пасху. Яе захоўвалі круглы год і выкарыстоўвалі для апрысквання немаўлят ад “суроцы” [86, с. 39]. Цікава, што рэшткі перакананняў аб здольнасць солі, асвечанай на Пасху, дапамагаць ад “уроку” (“суроку”) захаваліся да XX ст. У палявых запісах падчас этнаграфічных апытанняў не аднаразова сустракаюцца звесткі аб лекаванні дзяцей асвечанай у царкве соллю. [33]

На Пасху дзеці хадзілі па дамах з пажаданнямі дабрабыту для гаспадароў, за што атрымоўвалі яйкі. Традыцыя дажыла да XX ст., ва ўспамінах многіх рэспандэнтаў гэты эпізод апісаны вельмі ярка і з падрабязнасцямі:*“Пасху ў нас очэнь-очэнь празнавалі. Мама ў мяне веруючая была, дык валачобнікі хадзілі, пелі па дамох… а мы кагда малыя былі, асобенна нічога не пелі, а хадзілі яйца сабіралі па хатах… Гаварылі, што б хазяівам даў Божа, гаварылі: “Хрыстос уваскрос!” Тады наберэш гэтых яец і качаеш у лубок, нам взрослыя рабілі такі лубок… Ну, жолаб такі, звалі “лубок.” Качаеш, качаеш тыя яйца, тады выйграеш многа, прынясеш дамоў…”* [34]

Дзеці, як правіла, хадзілі асобна ад дарослых, раніцой: “Вот паядзём, а тады мы, рабяты, за яічкамі пабеглі. Бывала, у каждую хату заходзілі. Цэлую карзіначку

[31] Запісала Андрыеўская С.У. ад Паўлавай Я.С., 1952 г.н., в. Заазер’е Полацкага раёна Віцебскай вобласці.
[32] Запісала Андрыеўская С.У. ад Якіменка Л.Я., 1932 г.н., г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.
[33] Запісала Андрыеўская С.У. ад Якіменка Л.Я., 1932 г.н.
[34] Запісала Андрыеўская С.У. ад Паўлавай Я.С., 1952 г.н., в. Заазер’е Полацкага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk.su

назбіраем” [95, с. 96]. Адна з інфармантак успамінае, што “хадзілі ў валачобнае”, як ёй было каля дванаццаці год: “*ужо мы хадзілі, піялі пад вокнамі*”.[35] У заходніх раёнах Падзвіння дзяцей называлі “алялюйнікамі”, яны спявалі толькі святыя песні і чыталі “ванэліі” [95,с. 96]. У Міёрскім раёне звычай “хадзіць за яйкам” бытаваў сярод дзяцей яшчэ 3-4 гады таму. Аднак тут ужо дзецьмі не выконвалася ніякіх песень, яны проста віншавалі гаспадароў дома, за што і атрымлівалі ў падарунак фарбаванае яйка, кавалак святочнай “булкі”, цукеркі.

На тэрыторыі Падзвіння бытаваў таксама звычай, калі бабка-павітуха на Вялікдзень адведвала сваіх “унукаў” і таксама адорвала іх фарбаванымі яйкамі [79, с. 97].

Чырвоным яйкам маці гладзілі па твары ўсіх дзяцей, каб яны былі заўсёды румянымі і чырвонашчокімі [32, с. 178]. На Дзісеншчыне сустракаецца звычай мыць твар вадой куды клалі свянцонае чырвонае яйка, каб быць здаровым і прыгожым.[36]

**Тройца (Сёмуха).** Па вызначэнні Л. В. Ракавай, дзіцяча-юнацкім святам можна лічыць Сёмуху (Тройцу) [13, с. 212]. Дзеці прымалі актыўны ўдзел ва ўпрыгажэнні хаты вясновай зелянінай, а ў Віцебскім павеце ў першы Дзень Святога Духа іх па традыцыі адпускалі да абедні, пасля чаго бацькі наймалі ім музыку і яны скакалі ў карчме ўвесь дзень [60, с. 19]. Традыцыя упрыгожваць зелянінай хаты захавалася да пач. XXI ст. у вёсках Падзвіння. У гэтай справе дзеці з радасцю прымаюць самы актыўны ўдзел.

**Іспас.** На Падзвінні лічылася, што матка, у якой памерла дзіця не мае права есці яблыкі да Спаса. Такая забарона характэрна для славян увогуле. Забарона есці ягады, садавіну, гародніну ці малако, сыр іншыя прадукты да іх асвячэння ў час пэўнага свята для маці, што пахавала дзіця характэрна для беларусаў, рускіх, украінцаў, чэхаў, сербаў і інш. Сярод беларусаў Падзвіння найбольш распаўсюджанай з’яўляецца забарона адносна яблык. “*А на Спаса не нада яблыкі есьці, еслі у маткі рабёнак памёр. Вот наша бабуля, каторая з намі жыла, дык яна нікагда да Спаса яблыкаў не ела, бо ў яе сын памёр у сем гадоў. Тады, кажуць, калі матка яблыка да Спаса з’есьць, то Бог на Спаса дзецям на небе залатыя яблыкі раздаець, а гэтаму дзіцёнку ўжэ не дасьць. Таму матка яблыка не далжна з’ядаць да Спаса, каб ужо даў. Тады на Спаса як яблыкі пасвенцяць у цэркве, то, перш за ўсё, матка нясе на кладбішча і ложыць на магілку таму рабёнку. Бабка наша сабіралася на Спаса, сабірала катомку такую і нясла туды яблыкі”*.[37] Існуюць і іншыя варыянты абмежаванняў для мацярок, што страцілі дзяцей. Так, калі памерла дзіця, то жанчына, збіраючы ягады, тры першыя з іх павінна кінуць на зямлю (Докшыцкі раён) [31, с. 166].

---

[35] Запісала Мішына В. І. ад Парцянка М.М., 1938 г.н., в. Несцераўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.
[36] Запісала Андрыеўская С.У. ад Якіменка Л.Я., 1932 г.н., г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.
[37] Запісала Андрыеўская С.У. ад Канапелькінай Л.Е., 1931 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk.su

**Купалле.** На Купалле (ці на Івана, Яна) на Падзвінні было прынята збіраць розныя лекавыя зёлкі. Збіраюць Іванаўскія травы толькі малыя і старыя. Людзі ж “сярэдняга веку, ні пры началу, ні пры канцы” і травы, сабраныя імі не маюць гаючай сілы [86, с. 208]. У гэтым праяўляецца вера ў магічныя здольнасці людзей, якія знаходзіліся на межах жыцця (г.зн. у пераходным стане). Цікава, што купальскія зёлкі народная медыцына Падзвіння рэкамендуе выкарыстоўваць для лячэння дзяцей ад розных хваробаў “упуду,” “суроку” і г.д. У XX ст., па словах інфарматараў, сабраныя зёлкі абавязкова асвячалі ў царкве ці касцёле. Прымалі ўдзел дзеці ў падрыхтоўцы купальскага вогнішча, некаторых магічных абрадах. Паводле сведчанняў Е.Р. Раманава, “пасля купальскага святкавання дзяўчаты кідаюць у ачахлае вогнішча кудзелю, каб быў ураджай на лён. Вярнуўшыся дадому, дзяўчаты хаваюцца ў лазні. Тут яны прадуць левай рукою лён і спрадзенымі ніткамі пераблытваюць вуліцу ад аднаго боку да другога. Калі пастух прагоніць па вуліцы скаціну, у гэтых нітках заблытаецца карова ведьмы, якая адбірае малако” [86, с. 211].

**Дзяды.** У коле каляндарных святаў, у якіх прымалі ўдзел дзеці, варта адзначыць яшчэ памінальныя дні, у прыватнасці, Дзяды. З’яўляючыся праявамі ўшанавання продкаў роду, памінальныя ўрачыстасці насілі калектыўны характар і абавязвалі да ўдзелу ўсіх без выключэння членаў сям’і. Таму дзеці удзельнічалі ў доглядзе могілак, агульнай малітве, памінальнай трапезе. Паводле аднаго з апісанняў, “адзіным прадметам застольнай гутаркі з’яўляюцца, зразумела, дзяды, якіх памінаюць. Агульнымі намаганнямі сям’і прыгадваюцца не толькі дробныя выпадкі з жыцця памінаемых, іх словы і настаўленні, але таксама нязначныя фізічныя асаблівасці, накшталт родзінкі на падбародку і г.д. І ва ўсёй гэтай працяглай гутарцы няма месца выказванням пра адмоўныя бакі дзядоў” [73, с. 166]. Паводле паведамлення аўтара аднаго з апісанняў, на Дзісеншчыне з днём Дзядоў звязвалі своеасаблівае рэдагаванне сямейнай хронікі, якая вялася “на бэльках хаты ў пачэсным куце”, дзе “нованароджаных упісвалі, а памёршых выпісвалі” [73, с. 168]. Такім чынам, акрамя непасрэдна рытуальных функцый, святкаванне Дзядоў мела і выхаваўчае значэнне, так як дазваляла дзецям даведацца аб сваіх продках, усвядоміць роднасныя сувязі, авалодаць этычнымі нормамі, садзейнічала захаванню міжапакаленных сувязей і своеасаблівай трансляцыі гістарычнай памяці.

### 3.4.2 Роля дзяцей у сямейных абрадах

У “Матэрыялах …” П.В. Шэйна [57, с. 3 – 5] радзіны ў Віцебскай губерні апісваюцца наступным чынам. Калі жанчына адчуе пачатак родаў, яна пасылае за бабкай - павітухай. Імкнуцца, каб найменш людзей ведалі пра пачатак родаў, таму што гэта прыводзіць да павелічэння іх працягласці. Асабліва непажаданым лічыўся прыход чужых людзей, таму часта для нараджэння дзіцяці абіралі не жылое памяшканне: гумно, лазню і інш. Лёс чалавека, яго здароўе, багацце, па народным

PolotskSU

меркаванні, залежылі ад шматлікіх абставін яго з'яўлення на свет. Мела значэнне любая дробязь: словы і дзеянні маці, бабкі-павітухі, час і месца нараджэння, надвор'е, дзень тыдня і г.д. Таму нараджэнне дзіцяці суправаджалася магічнымі прыёмамі, знаўцай і выканальніцай якіх была бабка-павітуха. Напрыклад, пупавіну хлопчыку рэзалі на дубовай трэсцы, сякеры, каб быў моцны, добры працаўнік, ці на кнізе – каб быў пісьменны, дзяўчынцы – на верацяне, хлебнай лапаце, каб была работніца і г.д. Пасля нараджэння дзіця мылі ў вадзе, куды кідалі бурштын, дробныя манеты (каб быў багаты), лілі некалькі кропель водкі (каб быў моцны), сыпалі свянцоную соль (каб не "сурочылі"), клалі бурачок (каб быў здаровы) і г.д. Дзіця загортвалі ў полкі (пялюшкі), часам у бацькоўскую кашулю (каб паважаў бацьку), клалі на ложак (але не ў калыску, бо туды можна класці толькі пасля хрышчэння). Бабка-павітуха імкнулася не хваліць дзіця (верагодна, каб не "сурочыць"). Калі ў адносінах народжанага што і казалася, то тыпу: "*Во ён, паскуднічек, які плюгавенькі! Ніхай ён лепш ляжыць з Хрістом!*" [57, с. 4]. За дапамогу бабка звычайна нічога не брала, зрэдку сустракаюцца звесткі, што парадзіха дарыла ёй кавалак палатна, дробныя манеты.

Нараджэнне дзіцяці на Падзвінні было звязана з вялікай колькасцю абмежаванняў, забарон, перасцярог і магічных дзеянняў. Напрыклад, перад наступленнем родаў парадзіху трэба было абвесці тры разы вакол стала, засланага абрусам, тады дзіця будзе "*пільнаваць дому*" і жыць "*у дастатку*" [107, с. 304].

Пры нараджэнні дзіцяці пупавіну завязвалі і хавалі. Лічылася, што калі дзіця ў 7-м гадоў развяжыць яе, то будзе вельмі ўмелым чалавекам [107, с. 314].

Пасля нараджэння дзіцяці да парадзіхі прыходзілі ў "*правідкі*", у "*адведкі*" замужнія жанчыны-суседкі. Традыцыйна у "адведкі" не маглі прыходзіць мужчыны і незамужнія дзяўчаты. Кожная наведвальніца прыносіла з сабой пераважна бліны. Цікава, што звычай прыносіць бліны у "*адведкі*" захаваўся да канца XX ст. на Падзвінні. Рэспандэнтка з Верхнядзвінскага раёна адзначала, што "*як якую бярэменную ўвідзяць, то кажуць: "Ну, скора будзем бліны есьці! " Ці яе спрашваюць: "Ці скора на бліны прэгласіш?" Гэта значыць, што абязацельна бліны гатовілі"*.[38] Чым бы не займалася парадзіха (звычайна, пасля родаў жанчына прыступала да будзёных спраў ужо на другі дзень), пры з'яўленні наведвальніц яна клалася ў ложак. П.В. Шэйн адзначае, што звычайна размова ў жанчын ішла пра роды, пры гэтым, парадзіха частавала наведвальніц водкай. Кожная з наведвальніца цікавілася дробязямі ў адносінах здароўя парадзіхі і зусім не звяртала ўвагі на дзіця, часам, не ведала, нават, хто нарадзіўся: хлопчык ці дзевачка. Ролю ахоўніцы пры немаўляці выконвала бабка-павітуха, якая знаходзілася пры дзіцяці і абараняла яго ад "ліхога вока" [57, с. 5].

[38] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэц Р.І., 1937 г.н., в. Зялькі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.

Ахоўная функцыя бабкі-павітухі ў адносінах дзіцяці праяўлялася ў яе дзеяннях пасля нараджэння. Адразу пасля родаў бабка купала дзіця, пасля чаго тры разы цалавала яго ў спінку і сплёўвала ў ваду, каб такім чынам “адагнаць нячысцікаў.” З мэтай абараніць дзіця ад нячысцікаў яго загортвалі ў бацькоўскае адзенне і клалі ў нагах на ложак маткі, лічылася, што яна таксама асцерагае яго. Забарона класці дзіця ў калыску, зыбку, начоўкі да хрышчэння звязана з уяўленнем, што любое калыханне прываблівае нячыстую сілу, і калі пакласці нехрышчонае дзіця ў калыску да яго “прычэпіцца нячысцік” [86, с. 14]. Рэшткі уяўленняў аб сувязі паміж нячысцікамі і калыханнем захаваліся ў шарока распаўсюджанай у ХХ ст. бытавой забароне на Падзвінні калыхаць нагой “*чарцей калышаш*”. [39]

Калі надыходзіў дзень, прызначаны для хрышчэння немаўляці, кум і кума вязуць яго к “храсту” абавязкова пад вечар [86, с. 5]. Родныя матка і бацька ў царкву не ехалі. У кан. ХХ – пач. ХХІ ст. на тэрыторыі Падзвіння захваліся рэшткі гэтай традыцыі. І хоць, у сучасных умовах родныя бацькі абавязкова прысутнічаюць у царкве пры хрышчэнні, у застольнай размове падчас святкавання хрэсьбін, у аповедах рэспандэнтаў застаецца напамін аб даўняй традыцыі.

На хрэсьбіны ўсе запрошаныя жанчыны прынасілі з сабой па куску хлеба і якую-небудзь страву, часам – толькі белую булку. Мужчыны абавязаны прынесці кошык якога-небудзь зерня, а хто мае, то – воску “на свечку”. Такім чынам, пачастунак рыхтаваўся “у складчыну” [107, с. 39].

Таксама на хрэсьбіны ў некаторых месцах Віцебшчыны прыносілі зерне (проса) ці па 1-2 капейкі, але аддавалі прынесенае не парадзісе, а яе старэйшым дзецям ці бабцы-павітухе [107, с. 331].

Бабка, калі падавала кашу, пяяла:

“Паздраў, Божа, каваля,
А што скаваў нам дзіця!
А ні ў ручкі ні хукаў,
А ні молытамі ні стукаў,
А ў мягкіх падушках,
А пад цёплай дзяружкай,
Без молата, без кавадла,
А глядзі – дзіця ладна!” [107, с. 330].

Калі б’юць гаршчок з бабінай кашай, хто-небудзь ідзе на вуліцу і гукае: “дзеці, дзеці! Кашу бабіну б’юць! Бяжыце скарэй!” Сабіралася поўная хата дзяцей і ім раздавалі па-троху кашы. Дзеці елі кашу тут жа, а дарослыя сваю долю неслі дадому [107, с. 333].

[39] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэц Р.І., 1937 г.н., в. Зялькі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

У канцы хрэсьбін на тэрыторыі Падзвіння традыцыйна каталі бабку “на баране”. У пач. ХХ ст. звычайна вязлі бабку ў карчму, дзе яна “адкупалася” квартаю гарэлкі. Звычай захаваўся да канца ХХ ст. варыянтамі “транстарту” для бабкі на Падзвінні з’яўляліся: начоўкі, санкі (зімой), карыта, сялянскі воз (“калёсы”), куды запрагаліся ўсе ўдзельнікі пагулянкі згодна жадання.

На тэрыторыі Віцебшчыны ў кан. ХІХ – пач. ХХ ст. зафіксаваны абрад “змыванне мура.” Звычайна ён адбываецца на трэці дзень пасля хрэсьбін [86, с. 334]. П. Шэйн звязваў гэты абрад з глыбокай рэлігійнай верай сялян, нібыта беларускі селянін настолькі веруючы, што не можа дапусціць, каб і адна кропля “святога міра,” якім мажуць дзіця ў царкве, прапала дарэмна [57, с. 34].

У Віцебскай губерні згодна апісанням Я.Р. Раманава, на “жмурынкі ” (“мыравінкі”) прыходзяць у дом да парадзіхі бабка, кум, кума і бліжэйшыя родныя. Бабка брала дзіця ў маткі, ставіла яго голага на кут, на разасланы там кажух і клала на галаву некалькі абаранкаў і аблівала яе асвяшчонай крышчэнскай вадой. Бранакі з галавы дзіцяці раздавалі іншым дзецям, а бабка купала немаўля. Выкупаўшы, спавівала і аддавала матцы. Гэты абрад называўся “змыванне мура.” Пры купанні ў ваду клалі срэбныя грошы, “каб дзіця было багатым і чыстым, як срэбра”. Часам, бабка сыпала ў ваду авёс, “каб дзіця было не плаксівае, а шчаслівае”. Ваду вылівалі на кут пад абразы [107, с. 329].

У ХХ ст. абрад паводле праведзенага палявога даследавання ўжо не фіксаваўся.

Радзінна-хрэсьбінная абраднасць вельмі моцна мадэрнізаваліся на Падзвінні ў ХХ ст. Пры правядзенні палявых даследаванняў былі заўважаны наступныя трансфармацыі ў традыцыйных абрадах, звязаных з нараджэннем дзяцей: у Полацкім, Ушачскім раёнах “бабкай” у ХХ ст. называлі не тую жанчыну, якая непасрэдна прымала роды, а тую якая першы раз купала дзіця. Пры гэтым, па-ранейшаму вясковыя жанчыны лічаць што быць “бабкай” – гэта прэстыжна, былі вельмі задаволены, калі іх запрашалі. Тое ж у адносінах да кумаўства, быць кумам лічыцца пачэсна. Выпадкі запрашэння ў кумы чужых (выпадковых, прышлых) людзей зафіксаваны толькі ў Браслаўскім раёне. У астатніх выпадках у ХХ ст. у кумы запрашалі ці сваякоў ці сяброў (суседзяў па вёсцы). На Мёршчыне, Верхнядзвіншчыне пераважаюць уяўленні аб тым, што ў кумы трэба запрашаць нежанатых людзей. Ва Ушацкім, Полацкім, Расонскім раёнах гэтая заканамернасць не зафіксавана. Большасць рэспандэнтаў лічаць, што ў кумы можна запрашаць жанатых сваякой ці сяброў. Лічыцца, што кумамі могуць быць і жанатыя, аднак, паўсюдна распаўсюджана ўяўленне аб тым, што шлюбная пара не можа быць кумамі ў аднаго хросніка адначасова, лічыцца, што кумамі павінны быць людзі, якія паміж сабой “чужыя,” т.е. не з’яўляюцца мужам і жонкай. Паўсюдна распаўсюджаны ўяўленні аб тым, што бярэменная жанчына не можа быць кумой, бо нанясе шкоду і свайму дзіцёнку і хросніку. Зафіксавана імкненне маладых дзяўчат удзельнічаць у

хрышчэнні хлопчыкаў, якое нібыта спрыяе больш хуткаму заключэнню шлюба самой хроснай маці.

У XX ст. адбыліся якасныя змены абставінаў нараджэння жанчынай дзіцяці. Калі большасць рэспандэнтак, якія нарадзіліся ў 20-я г. XX ст. адзначаюць, што ражалі дзяцей дома, то ўжо большасць рэспандэнтак, якія нарадзіліся ў 30-я г. XX ст. адзначаюць, што яны нараджалі дзяцей у медыцынскіх установах. Улічваючы, што перыяд детанаражэння першых прыходзіўся на даваенныя, ваенныя і першыя пасляваенныя гады, а апошніх (у большасці) на канец 50 – 60 гг. XX ст., можна зрабіць выснову, што менавіта ў 60-я г. XX ст. пачаўся працэс страты пласта народнай культуры, звязанага з радзільнай абраднасцю. Зніжаецца статус і, паступова, цалкам перастае існаваць сацыяльная роля павівальнай бабкі, зніжаецца роля кумоў у жыцці дзіцяці. Калі да гэтага працэсу дадаць урбанізацыйныя тэндэнцыі 2-й пал. XX ст. і агрэсіўную савецкую антырэлігійную палітыку, то становяцца зразумелымі прычыны хуткай страты пласта народнай культуры, звязанага з нараджэннем і выхаваннем дзяцей.

Адбітак наклала на народныя традыцыі савецкая антырэлігійная прапаганда, асабліва ў той частцы Віцебшчыны, на якой больш доўгі час існавала савецкая ўлада (Усходняя частка). Больш часта на Расоншчыне, Полаччыне, Ушаччыне (у параўнанні з Мёршчынай, Браслаўшчынай, Глыбоччынай) не хрысцілі дзяцей. Прычыну рэспандэнты тлумачылі па-рознаму: адсутнасць паблізу царквы (савецкія ўлады закрывалі храмы), прыналежнасць да партыі камуністаў аднаго члена сям'і, неабходнасць выбару справак з сельсавета аб месцы жыхарства (у савецкія часы святары абавязаны былі дасылаць інфармацыю у сельсаветы аб правядзенні абрадаў хрышчэння, вянчання), боязнь рэпрэсіўных дзеянняў з боку ўлад. Ні адзін з рэспандэнтаў не пазначыў, што не хрысціў дзяцей з-за цвёрых атэістычных перакананняў, наадварот, падкрэслівалася, што "ў бога веру (і "іконы ў доме трымаю"), але так "*скаліся жыццёвыя абставіны*". [40]

### 2.4.2 Роля дзяцей у сямейных абрадах

У межах традыцыйнага светапогляду быў выпрацаваны цэлы комплекс уяўленняў, вераванняў, магічных практык, звязаных з цяжарнасцю, родамі, імянарачэннем дзіцяці, уключэннем яго ў соцыум і набыццём ім неабходных якасцей  і характарыстык.

На тэрыторыі Падзвіння існаваў пэўны набор прыкмет, па якіх можна было прадказваць наступленне цяжарнасці. Гэтыя прыкметы звязваліся з паводзінамі птушак і жывёл. Напрыклад, паводле сведчання М. Я. Нікіфароўскага, "калі сава пракрычыць "ку-га" ку-га" каля дома маладухі, апошняя "заціжарыла" і, несумненна, будзе мець "кугакылу" [72, с. 1], акрамя таго, да цяжарнай пачыналі

[40] Запісала Андрыеўская С.У. ад Пракоф'евай Л.А., 1939 г.н., в. Рудня Расонскага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

асабліва лашчыцца хатнія жывёлы, у прыватнасці, кошкі і сабакі [72, с. 2]. Цяжарнасць прадказвалі і сны, у прыватнасці, калі жанчына бачыла ў сне "трусоў, вавёрак, пацукоў, мышэй..., пчол, ракаў і чародную рыбку", а ў асаблівасці – "дзіцянят дробных млекакормячых і птушанят" [72, с. 2]

Паводле этнаграфічных запісаў др. пал. XX ст., жанчыны пазнавалі аб наступленні цяжарнасці па змене эмацыйнага стану: "Наверна, я ўжэ панісла. Я ні магу без яго быць. Я настолька скучаю (без мужыка, значыць), ён мне настолька дораг, што я, наверна, бярэменна" [95, с. 231].

Шэраг прыкмет указваў на тое, якім будзе пол будучага дзіцяці, пры гэтым практычна заўсёды заўважаецца суаднесенасць полу з адпаведнай часткай бінарнай апазіцыі "левы-правы": "калі шавяленне ў правым баку – хлопчык, у левым – дзяўчынка" [97, с. 88], "калі, седзячы, цяжарная выцягвала правую нагу – народзіцца хлопчык, калі левую – дзяўчынка [51, с. 17]; "*садзіцца нада было ў бані, сесці, і ўстаць з полу, вот толька я забылася – еслі на правую старану ўстанеш, адзін рабёнак будзець, а на левую еслі ўстанеш – другі*".[41] Акрамя таго, калі цяжарная у адказ на пытанне "Каго народзіш?" саромелася, чырванела, лічылі, што народзіцца дзяўчынка, калі ж адказвала смела, то чакалі сына [79, с. 88].

Пол будучага дзіцяці вызначалі таксама па форме жывата цяжарнай, і гэтая прыкмета аказалася вельмі ўстойлівай і дажыла практычна да нашых дзён: "если животик острый, то мальчик, если округлый – девочка".[42] Таксама папулярным у сучаснасці з'яўляецца перакананне, што дзяўчынка у маці "забірае красату".[43]

Надзвычай багаты комплекс вераванняў, перасцярог і магічных прыёмаў быў звязаны з паводзінамі цяжарнай, ад якіх залежалі як паспяховае выношванне плоду і роды, так і жыццё будучага дзіцяці. Па вызначэнню Т. І Кухаронак, "у большасці правілаў паводзін рацыянальныя і магічныя элементы настолькі цесна перапляліся, што іх цяжка адлучыць адзін ад другога" [51, с. 18].

Найперш, цяжарнай забаранялася глядзець на з'явы і прадметы, якія могуць негатыўна адбіцца на здароўі і знешнім выглядзе будучага дзіцяці. Напрыклад, цяжарнай нельга падоўгу "глядзець на мерцвяка, і асабліва на яго твар, нават і ў тым выпадку, калі гэта будзе нехта з бацькоў, муж і дзіця, таму што нованароджаны будзе пакутваць на "бледную немач"" [72, с. 2 – 3]. Характэрна, што цяжарная павінна была выходзіць з хаты перш, чым выносілі нябожчыка [95, с. 384]. Агульнараспаўсюджаным і даволі ўстойлівым на тэрыторыі Віцебшчыны з'яўляецца павер'е аб забароне цяжарнай падчас пажару хапацца рукамі за твар ці цела, "інакш у дзіцяці на ўсё жыццё застанецца "красуха" на адпаведным месцы" [72, с. 3]; "дзе лапніш, як гарыць, там можа быць... пятны красныя."[44] Цяжарнай забаранялася

[41] Запісалі Мішына В. І. ад Парцянка М.М., 1938 г.н., в. Несцераўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.
[42] Запісалі Мішына В. І., студ. ПДУ Пухава Т. ад Гарлачовай І.М., г. Полацк Віцебскай вобласці.
[43] Запісалі Мішына В. І., студ. ПДУ Свірко Н. ад Гарбуновай Т.М., в. Гараўцы, Міёрскі раён Віцебскай вобласці.
[44] Запісала Мішына В. І. ад Дранковіч Д.В., 1928 г.н., в. Хмялёўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.

глядзець на "кульгачных, сляпых, сухарукіх і ўвогуле калек, а таксама на карлікаў і веліканаў" [72, с. 3], на "несуразных" людзей, каб дзіця не было такім жа [79, с. 91], а перакананне, што "*надо смотреть на красивых людей, чтобы у самой красивенький родился*" бытуе да сённяшняга дня. [45]

Мноства рэгламентацый паводзін тычылася штодзённага жыцця і заняткаў цяжарнай: ёй забаранялася "наступаць на аглоблю, дугу, хамут, кнутавішча, абручы, абады, палазы і ўвогуле крывыя прадметы, нядбайна кінутыя на двары: дзіця абавязкова будзе гарбуном" [72, с. 4]; "тушыць нагамі галавешку, што з печы выпала, калі збіралася пячы хлеб, бо, казалі, у дзіцяці будзе жывоцік балець увесь час" [79, с. 91], хадзіць па апілках, што "магло прывесці да рэзяўу страўніку немаўляці [51, с. 25], насіць у фартуху крупы, каб у дзіцяце не з'явіліся болькі на целе [51, с. 25], сядаць на камень, каб дзіця не было лысым [77, с. 177]. Распаўсюджаным на тэрыторыі Падзвіння (як і ў іншых рэгіёнах Беларусі) было вераванне, што цяжарнай нельга пераступаць вяроўку, нітку, хворaст, хмель, снапы, інакш у дзіцяці пупавіна абматаецца вакол шыі і пры нараджэнні яно можа "зыдусіцца" [72, 5]. Падобныя уяўленні бытуюць і зараз па словах інфарматараў.

Цяжарным забаранялася "піхаць ката нагой", пераступаць яго – "дзіця часацца будзе" [79, с. 90], і ўвогуле "калі "ціжарныя штырхаіць" нагамі і рукамі нейкую жывёлу, то дзіця будзе мець адрозныя ўласцівасці і схільнасці гэтай жывёлы: напрыклад, абжорства і неахайнасць свінні, няўклюднасць каровы, нясмеласць курыцы, "бязурысь" авечкі, "збрадлівасць" кошкі" [72, с. 4]. Акрамя таго, на Падзвінні шырока бытавала перакананне, што калі жанчына б'е, штурхае кошку ці сабаку, або проста занадта шмат глядзіць на іх, на целе дзіцяці могуць вырасці валасы ("шэрсць") [76, с. 106, с. 166, с. 255].

Цяжарнасць накладвала абмежаванні на сацыяльныя паводзіны жанчыны. Праўда, паводле сведчання М. Я. Нікіфароўскага, "пажадана, каб цяжарная як мага часцей хадзіла ў царкву, але пры гэтым яна павінна станавіцца спераду, каб не маліцца у патыліцы і спіны астатніх багамольцаў – дзіця вечна будзе ў паследышах" [72, с. 6]. Аднак у большасці выпадкаў трэба было "дужа па людзях ні хадзіць бярэменным, каб ні... ні за тое, што стыдна, а за тое, каб усё было добра з дзяцёнкам". Па паведамленні адной з інфарматарак, адсутнасць жанчыны падчас калектыўнага прагляду кінафільма сведчыла, што "іна ў палажэніі, ёй няможна глядзець".[46] Калі ж жанчына удзельнічала ў рознага роду святкаваннях, асабліва на вяселлі, "цяжарная павінна апранаць, па магчымасці, парны лік усялякай "адзежыны", напр. дзве кашулі, дзве "спадніцы", два "пыясы", дзве "хусткі" і інш. У процілеглым выпадку у дзіцяці будзе недахоп у парных частках цела: у вачах, вушах, вуснах, руках, нагах, пальцах і інш" [72, с. 6].

[45] Запісала Мішына В. І. ад Дземідовіч Л.П., 1937 г.н., в. Хмялёўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.
[46] Запісала Мішына В.І. ад Дранковіч Д.В., 1928 г.н., в. Хмялёўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.



Polotsk.su

Цяжарнай забаранялася станавіцца хроснай маці для іншага дзіцяці, паколькі лічылася, што “адно з нованароджаных дзяцей абавязкова памрэ: часцей жа ўсяго паміраюць абодва” [72, с. 6]

Цікава, што адносна цяжарнай жанчыны паслаблялася дзеянне некаторых сацыяльных норм: “Калі цяжарная забярэцца ў чужы агарод, сад, гарох, яўна ці таемна, і стане есць чужое дабро, то гаспадары не толькі не прагоняць вон, а пастараюцца не заўважаць “шкоды”: усялякая “пірашкода” пашкодзіць цяжарнай і дзіцяці” [72, с. 8]. Цяжарным дазвалялася красці гарох, каб “у дзіцяці былі кучаравыя валасы” [79, с. 88].

Цікавая група вераванняў звязаная з пазыкай цяжарнай якой-небудзь рэчы. Паводле адных сведчанняў, калі цяжарная прасіла нешта пазычыць, адмаўляць ёй было нельга, бо той прадмет усё роўна будзе знішчаны – “пагрызены мышамі..., скрадзены, згублены, знішчаны пажарам” [72 ,с. 5]. З другога боку, каб папярэдзіць магчымую страту, у цяжарную трэба было “кінуць ці глінай, ці вуглем, чым-нібудзь, тады дзяцёнак і будзіць гэта есць”.[47] Таму, па меркаванні многіх інфармантаў, лепей за ўсё цяжарнай было ў пазыкі не хадзіць.

Асэнсаванне падвержанасці цяжарнай і плода асаблівай небяспецы садзейнічала існаванню дзеянняў апатрапейнага характару, якія засцерагалі найперш ад “кепскага вока” і “сурокаў”. Для гэтага жанчына насіла з сабой “чацвярговую соль” [72, с. 7]. Калі жанчыне прыходзілася ісці на пахаванне, яна абавязкова павінна быць “у красным платку ці кофта штоб красная” [77, с. 255], інакш дзіця будзе бледным, як нябожчык. Разнастайныя прадметы-абярэгі шырока выкарыстоўваюцца цяжарнымі і ў наш час: “*Я когда ходила беременной, мама вечно меня снабжала иконками, ладанками, всякими камушками и амулетами от сглаза*”.[48]

Згодна логікі традыцыйнага светапогляду, нованароджанае дзіця прыходзіць у гэты свет як істота, што яшчэ не з’яўляецца чалавекам у поўным сэнсе гэтага слова, і гэты адметны статус патрабауе пэўных рытуальных дзеянняў, накіраваных “на далучэнне” дзіцяці да свету людзей, да сферы “свайго”. “Пераўтварэнне” нованароджанага ў чалавека, пачыналася адразу пасля нараджэння, і першай, хто выконваў гэтыя дзеянні, была бабка-павітуха, якая адыгрывала важную ролю ў доглядзе нованароджанага дзіця і аднаўленні здароўя парадзіхі. Паўсюдна на Падзвінні існавала патрабаванне прымаць дзіця “не галаруччу”, а абкруціўшы рукі новым палатном, каб у будучыні яно не жыло з голымі рукамі” [72, с. 10]. Аднак пялюшкі і іншыя дзіцячыя рэчы патрабавалася рабіць “са старызны” якую насілі старэйшыя – тады дзіця “абавязкова возьме ў спадчыну добрыя рысы тых, чыю старызну будзе насіць” [72, с. 14]. Зараз інфарманты тлумачаць гэтае патрабаванне хутчэй з меркаванняў гігіены (“новае калаватае было, гэта цяпер усё крамнае. А

[47] Запісала Мішына В.І. ад Ханяк А.І., 1932 г.нар., в. Макараўшчына, Лепельскі р-н Віцебскай вобласці.
[48] Запісала Мішына В.І. ад Гарбуновай Т.М., 1978 г. нар., в. Гараўцы, Міерскі раён Віцебскай вобласці.



PolotskSU

тады ўжо гатуеш... рубашку вынашаную, ці якую там пасцілачку мяканькаю, і спавіваеш").[49] Існавала на Віцебшчыне і павер'е, што дзіця трэба было прымаць у адзенне процілеглага полу: дзяўчынку – "у мужчынскія штаны і абавязкова бацькавы, каб яе любілі хлопцы", а хлопчыка – "у жаночую кашулю, і абавязкова ў кашулю маці, каб яго любілі дзеўкі" [31, с. 95 – 96].

Шмат прыкмет было звязана са знешнім выглядам і паводзінамі дзіцяці адразу ж пасля нараджэння: "Калі "новы-нараждэніц" выходзіць "тваркай у гору", то ён будзе "гадавацца", "у ніз" – хутка памрэ" [72, с. 10]; "Калі ў "новага-нараждэнца жоўтая тварка", то ён скора "замрэць ат жаўтачкі" [72, с. 10]; "як крычыць – гэта добра! Гэта добра! Гэта пяяць будзець добра, вясёлы будзець. А як, гавораць, маўчком – мармыль" [77, с. 256].

Паўсюдна на Падзвінні сустракаецца звычай пераразаць пупавіну на якім-небудзь прадмеце, што, як лічылася, паўплывае на будучы лёс дзіцяці. Так, хлопчыку бабка-павітуха пупавіну "перабівала камянямі, каб сільны быў, пераразала на кніжцы "каб граматны быў" [79, с. 89], дзяўчынцы – "на нітках, іголках, кручках" [79, с. 93]. Пры гэтым сустракаецца перакананне, што на сякеры пераразаць пупавіну нельга, інакш дзіця будзе "разбойнікам". Адразанне пупавіны набывае, такім чынам "дадатковае рытуальнае значэнне: задае неабходныя межы частак чалавека, "накіроўвае" прыроду ў патрэбны бок і ў той жа час акрэслівае рамкі будучага жыцця як у біялагічным, так і ў сацыяльным плане" [10, с. 42].

Пупавіну і "дзіцячае месца" у некаторых мясцовасцях закопвалі ў зямлю, пад вугал хаты ці пад печ (інфарманты часам згадваюць, што "туды цянець, дзе пупіна схавана", а пупок, што адваліўся, загортвалі ў тканіну, перавязвалі ніткай, захоўвалі за бэлькай, за іконай ці у кубле [79, с. 91; 76, с. 236]. Калі дзіця дасягала пэўнага ўзросту (тры, пяць або сем год), яно павінна было развязаць "пупок" – "*тады будзе дужа умны рабёнак – як сам развяжаць*" [77, с. 273]. У некаторых раёнах пупавіну захоўвалі і аддавалі, калі хлопец ішоў у войска, а дзяўчына – замуж ("каб шчаслівыя былі") [95, с. 235]

Паводле народнага меркавання, дзіця, якое нарадзілася "ў сарочцы" ці "ў шапачцы", не толькі само было шчаслівым, але і прыносіла дабрабыт усёй сям'і [72, с. 11].

Важнае значэнне надавалася першаму купанню дзіцяці, якое выконвала не толькі функцыю пасляродавага рытуальнага і гігіенічнага ачышчэння, аддзялення дзіця ад сферы "нечалавечага, але, па народным меркаванні, зноў-такі, аказвала ўплыў на будучы лёс нованароджанага. Так, у ваду для купання кідалі грошы: "каб быў шчаслівы, каб крэпенькі быў, каб грошы вяліся [95, с. 235], у некаторых раёнах у час купання хлопчыка дадавалі піва, каб быў моцны, дзяўчынкі – малако, каб была прыгожая [95, с. 235]. Нельга было купаць дзіця ў гатаванай вадзе – "будзе кіпець

[49] запісала Мішына В. І. ад Дранковіч Д.В., 1928 г.н., в. Хмялёўшчына, Докшыцкі р-н. Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

усё жыццё" [79, с.91]. У ваду таксама клалі зерне, бурштын [79, с. 91 - 92], нават кідалі кавалачак сала і ўлівалі крыху гарэлкі [57,с. 4]. Сімвалічнае значэнне мела і вада, што заставалася пасля купання. Традыцыя патрабавала выліць яе куды-небудзь у "ціхае месца" ў садзе ці пад печ, каб дзіця было спакойнае, ці "каб ніхто не стаптаў шчасце, якое ён прынёс на гэтат свет" [95, с. 241]. Лічылася таксама, што калі дзіця пасля першага купання пакласці на правы бок, то ён будзе "праўшак", а на левы, адпаведна – "ляўшак" [31, с. 107]. Такая ж самая прыкмета тычылася і першага кармлення [77, с. 104].

Варта адзначыць, што ў другой палове ХХ стагоддзя, з развіццём медыцынскага абслугоўвання, інстытут бабак-павітух практычна знік, а разам з ім знік і комплекс вераванняў, абрадаў, звычаяў, звязаных з нараджэннем дзіцяці.

Больш устойлівымі заставаліся тыя рытуалы і вераванні, што тычыліся надання імя, хрычшэння дзіцяці і далучэння яго да соцыуму.

Паводле прааналізаваных этнаграфічных матэрыялаў, хрышчэнне носьбітамі традыцыйнай культуры разглядалася як важны этап у працэсе далучэння дзіцяці да сферы "свайго", яго рытуальнай сацыялізацыі. Да хрышчэння дзіця не мела адзення у поўным сэнсе гэатага слова (кашулі, пояса), яго загортвалі ў пялюшкі, а таксама нехрышчонае дзіця не клалі ў калыску [72, *с.* 14; 57, с.4], г. зн. яно ўсё яшчэ не з'яўляецца паўнавартасным чалавекам. Па вызначэнню А. К. Байбурына, менавіта "адзетасць – важнейшая прыкмета чалавека, яго ўключанасці ў сацыяльныя адносіны" [10, с. 45]. Пры гэтым нехрышчонае дзіця лічыцца асабліва "урочлівым", таму існавалі патрабаванні хаваць яго ад людскіх вачэй, не вывешваць на вуліцу бялізну і пялюшкі [77, с. 104], і ў вогуле "засцерагаць "радзіху і дзяцёнка" не толькі ад знешняга ветру, але і ўсялякага хвалявання паветра каля іх, які можа быць ад узмаху адзення, хусткі, шапкі, таму што з такім ветрам "прычыпаюцца нячысцікі" да слабай, зняможанай жанчыны і нехрышчонага дзіцяці" [77, с. 15].

З хрышчэннем у большасці выпадкаў звязвалася імянарачэнне дзіцяці, якое таксама разглядаецца як найбольш важны механізм уключэння нованароджанага ў культуру [10, *с.* 46]. Аднак паралельна існаваў рытуал "хрышчэння з вады", які мог выконвацца, "як слабенькі рабёнак, што, можэт быць, ні даждзет кростаў" [95, с. 236]. Такую ж функцыю магла выконваць бабка і пры адсутнасці святара [ 79,с. 95].

Імя магло як надавацца святаром падчас хросту, так і выбірацца самімі бацькамі і роднымі, што практыкавалася паўсюдна ў другой палове ХХ ст. Пры гэтым, як адзначаюць інфарманты, абіраліся імёны, якія найбольш падабаліся ў родзе, у сувязі з чым маглі паўтарацца: "у мяне быў сын Толя... і яшчэ ў радні ёсць, і яшчэ, аж чатыры ў нас".[50] У Шаркаўшчынскім раёне зафіксаваны звычай даваць імя першага сустрэчнага чалавека, якога бацька чакаў на скрыжаванні дарог [31, с. 127]. У апошнія дзесяцігоддзі вялікую ролю ў выбары імя адыгрывае своесасаблівая "мода" на імёны, звязаная з пэўнымі тэндэнцыямі развіцця культуры, сродкаў

[50] Запісала Мішына В. І. ад Крупа С.Ф., 1928 г.н., в. Несцераўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

масавай інфармацыі і інш. Побач з тым, “сейчас модно называть по церковному календарю, и в моде старинные имена” .[51]

Перад хрышчэннем галоўныя рытуальныя функцыі пераходзілі ад бабкі да кумоў. Кумы асэнсоўваліся як духоўныя бацькі дзіцяці, якія з’яўляліся “такімі самымі васпітацелямі, толька што ўжо духоўных [якасцей]..., яны далжны былі памагаць васпітываць, ... і ў царкву завясці хросная матка далжна была, ці ў касцёл”.[52] Як паказваюць матэрыялы апытанняў, за кумоў бралі пераважна людзей, з якімі былі ў добрых адносінах, сябравалі: “Кумаўство-любаўство. Хто ў дзярэўні наравіцца, хто падруга, таго”, “як па душэ чалавек”[53] або запрашалі кагосьці з радні: “Ці братоў, ці сясцёр, ... самыя блізкія, самая блізкая радня”[54]. Акрамя таго, кумоў стараліся падбіраць “па аднэй веры”. Цікава, што сустракаюцца процілеглыя меркаванні наконт таго, ці павінны быць адны і тыя ж кумы для ўсіх дзяцей сям’і. Так, у адных мясцінах Віцебшчыны лічылася, што “у таго чалавека, які часта мяняе кумоў, будуць нячэсныя, нядобрасумленныя дзеці” [51, с. 49], а у іншых казалі, што “адных і тых няможна” [браць за кумоў]. Калі ж у сям’і дзеці паміралі, то для нованароджанага запрашалі т. зв. “збожжых” кумоў – першых мужчыну і жанчыну, якіх бацька сустракаў на перакрыжаванні дарог, асабліва калі гэта былі старцы [72, с. 17]. Таксама вельмі добрым “для гадоўлі дзяцей” запрашаць у кумы родных брата і сястру [72, с. 17]. М. Я. Нікіфароўскі зафіксаваў таксама вераванне, што вельмі спрыяльным лічылася стаць хроснымі ў незаконнароджанага дзіцёнка, які “не толькі сам атрымлівае ад Бога шчасце з лішкам, але і дарыць яго сваім хросным” [72, с. 18]. У прыватнасці, “дзявушчая жанчына”, запрошаная ў хросныя да такога дзіцяці, павінна была выйсці замуж да таго часу, як хрэснік пачне хадзіць [72, с. 18].

Перад адпраўленнем да хросту дзіця купалі і перадавалі кумам. Як правіла, кума, ці павітуха з дзіцем на руках тройчы абыходзілі вакол стала [79, с. 91 - 94], што мела сэнс рытуальнага далучэння дзіцяці да аднаго з сакральных цэнтраў хаты і адначасова мела апатрапейныя мэты, паколькі, “пакідаючы першы раз бацькоўскі дом, дзіця можа падвергнуцца ўрокам” [72, с. 17]. Кумы бралі з сабой “загорнуты ў хусцінку кавалак хлеба з соллю, для таго, каб дзіця ўсё жыццё ня ведала голаду” [5, с. 148]. У пялюшкі дзіця перад адпраўленнем да хросту таксама маглі класці сыр, грошы і “яшчо чаго з’есці, каб багат ён быў, як вырасціць”, а дзяўчынцы пры гэтым “трэба ўстроміць іголку, пакласці трохі лёну, каб яна ў будучым зрабілася рукадзельніцай” [72, с. 19]. Выпраўляючыся ў царкву, кума прысаджвалася на тачыльны камень, каб дзіця “было моцным і здаровым” [*72,* с. 19]. На Глыбоччыне перад адпраўленнем кумоў у царкву жанчыны “зрывалі шапкі з мужчын і кідалі іх на воз, каб дзіця ціхае было і людзі яго не абгаворвалі” [79, с. 89].

---

[51] Запісала Мішына В. І. ад Гарлачовай І.М., 1986 г. нар., г. Полацк

[52] Запісала Мішына В. І.  ад Ліпскай М. Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міерскі р-н Віцебскай вобласці.

[53] Запісала Мішына В. І. ад Парцянка М.М., 1938 г.н., в. Несцераўшчына, Докшыцкі р-н Віцебскай вобласці.

[54] Запісала Мішына В. І. там жа.



PolotskSU

Комплекс прыкмет і павер’яў, звязаны з выпраўленнем кумоў з дзіцем да “хросту” і вяртаннем іх назад, дазваляе меркаваць, што дарога ў дадзеным выпадку ўвасабляла увесь жыццёвы шлях дзіцяці, а таму набывала асаблівае сімвалічнае значэнне. У сувязі з гэтым да паводзін кумоў  у дарозе прад’яўляўся шэраг патрабаванняў, выкананне якіх, паводле народных уяўленняў, забяспечвала фармаванне ў дзіцяці пэўных фізічных і псіхічных якасцей, садзейнічала яго хуткаму росту і паспяховаму развіццю, а таксама ўплывала на ключавыя моманты яго далейшага лёсу. Напрыклад, куме забаранялася станавіцца на кола, калі яна сядала на воз, або злазіла з іх, інакш у яе хрэсніка пасля ўступлення ў шлюб “не будзе дзяцей столькі год, колькі спіцаў было ў коле” [72, с.20]. Сустракаюцца сведчанні, што кумам нельга было спыняцца па дарозе для задавальнення фізіялагічных патрэб: “Каб у дарозе кумы не злязалі (з калёсаў), а то рабенак будзець мачыцца” [77, с. 48]. На першых ростанях кумы павінны былі выкінуць спецыяльна прыхопленыя гліну і соль, каб дзіця “не пужалася зазеху” [72, *с.* 20]. Дарожныя сустрэчы таксама набывалі адметнае значэнне, асабліва на зваротным шляху, паводле назірання М. Я. Нікіфароўскага [72, с. 20]. Увогуле, дзіця да хросту абавязкова стараліся везці на кані, што мела апатрапейныя мэты, пры гэтым на шляху да царквы кумы павінны былі “марудзіць, плутаць, рабіць лішнія аб’езды, каб схаваць дарогу і растрэсці паболей дзіцячых грахоў”, а на зваротным шляху “абраць найкарацейшую дарогу і ехаць з магчымай хуткасцю” [72, с. 21].

Паводзіны і стан дзіцяці непасрэдна ў час хрышчэння таксама былі падставай для таго, каб меркаваць аб яго будучым лёсе. Гэта цалкам зразумела, улічваючы, што “сам акт хрышчэння прыпадабняецца нараджэнню (г. зн. адбываецца як бы “сапраўднае” нараджэнне)” [10, с. 49], у сувязі з чым і актуалізуюцца практычна тыя ж прыкметы і прадказанні, што і ў час нараджэння. Калі дзіця плакала, гэта прадказвала яму доўгае жыццё, але кепскі характар, калі ж маўчала – рахманасць, але недаўгавечнасць; чыханне і кашлянне “пад кстом” прадвяшчала хваробы і смерць, а выпаражненне азначала нешта кепскае ў будучым не толькі для дзіцяці, але і для бацькоў [*72*, с. 20]. Нораў святара таксама мог паўплываць на фарміраванне адпаведных рыс у характары дзіцяці, што, па вызначэнню М. Я. Нікіфароўскага, выражаецца ў прыказцы “Мяне шалёны поп ксціў” [*72*, с. 21 – 22].

Такія ж шматлікія правілы рэгламентавалі паводзіны кумоў пасля вяртання з царквы і падчас хрэсьбіннага застолля. Напрыклад, уваходзячы ў хату з ужо ахрышчаным дзіцем кума з кумам павінна былі нешта “лыпытаць (каб дзіця хутка пачало гаварыць), пазбягаючы, аднак словаў, “якія ўвасабляюць паняцці застою, траты, пакут і інш” [72, с. 22]. Таксама кумы павінны былі хуценька прамовіць і некалькі разоў паўтарыць імя дзіцяці, інакш дзіця магло заікацца ў будучым. Хлопчыка па вяртанні маглі класці “на гаспадарскае мейсца” (на кут), а дзяўчынку – “на загнет”, каб яны мелі ў будучым адпаведныя гаспадарчыя схільнасці. Тады ж дзіця маглі класці і пад стол, каб яно “было шпаркае” [*72*, с. 22]. Існавалі і пэўныя



PolotskSU

формулы-пажаданні, якія прамаўлялі кумы, перадаючы ахрышчанае дзіця бацькам: "Пусь расцець здароў, вялік і шчасліў Ванька" [5, 148]; "Дай бог твайму сынку [дочке] стаяць так пад вянцом, як пад хрэстом" [79, с. 102].

Больш поўны варыянт пажадання запісаны ў "Матэрыялах …" П.В. Шэйна з в. Ветрына Лепельскага павета Віцебскай губерні:

"Кумка на покуць села,
Хорошую песню спела;
Першу – хрэсьбінную,
Другую – вясельную,
"А дай, Божа, гэтого дзіцяці
Хрэсьбінкі скакаці,
І вяселля дождаці."
Судзіў Бог відзець яго пад Храстом,
Судзі, Божа, яго відзець
І под вянцом " [57, с. 25].

На тэрыторыі Падзвіння бытавалі шматлікія павер'і і прыкметы, звязаныя з калыскай. Яны тычыліся як працэсу вырабу і ўсталявання калыскі, так і яе непасрэднага выкарыстання. Калыску павінны былі рабіць чужыя людзі, "інакш дзіця нядоўга пакарыстаецца ёю" [*72*, с. 23], яе абкурвалі зёлкамі, клалі рэчы-абярэгі [72, с. 22 – 23]. Шматлікія магічныя дзеянні выконваліся для таго, каб дзіця добра спала ў калысцы, не хварэла, хутка расло, а шматлікія правілы і забароны, звязаныя з выкарыстаннем калыскі, павінны былі папярэдзіць фарміраванне кепскіх рыс і якасцей дзіцяці [*72*, с. 23 – 24]. Шырока распаўсюджанай на тэрыторыі Падзвіння, як і ў іншых рэгіёнах, была забарона калыхаць пустую калыску, у такім выпадку "казалі, што чорт калышыць калыску". [55]

Галоўная мэта рытуальна-магічных дзеянняў, звязаных з радзінамі і хрэсьбінамі – забяспечыць дзіцяці яго "долю". Уласна кажучы, актам сімвалічнага пераразмеркавання калектыўнай "долі" з улікам нованароджанага, даследчыкі лічаць рытуал падзелу "бабінай кашы". Непасрэдна з "бабінай кашай" таксама звязаны пэўныя магічныя дзеянні, закліканыя паўплываць на нованароджанае дзіця. Цікава, што выкананне іх належыла іншым, старэйшым дзецям: "бабіну кашу давалі дзецям; яны яе хапалі і беглі з ёй на вуліцу. Лічылася, што гэта трэба рабіць, каб дзіця хутка бегала, калі падрасце. Ад дзяцей адкупляліся цукеркамі, і тады бабіна каша вярталася на стол" [95, с. 253]. Паводле меркавання аўтараў выдання "Традыцыйная мастацкая культура Беларусі", глыбінны сэнс гэтага звычаю з менавіта ў старажытным рытуале пераразмеркаванні ўсеагульнай "долі", увасобленай "бабінай" кашай, паміж усімі дзецьмі грамады [95, с. 253].

У адрозненне ад радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу, дзе дзіця з'яўляецца адным з галоўных удзельнікам (праўда, пасіўным), удзел дзяцей у

[55] Запісала Мішына В. І. ад Ліпскай М. Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міёрскі р-н Віцебскай вобласці.

вясельным абрадзе быў значна меншым. Безумоўна, дзеці прысутнічалі на вяселлі, але у асноўным як назіральнікі. Аднак у некаторых выпадках іх удзел быў пажаданым, больш таго, за імі трывала замацоўваліся пэўныя рытуальныя функцыі. Так, часам дзяцей абіралі на ролю “падкоснікаў”, што расплятаді ці расчэсвалі косы нявесце [72, с. 64], а таксама маглі весці нявесту за пояс да вясельнага стала [72, с. 63]. У некаторых мясцовасцях дзеці перагароджвалі дарогу вясельнаму поезду, і “ім давалі гасцінцы: канфеты, ці можа, там, яблакі какія” [95, с. 319]. У Лепельскім і Шаркаўшчынскім раёнах былі зафіксаваны сведчанні, што дзеці павінны былі “прадаваць падушкі” нявесты, калі яе адвозілі у дом жаніха: “Пасодзюць во такога рабёначка. Я пасадзіла сястру дваюрадную. ... Сказалі: “Прасі бумажку з хвосцікам”. А гэта была дваццацьпятка сіняя”. Крычыць “Давай!” А ў маладзёна нічога не было. Ну, алі даў бумажку з хвосцікам”; “мяне пасадзілі эта, падушкі прадаваць.... Давалі мне... казалі, давалі мне, як на даўнейшыя, злот. – А, не! А тады дзве па дзесяць грошай далі. Дык мне гэтага дзве падалі – гэта болі, а гэна мала. Ну, тады пасміяліся, кажуць: “О! Давалі злот, дык ні хацела, а дзесяць грошы, дык...”.[56] Маладая на вяселлі была абавязана пакланіцца ўсім без выключэння, ў тым ліку дзецям: “Як мы малыя былі, бяжым колькі сілы, каб маладуха пакланілася. І дзяцём кланяецца. Спіна корчам стане. А мы як мага бяжым вароты адчыняць. А маладуха канфет кіне дзяцём” [19, с. 555]

Этнаграфічныя матэрыялы утрымліваюць вельмі мала сведчанняў таго, што дзеці прысутнічалі на пахаванні як выканаўцы нейкіх значных рытуальных дзеянняў. Аднак, з’яўляючыся часткай вясковай супольнасці, яны не маглі быць ізаляваны ад гэтых падзей, тым больш што смерць некага з блізкіх ці аднавяскоўцаў магла паўплываць і на іх лёс.

Кепскай прыкметай лічылася нараджэнне дзіця ў тыя дні, калі у вёсцы, і асабліва ў роднай хаце быў нябожчык. Лічылася, што ў такім выпадку “дзіця доўга не пражыве, ці на ўсё жыццё застанецца “нідалугім”” [*72*, с. 10]. Калі пахавальная працэсія рухалася па вёсцы, патрабавалася абавязкова разбудзіць малое дзіця, каб яно доўга жыло, бо “да соннага дзіцяці лягчэй за ўсё падступае смерць” [*95*, с. 385; 72, с. 290].

У Шаркоўшчынскім раёне дзіця павінна было несці крыж перад пахавальнай працэсіяй [95, с. 384], але гэта, як можна меркаваць, вельмі рэдкая і параўнальна позняя з’ява У большасці выпадкаў крыж на пахаванні нёс мужчына [95, с. 385].

Асобная група вераванняў і уяўленняў была звязана са смерцю дзяцей. Так, лічылася, што памерлае немаўля “прылічваецца да ліку анёлаў і выконвае анёльскія абавязкі: служыць Богу на небе, спускаецца на зямю і інш., але ўсё гэта робіць моўчкі, быццам нямое. Такі анёл не можа прасіць перад Богам за сваіх жывых родзічаў. ... такія “анёлкі” зноў увасабляюцца ў наступных дзяцей сваіх бацькоў.... Бяздзетнасць бацькоў пасля памерлага дзіцяці служыць указаннем, што такі

[56] Запісала Мішына В.І. ад Літвін М.П., 1931 г.нар., в. Губіна, Лепельскі р-н. Віцебскай вобласці.



Polotsksu

"анёлык" ці вельмі спадабаўся Богу, ці ж "зацёрся" ў мностве яму падобных, а таму не вярнуўся ў новым увасабленні" [92, с. 46]. Што тычыцца дзяцей, памерлых ва ўзросце 6-8 год, то, па народнаму меркаванню, яны "робяцца святымі, але да анёльскага ліку не далучаюцца" [ 92,с. 47].

На Віцебшчыне існаваў звычай памінаць памерлых дзяцей у чацвер велікоднага тыдня, які называецца "Наўскім скрысеннем". У гэты дзень варылі яйкі па колькасці памерлых у сям'і дзяцей, але іх не фарбавалі, і з'ядалі "на адкрытым месцы, пакатаўшы папярэдне па траве, каб нявінныя дзеці з вышыні неба бачылі і благаслаўлялі сям'ю, што памятае пра іх" [92, с. 244].

Даволі шырокае распаўсюджанне мела перакананне, што бацькам памерлага дзіцяці нельга есць яблыкі да Спаса [92, с. 253]. Відаць, падобнымі меркаваннямі можна растлумачыць і звычай, які бытаваў у Докшыцкім раёне: "Калі памерла дзіця, то жанчына, збіраючы ягады, тры першыя з іх павінна кінуць на зямлю" [31, с. 160].

У народзе верылі, што душа дзіцяці, што памерла неахрышчаным, не пакідае зямлю на працягу сямі гадоў. У апошнюю ноч перад адыходам на неба такая душа будзе асабліва гучна прасіць сабе імя, і чалавек, які пачуе яе плач і дасць імя, адгадаўшы пры гэтым пол дзіцяці, "на ўсё жыццё будзе шчаслівы" [92, с. 17 – 18].

### 2.4.3 Дзеці ў прыкметах і павер'ях

#### 2.4.3.1 Прыкметы, павер'і і рытуальныя дзеянні, звязаныя з ростам і развіццём дзіцяці

Прыкметамі, павер'ямі і разнастайнымі магічна-рытуальнымі дзеяннямі быў насычаны не толькі цыкл радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Імі суправаджаўся увесь далейшы працэс росту і развіцця дзіцяці, падчас якога працягвалася фарміраванне яго якасцей, як паўнавартаснага чалавека.

Шмат такіх прыкмет был звязана з кармленнем грудзьмі, і, у прыватнасці, з неабходнасцю карміць грудзьмі іншае дзіця або нават з простым знаходжаннем у хаце іншага дзіцяці. Паводле народнага перакanання, такія выпадкі маглі паўплываць на колькасць мацярынскага малака, а таксама на сон дзіцяці. У сувязі з гэтым маці павінна была "мысленна перабраць сродкі пакарання, пакуль корміць часовага выхаванца, а потым даць яму тры шлёпкі" [92, с. 25-26]. Калі ж другое дзіця прыносілі ў хату, то сваё дзіця патрабавалася абавязкова разбудзіць, інакш яно будзе кепска спаць [92, с. 26]. На тэрыторыі Падзвіння пашыраным з'яўляецца павер'е, згодна якому дзіця, якога двойчы адымалі ад грудзей, абавязкова будзе мець кепскае вока, будзе прыносіць "дужа ўрэду не толькі маладому "статку і пастві", але навата і чалавеку" [92, с. 26]; "Вот гаворуць, еслі атнімеш ужо рабёнка, прышла пара атнімаць... а ёсць такія, што пажалеіць, даць пассаць (пасля таго, як адняла). Вот такія людзі, гаворуць, дужа ўрочныя". [57]

---

[57] Запісала Мішына В. І. ад Ліпскай М. Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міерскі р-н Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

Паводле народных уяўленняў, маленькія дзеці, хоць і пахрышчаныя, былі вельмі падвержаныя “сурокам”, у сувязі з чым існаваў цэлы комплекс магічных дзеянняў, накіраваных як на прафілактычныя мэты, так і пераадоленне наступстваў сурокаў. Моцнымі сродкамі ад урокаў лічыліся абціранне падалом, нашэнне шпількі ў дзіцячым адзенні [77, с. 104]. Гэтыя прыёмы, дарэчы, у якасці засцерагальных, працягваюць шырока ўжывацца ў нашы дні: “Малышам своим я пристегивала маленькую булавочку на одежонку”.[58] Падчас купання дзіцяці пад ванначку з той жа мэтай падкладвалі нож [77, с. 273], а таксама на нож сядала маці падчас кармлення: “Пад ж... нож паложыць. Сядзіць і сосіць рабёнка”.[59] Існавалі і спецыяльныя замовы ад сурокаў (зглазу) [76, с. 88 – 92], прычым такія замовы ведала практычна кожная маці або бабуля: “загаварывалі... спецыяльна ні хадзілі там ні да якіх бабак, нічога. .. Самі. Вот свякроўка старая там... Ну, ў асноўным гэта ж свякроўка, таму што ж свякроўкі рабят гадавалі. Самі загаварывалі”. [60]

На Падзвінні было распаўсюджана павер’е аб так званых “крактунах”, калі дзіцёнак неспакойна спаў, плакаў ад таго, што ў яго “на спіне вырастаюць валасы і ён іх чэша, круціцца” [76, с. 151]. Паводле народных меркаванняў, такое магло здарыцца, калі маці падчас цяжарнасці штурхала нагой ката ці сабаку. Папулярным сродкам пазбаўлення ад крактуноў з’яўляўся попел: “Трымя пальцамі попелу з печы. Вот як пакупаеш гэтага рабёнка, а тады бярэш накрыж, так як крысцісся, так і бярэш гэтый ужо попел трымя пальцамі, і па плічах, па плічах гэтаму дзяцёнку. І вот я сама... тады... працаджу. І праўда, поўсць нейкая!”. Таксама ад “крактуноў” пазбаўляліся, качаючы па спіне хлебны шарык, які потым знішчалі: “Нада гарачы хлеб браць, пагрэць хлеб у печкі, пакачаць там па валосіках, вот так вот разарваць хлеб і паглядзець: там валосікі такія ёсць. Так хлеб пакачаеш па рабёнку – ён ня будзе крыхтаць... і сабаку нада аддаць, каб сабака з’еў” [77, с. 153].

Існавала таксама вялікая колькасць сродкаў пазбаўлення ад “упуду”. У прыватнасці, калі дзіця спужаецца сабакі, “сабаку таму улієш у міску вады, укінеш хлеба. І вот цераз тры парогі сабака той хлеб... Цяпер жа сабака ня есць, а тады ж ён цюп! цюп! цюп! чэраз тры парогі, да. Вось, гэта ўжо дасі папіць, памыць”.[61] Таксама, “як спужаюць рабёнка... цераз хамут, што каня запрагаюць, тры разы прасадзюць”; перацягваюць праз “пярэчкі стала” [77, с. 75-76]. Ад упуду і сурокаў таксама дзяцей абкурвалі зёлкамі – “упуднікам” (“пудавіком”), півоняй, а таксама сабачай шэрсцю [77, с. 13, с.19, с. 87], паілі або пырскалі вадой, пралітай праз клямку ці прабой [77, с.43, с.75]. Ад “упуду” таксама шырока выкарыстоўваліся замовы [77, с. 93 - 98]

---

[58] Запісала Мішына В.І. ад Гарлачовай І.М., 1986 г. нар., г. Полацк Віцебскай вобласці.
[59] Запісалі Мішына В. І. ад Ханяк А.І., 1932 г.нар., в. Макараўшчына, Лепельскі р-н Віцебскай вобласці.
[60] Запісала Мішына В. І. ад Ліпскай М. Э., 1944 г. нар., в. Волкаўшчына, Міерскі р-н
[61] Запісала Мішына В. І. ад Дранковіч Д.В., 1928 г.н., в. Хмялёўшчына, Докшыцкі р-н.



Polotsk SU

Пэўнымі магічнымі дзеяннямі было абстаўлена з’яўленне ў дзіцяці першых зубоў: “Калі ў дзіцяці势 стануць бачныя першыя прыкметы паяўлення зубоў, то трэба даць яму грызці воўчы зуб: яны хутка прарэжуцца і будуць моцныя, як воўчыя” [72, с. 27]. Традыцыя рэкамендавала увогуле “не дзівувацца, а наадварот..., не заўважаць першых дзіцячых “зубароў”, таму што іх можна “зглазіць” зусім нявінна” [72, с. 27]. Зафіксаваны таксама і пэўныя рытуалізаваныя дзеянні, звязаныя з выпадзеннем першага малочнага зуба. Гэты зуб трэба было кінуць на печ ці пад печ, прамаўляючы пры гэтым: “Мышка-шурышка! На табе зуб кысцянэй, а ты дай зілезный” [72, с. 32]. Гэтае прыслоўе вядома і ў наш час.

Цэлы шэраг вераванняў і магічных прыёмаў быў звязаны з першымі крокамі дзіцяці. У прыватнасці, на тэрыторыі Падзвіння распаўсюджаным было перакананне, што, калі дзіця пачынае хадзіць, неабходна “перарэзаць путы”, якім звязаны яго ножкі [72, с. 29; 95, с. 95]. Калі ж дзіця доўга не хадзіла, то з дапамогай разнастайных магічных дзеянняў імкнуліся стымуляваць пачатак хаджэння. Напрыклад, абсявалі каноплямі, пасадзіўшы на ніве, вадзілі па прынесеных з перасохлага ручая каменьчыках, каталі перад ім курынае яйка [95, с. 29].

Паводле народнага меркавання, да году дзіця стрыгчы было нельга, каб “галава не балела” [95, с. 93]. Лічылася такскама, што пастрыжанае да году дзіця “будзе жыць у вялікай беднасці, у яго будзе кароткая памяць” [31, с. 169] . Першае падстрыганне валасоў, якое мела назву “пастрыжыны” і здзяйснялася бацькам, маці, або бабкай-павітухай [51,с. 90].

Пэўныя народныя вераванні былі звязаны і з пачаткам маўлення. У прыватнасці, “пакуль дзіця не кажа ніводнага слова, яму нельга даваць не толькі рыбы, але і “юшкі”, бо дзіця будзе доўга “нема, як рыбіна” [92, с. 30]. Па тым, якое слова дзіця пачне казаць раней (“тата” ці “мама”) меркавалі, якога полу дзіця народзіцца ў сям’і наступным [72, с. 30].

У 6-8 год дзяцей упершыню апраналі ў адзенне адпаведна полу. Гэта таксама абстаўлялася некаторымі рытуальнымі дзеяннямі. Апрананне адбывалася на “старызне”: хлопчыку падсцілалі бацькоўскія штаны, а дзяўчынцы – кашулю маці. Пры гэтым лічылася, што, чым больш упартасці праявяць дзеці у час першага апранання, тым больш працяглым будзе іх жыццё [72, с. 47]

### 2.4.3.2 Пабытовыя прыкметы і павер’і, звязаныя з дзецьмі

Акрамя вялікай колькасці прыкмет і павер’яў, што тычыліся нараджэння і росту дзіцяці, існавалі і такія, якія былі звязаны з паводзінамі, заняткамі дзяцей і дазвалялі меркаваць аб нейкіх будучых падзеях у гаспадарцы, сям’і ці вясковай грамадзе. Паводле заўвагі М.Я. Нікіфароўскага, гэтыя прыкметы і павер’і грунтуюцца на перакананні, што “дзеці – “Божыі анёлы” – з’яўляюцца веснікамі Божай волі адносна дарослых, якія за свае грахі не заслугоўваюць непасрэднага адкрыцця” [*72*, с. 30]. Таму, напрыклад, калі вясной дзеці “робюць ямкі і палюць тут

цяпло", летам трэба было чакаць пажараў; калі робяць з гліны "хлябы, лыпуны, варуць стравы", то лета будзе ўрадлівым; калі вечарам доўга гуляюць на двары, то на наступны дзень сапсуецца надвор'е [72, с. 30 – 31]. Гульні дзяцей у "пахаванне", а таксама "у шлюб і кінягіню" прадказвалі смерць і хваробы ў вёсцы і "галоўным чынам у сем'ях гуляючых" [72, с. 31].

Разам з тым, некаторыя дзеянні дзяцей маглі мець і шкодныя наступствы, у сувязі з чым дарослыя стараліся іх папярэдзіць. Напрыклад, з пачаткам сяўбы сачылі, каб дзеці не перабягалі дарогу сейбітам, інакш жыта "не пойдзе вышэй дзіцячага росту", не пакідалі на дарозе вянкі з кветак, бо калі ў вянок наступіць жывёла, "то яна стане кульгаць" [72, с. 33].

Дзецям прыпісвалі магічныя ўласцівасці, напрыклад, іх дзеянні маглі ўплываць на надвор'е (так у некаторых месцах Падзвіння лічылася, што *абліванне вадой дзяцей ля калодзежа можа выклікаць дождж* ). Вось як успаінае закліканне дажджа адна з рэспандэнтак з Чашніцкага раёна: "*Ва ўрэмя засухі дзеці дарогу аралі, упрагаліся у плуг і аралі спецыяльна. Гэта я добра помню. І мак у калодзеж сыпалі, каб дождж пайшоў. І к вечару, помню, дождж і праўда збіраўся…*".[62] Гульні дзяцей маглі быць прарочымі: "*калі дзеці робяць з гразі і гліны "хлябцы", "лыпуны" (праснакі) або вараць стравы, то наступнае лета будзе ўраджайнае*" [51, с. 167]. Лічылася, што першы і апошні ў сям'і з дзяцей можа вылечыць ад "суроцев" для гэтага ён павінен вцерці хворага соллю і сказаць: "Соль табе ў вочы, галаўню ў зубы, палена ў калена, што б я не балела" [86, с. 285].

Значная частка вераванняў звязана з рэлігійнымі святамі. Так, напрыклад, у пач. XX ст. многія бацькі з мяшчанскага асяроддзя імкнуліся аддаць дзяцей вучыцца першага снежня – на святога Навума, кажучы: "*Прарок Навум наставит на ум.*" З гэтым лічыліся і многія сельскія школы [86 , с. 280].

Па сведчанні Я.Р. Раманава ў Віцебскай губерні існавала вера ў тое, што русалкамі становяцца не толькі душы дзяўчат-тапельніц, але і душы немаўлят, якія памерлі да хрышчэння, выкідышаў, незаконнанароджаных і тых дзяцей, якіх маткі кармілі грудзямі ў начы і "*прыспалі*" (задушылі вагой уласнага цела) [86, с. 204].

Дзеці-пастушкі верылі, што калі воран крычыць над статкам, то воўк абавязкова з'есць каго-небудзь з гэтага статка. Таму, маленькія пастушкі каб прагнаць воана крычалі: "Крук, крук! Ні ляці цераз наш статак – будзіць на тваіх дзяцей упадак! Ляці цераз панаў двор, пан кабылу лупіць, табе кавалак адкалупіць!" [86, с. 300].

Народныя ўяўленні аб нетрывалым стане дзяцей у "гэтым" свеце, іх меншай абароненасцю перад хваробамі ў параўнанні з дарослымі падмацоўваліся высокай дзіцячай смяротнасцю, характэрнай для традыцыйнага грамадства. Таму ў некаторых населеных пунктах на тэрыторыі Падзвіння імкнуліся шляхам ахвяры

[62] Запісала Андрыеўская С.У. ад Канапелькінай Л.Е., 1931 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

богу вымаліць жыццё і здароўе для сваіх дзяцей. Вось, напрыклад, як выглядала “абыдзённая” ахвяра на Лепельшчыне: “*Што перад гэтай Троцай робюць бабы. Вот намётку, такую намётку цераз усю цэркву, нада выткаць яе за адзін дзень. І збіраюцца ўсе бабы, і што ў каго ёсць. У мяне вот гэткі клубочак, такая краска, а ў другой гэткі. Аснова. Усе складуць гэта і называецца губка. Зналі, сколькі цэркваў. Саснуюць, уцягваюць у бёрда і ткуць. Усе бабы збіраюцца. Гэта каб дзеці былі здаровыя. Гэта ахвяра завецца. Тады бацюшка прыязджаець абедню робіць. І нясуць бабы гэтыя і сцелюць раненька ў цэркві гэтую ахвяру. А так вот раненька хлеб пякуць. Эта ўсё ахвяруюцца, яйкі нясуць”* [77, с. 165].

Такім чынам, пабытовя прыкметы і павер’і адлюстроўвалі архаічныя ўяўленні насельніцтва Падзвіння аб магчымасці ўплываць праз правільныя магічныя дзеянні на будучыню, аб пераходнасці, нетрываласці стану дзіцяці “на гэтым свеце” і г.д.

PolotskSU

## 3 УМОВЫ ЖЫЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ І АСАБЛІВАСЦІ ПОБЫТУ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАДЗВІННЯ

### 3.1 Змена дэмаграфічнай сітуацыі з кан. ХІХ да пач. ХХІ ст.

У кан. ХІХ – пач. ХХ ст. як у горадзе, так і ў вёсцы, нараджальнасць была ў гэты час даволі высокай, але большасць дзяцей памірала ад эпідэмій, дзіцячых хвароб, нездавальняючых санітарна-гігіенічных умоў. Так, толькі да года памірала ў вёсцы палова дзяцей, у горадзе – кожнае трэцяе дзіця. Узнаўленню насельніцтва ў гэты перыяд спрыяла даволі вялікая колькасць жанчын, якія былі ў шлюбе да 20 год, што дазваляла ім выконваць практычна поўнасцю фізіялагічныя магчымасці нараджэння вялікай колькасці дзяцей. Так, па разліках Л.В. Ракавай, у канцы ХІХ – пач. ХХ ст. сярод вясковага насельніцтва ў шлюб да 20 гадоў уступала 37, 8% жанчын. Жанчыны за вялікі рэпрадукцыйны перыяд паспявалі нараджаць па 7 - 10 дзяцей, значная частка дзяцей памірала. Змены, якія адбываліся ў сям'і ў пачатку ХХ ст. звязаны з працэсам змянення яе форм і тыпаў у бок спрашчэння. Паступова ідзе далейшае драбленне сям'і пад уплывам адмены прыватнай уласнасці на зямлю, абвешчанай рэвалюцыяй 1917 г., і размеркавання яе па едаках. Гэта дазваляла кожнай маладой сям'і ажыццявіць сваю мару стаць эканамічна незалежнай ад бацькоў. Раней працэс дзялення сямей на вёсцы стрымліваўся ўладай бацькі і адбываўся, як правіла, пасля смерці галавы сям'і. Такую пазіцыю гаспадара падтрымлівалі і валасныя суды, і грамадская думка, якія выступалі супраць сямейных разладаў і апаведнага аслаблення абшчыннага пачатку. Не зацікаўлены былі ў раздзелах вялікіх сем'яў памешчыкі, якія гарантавана хацелі атрымоўваць плацяжы [84, с. 93].

Існаванне ў мінулым традыцыйнага тыпу дэмаграфічных паводзін з іх сістэмай жорсткіх, абавязковых норм, аднолькавых для большасці насельніцтва, было дастаткова эфектыўным для падтрымання неабходнага ўзроўню ўзнаўлення насельніцтва. Спрыялі гэтаму этнічныя традыцыі ранніх шлюбаў. У пачатку ХХ ст. нараджальнасць застаецца адносна вялікай. У 20-30 г. ХХ ст. неразздзеленыя сем'і, у якіх пражывалі 2-3 брацкія малыя сям'і былі справай звычайнай. Па традыцыі, у бацькоўскай сям'і застаецца жыць малошы сын, які ажаніўся. Лічылася, што ён павінен "даглядзець" старых бацькоў.

На эмаграфічныя працэсы ў гэты час аказвалі ўплыў адносна слабыя працэсы ўранізацыі, невялікая занятасць жанчын у грамадскай вытворчасці, этнічныя традыцыі. Натуральны прырост насельніцтва ў 1927 г. складаў 24,4 чалавекі на 1 тысячу жыхароў. Значна знізілася наражальнасць у часы Вялікай Айчыннай вайны. Гэта было выклікана дыспрапорцыяй палоў (частка мужчынскага насельніцтва загінула). Пасля вайны быў нядоўгі ўсплеск кампенсацыйнай нараджальнасці, які ў 50-я г. стабілізаваўся на больш нізкім узроўні, чым да вайны, а, пачынаючы з 60-х г. ХХ ст. нараджальнасць няўхільна зніжалася. За выключэннем пачатку і сярэдзіны

Polotsk SU

1980-х г., калі дзяржавай былі прыняты меры па падтрымцы маладой сям'і. Нараджальнасць трымалася на ўзроўні 17, 1 дзяцей на 1 тыс. чалавек (1986 г). За 49 пасляваенных гадоў (1950 – 1999 гг.) нараджальнасць знізілася у тры разы і склала 9,3 чалавека на 1 тысячу насельніцтва, што не забяспечвала нават простага ўзнаўлення насельніцтва [84, с. 94].

Нераздзельная вялікая сям'я сустракалася яшчэ ў 1-пал. ХХ ст. Так, адна з рэспандэнтак з в. Маскаляняты Гарадоцкага р-на Віцебскай вобласці (1908 г.н.) успаміналa, што ў мясцовага кучара сям'я складалася з 18 душ. У вёсцы сем'і з 5-6 дзецьмі былі з'явай звычайнай [84, с. 94].

Па матэрыялах перапісу 1926 г. на адну сельскую гаспадарку прыходзілася 5 чалавек, сярэдні склад гарадской сям'і – 3,4 чалавекі. Па-ранейшаму, дзяцей у сем'ях нараджалася шмат, але і шмат памірала. Па сведчанні рэспандэнтаў, у вёсках былі сем'і, дзе нараджалася 12 і больш дзяцей.

У 1927 г. каэфіцыент нараджальнасці сярод беларусаў складаў 42,3 %, у сярэднім па рэспубліцы – 38, 6%. З улікам паказчыкаў смяротнасці: у беларусаў на 1 тыс чал памірала 15,1, у сярэднім па рэспубліцы – 14,2 чалавека, натуральны прырост склаў адпаведна 27,2% і 24,4%. У гэты час на дэмаграфічныя працэсы аказвалі ўплыў адносна слабыя працэсы ўрбанізацыі, невялікая занятасць жанчын у грамаскай вытворчасці, этнічныя традыцыі. Нараджальнасць у гэты час не рэгулявалася і нараджалі па-ранейшаму, "колькі Бог дасць" [84, с. 95].

Далейшае зніжэнне нараджальнасці звязана з уцягваннем жанчын у прамысловую вытворчасць, занятасць у калгасах. З боку дзяржавы былі захады для ўмацавання сям'і: стварaліся бясплатныя медыцынскія ўстановы, у тым ліку, радзільныя дамы, дзіцячыя сады, яслі. У чэрвені 1936 г. заканадаўча забаронены аборты. Жанчынам, якія вымушаны былі пайсці на такі ўчынак, пагражала крымінальная адказнасць. Заканадаўчы акт скасаваны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у жніўні 1954 г. [66, с. 462].

Працэсы нараджальнасці і смяротнасці ў значнай ступені былі дэтэрмінаваны сацыяльна-эканамічнымі, прававымі, этна-культурнымі, біялагічнымі фактарамі. Істотны ўплыў на нараджальнасць аказала павышэнне агульнапрадукцыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва, занятасць жанчыны ў грамадскай вытворчасці, павелічэнне ўзросту ўступлення ў шлюб, развіццё сістэмы аховы здароўя, матэрыяльная заяспечанасць і ўстаноўкі на пажаданую колькасць дзяцей, этнічныя традыцыі.

У ХХ ст. даўняя традыцыя дзетнасці, калі дзіця разглядалася згодна з формулай: "Бог даў, Бог узяў," разбурана поўнасцю. У ХХI ст. жанчына, настроеная на адно дзіця [42, с. 96]. В 2009 г. узровень дзіцячай смяротнасці склаў 4,7 выпадкі на 1 тысячу народжаных, што параўнальна з сярэднееўрапейскім ўзроўнем. Пазітыўным зрухам лічыцца з'яўленне тэндэнцыі да роста нараджальнасці. Яе ўзровень у 2009 г. у параўнані з 2005 г. павысіўся на 23,7 %. Гэта дасягнута шляхам

паляпшэння медыцынскага абслугоўвання, прадстаўлення сацыяльных гарантый і льгот сем'ям, якія выхоўваюць трох і болей дзяцей. У Беларусі дзейнічае Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2007 – 2010 гг. Але, не гледзячы на прымаемыя дзяржавай меры па стымуляванні нараджальнасці, у пачатку XXI ст. большасць сямей маюць адно дзіця.

Згодна са статыстыкай, большасць сем'яў беларусаў у XX ст. – нуклеарныя. У 1989 г. па падліках даследчыкаў іх 73%. Сярэдні памер сям'і знізіўся з 3,7 чалавек у 1959 г. да 3,2 чалавека ў 1959 г. і да 3,2 чалавека – у 1989 г. Пры гэтым найбольш хутка зніжалася колькасць сельскай сям'і. У 1960 г. на 1 тыс. насельніцтва прыходзілася 24,5 нованароджанага, у 1970 г. – 16,24 у 1980 г. – 16 чалавек. Гэта былі, як правіла, першынцы, радзей – другія дзеці ў сям'і. Занятасць жанчын у працы адмоўна уплывала на нараджальнасць. 56% спецыялістаў, якія працуюць у народнай гаспадарцы – жанчыны (1989 г.). У 1993 г. каля 84% жанчын працавалі на вытворчасці. Прасочваецца адваротная прапарцыянальная залежнасць паміж адукацыяй, кваліфікацыяй жанчыны і колькасцю дзяцей у сям'і [84, с. 97].

Па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь за 2010 г. натуральны прырост насельніцтва мае адноўнае значэнне і складае (-29,2 тыс. чал.), гэта значыць, што смяротнасць пераўзыходзіць нараджальнасць.

У Рэспубліцы Беларусь (паводле дадзеных статэстычнага камітэта і вынікаў апошняга перапісу 2009 г.) колькасць насельніцтва на 1 лютага 2011 г. склала 9478,7 тыс. чал. і за студзень 2011 г. скарацілася на 2,4 тыс. чал. Скарачэнне колькасці насельніцтва абумоўлена пераўзыходжаннем колькасці памерлых над колькасцю народжаных на 3389 чалавек.

Колькасць народжаных за студзень 2011 г. па Рэспубліцы Беларусь склала 8386 чалавек (10,4 на 1000 чалавек), памерлых – 11775 (14,6 на 1000 чал.), у тым ліку памерлых дзяцей да 1 года – 30 (3,3 на 1000 народжаных). Такім чынам, натуральная убыль насельніцтва складае за студзень 3389 (4,2 чал. на тысячу). Каэфіцыент нараджальнасці па Віцебскай вобласці складае – 9,1. Нарадзілася ўсяго 943 дзіцяці. Дарэчы, з усіх вобласцей Беларусі на Віцебшчыне за студзень 2011 г. самы нізкі каэфіцыент нараджальнасці. Па велічыне каэфіцыента смяротнасці за студзень 2011 г. Віцебшчына займае 2-е месца пасля Мінскай вобласці (на Віцебшчыне – 16,9; на Міншчыне – 17).

За студзень 2011 г. у краіне нарадзілася ўсяго 8386 дзяцей, што на 95 дзяцей менш, чым за студзень 2010 г. [110].

Такім чынам, у 2-й пал. XX ст. назіраюцца тэндэнцыі да скарачэння колькасці дзяцей ў сям'і, што звязана з шэрагам аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. Уплыў на скарачэнне нараджальнасці аказала развіццё медыцыны, занятасць жанчын на адным узроўні з мужчынамі ў працы на вытворчасці, разбурэнне традыцыйных установак на шматдзетнасць.



PolotskSU

### 3.2 Санітарна-гігіенічныя і бытавыя ўмовы жыцця, харчаванне дзяцей

Умовы жыцця дзяцей і асаблівасці іх побыту на тэрыторыі Падзвіння на працягу кан. XIX – пач. XXI ст. моцна змяніліся. Уяўленне аб тым, якім павінен быць побыт дзіцяці змянілася напрацягу апошніх двух стагоддзяў. Прычынай гэтага з'яўляецца не толькі паляпшэнне умоў жыцця людзей, але і змена адносінаў да дзіцяці. Калі ў традыцыйным грамастве сацыяльная вартасць дзяцей была нізкай, то для сучаснага грамадства характэрна усведамленне вартасці дзіцяці, каштоўнасці яго як асобы. Таму ў побыце дзяцей адбыліся якасныя змены, ён значна палепшыўся. Разам з тым, этнографамі фіксуецца шэраг трывалых традыцыйных прыёмаў догляду за дзецьмі, якія існуюць і ў сучасных сем'ях.

Найбольш буйная група захаваўшыхся традыцыйных уяўленняў – медыцынскія і гігіенічныя прыёмы. Іх перавага абумоўлена тым, што найважнейшай задачай бацькоў пасля нараджэння дзіцяці з'яўляецца захаванне яго жыцця і здароўя. У XIX – пач. XX стст. смерць дзіцяці не была рэдкай з'явай, што кампенсавалася высокай нараджальнасцю. Таму, першачарговай задачай для бацькоў было хутчэйшае ўключэнне дзіцёнка ў "свет людзей," (пасля чаго смерць не ўспрымалася як нешта страшнае), на што і накіраваны былі традыцыйныя магічныя прыёмы, хрышчэнне і г.д. У сучаснасці ў сувязі з тым, што смерць дзіцяці з'уляецца надзвычайнай з'явай, гэтая задача адыйшла і першачарговае месца заняла задача засцеражэння ад траўматызма і хваробаў, што адлюстравалася ў шырокім захаванні прыёмаў лекавання. Галоўным прынцыпам з'яўляецца выкарыстанне даступных сродкаў: мацярынскага малака, зёлак, некаторых прадуктаў.

Напрыклад, такі прыём, як закапванне ў нос немаўляці мацярынскага малака, традыцыйны і шырока распаўсджаны гігіенічны прыём. Парады рабіць так даюць, у тым ліку. і медыкі, негледзячы на тое, што салодкае малако заліпае і стварае перашкоды для дыхання немаўляці. Дарэчы, афіцыйная медыцына прапануе такі сродак, як "вазелінавы алей." Маткі і зараз аддаць перавагу традыцыйнаму сродку. Яшчэ адін цікавы гігіенічны прыём паведаміла інфарматарка. У немаўлят часта бываюць на скуры так званыя *"апрэласці"*, каб пазбегнуць іх распасюджана была такая працэдура: жанчына скрэбла ножам ільняны саматканы рушнік, так каб утваралася ільняная *"трасца"* (дробныя часцінкі ільну) гэтымі саскрэбкамі і пасыпалі скуру дзіцяці ў балючых месцах. Ільняныя саскрэбкі аказвалі цудоўнае дзеянне – вельмі хутка скура станавілася здаровай.

Першы перыяд жыццяці дзіцяці – 28 (30) дзён, калі паводле медыцынскай тэрміналогіі ён лічыцца securityнованароджаным, супадае з традыцыйным перыядам да хрышчэння. Дзіця, звычайна, нікому не паказвалі, бо лічылі, што яму лягчэй у гэты перыяд жыцця пашкодзіць. У сучаснасці, старэйшыя сваякі не рэкамендуюць маладой маці выносіць дзіця на двор. Тлумачыцца гэта проста: "каб не захварэў." Непажаданым з'яўляецца ў гэты перыяд з'яўленне ў хаце чужых людзей, бо дзіця

могуць *“сурочыць.”*[63] Выключэнне ў некаторых выпадках робіцца толькі для *“адведак,”* ды і то іх, часам, пераносяць на пазнейшы перыяд. Калі ж ў хату прыйшоў хтосьці чужы, у якасці перасцярогі, пасля яго зыходу, традыцыйна рэкамендуецца маці сцерці дзіця *“па руху сонца тры разы падалом сваёй ісподняй рубашкай.”*[64] На Падзвінні верылі ў залежнасць развіцця дзіцяці ад уплыву іншых людзей. Так, калі нараджалася дзіця, імкнуліся як мага хутчэй паведаміць найбольшай колькасці людзей аб гэтай падзеі. Лічылася, чым хутчэй усе даведаюцца, тым хутчэй дзіця пачне гаварыць. Дарэчы, шкодны ці станоўчы уплыў на дзіця можна аказваць па меркаванню беларусаў яшчэ на стадыі прэнатальнага развіцця. Так, адна з інфарматарак паведамляла, што калі яна была цяжарная (70 - я г. 20 ст.), папрасіла ў адной бабкі агуркоў, тая не дала (а адмаўляць цяжарнай жанчыне нельга, бо *“ўсё паядуць мышы”*)[65] і, каб гэтага не здарылася, злосная бабка выкарыстала магічны прыём *“адсыпання ад цяжарнай пяском,”*[66] які пашкодзіў дзіцяці і тое, калі падрасло і яго сталі выводзіць на вуліцу, *“жменямі ела пясок.”* Даследчыкі XIX ст. паведамляюць аб тым, што дзіця імкнуліся першы раз загарнуць у бацькоўскую адзежу, “каб паважала бацькоў.” Сустракаюцца паведамленні, што калі дзіця апрануць у новае, то яно будзе хутка зношваць адзенне [86, с. 489]. Аўтар у XX ст. сустракаў на Падзвінні іншае ўяўленне. Дзіця адразу пасля нараджэння імкнуліся загарнуць у нешта новае (калі не было новых пялюшак, проста ў кавалак новай тканіны). Рабілася гэта з “эканамічнай” мэтай, каб *“рабёнак не рваў адзежу, бо ёсць такія дзеці, на якіх усё гарыць.”* [67]

Штодённая працэдура купання дзіцяці да 6 месяцаў стала звычайнай толькі ў XX ст. Раней нованароджанага так часта не мылі. У 50-80 гг. XX ст. абавязковым купаць дзіця штодзённа лічылася нормай да двух тыдняў, пасля гэтага купалі радзей (па звестках інфарматараў – раз у 3-7 дзён). Цікава, як старэйшыя жанчыны абгрунтоўвалі неабходнасць купання дзяцей. Казалі, што *“пасля купання дзіця добра спіць і матка можа рабіць работу, ”* што *“дзеці, якіх купалі раслі разумнейшыя і здаравейшыя.”*[68] Прыёмы купання носяць адбітак традыцыйных уяўленняў. Так, паводле меркавання старэйшых людзей, першы раз дзіцёнка не павінны купаць бацькі. Гэтую місію давяраюць бабулям. У XIX ст. першае купанне ажыццяўляла бабка-павітуха.

У XIX ст. першае купанне дзіцяці звязвалі з абрадам “муравінкі,” “змыванне мура,” “зліўкі,” “жмурынкі” [86, с. 387] Абрад завяршаў хрэсьбіны і быў абавязковым, бо патрабаваў змыць з немаўляці рэшткі святога міру, якім мазалі дзіця ў царкве. Сутнасць абрада заключалася ў тым, што дзіцяці змывалі вадой твар

[63] Запісала Андрыеўская С.У. ад Арловай Е.М., 1932 г.н., в. Рудня Расонскага раёна Віцебскай вобласці.
[64] Запісала Андрыеўская С.У. ад Царавай В.Я., 1931 г.н., г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.
[65] Запісала Андрыеўская С.У. ад Якубовіч Р.А., 1939 г.н., в. Арэхаўна Ушацкі раён Віцебскай вобласці.
[66] Запісала Андрыеўская С.У. ад Сенкевіч М.Ф., 1935 г.н. в. Семенец Полацкі раён Віцебскай вобласці.
[67] Запісала Андрыеўская С.У. ад Сенкевіч М.Ф., 1935 г.н., в. Семенец Полацкі раён Віцебскай вобласці.
[68] Запісала Андрыеўская С.У. ад Свірскай Ю.Б., 1934 г.н., в. Горкі Міёрскі раён Віцебскай вобласці.



PolotskSU

і ручкі (у некаторых месцах купалі), пасля чаго, у ваду мачылі рукі і мазалі ёй вочы ўсе прысутныя, мяркуючы, што міра аказвае лекавае ўздзеянне [86, с. 387]. Е.Р. Раманаў паведамляе, што пры першым купанні дзіцяці ў ваду клалі срэбныя грошы, каб дзіця было "багатым і чыстым, як срэбра." Бабка-павітуха мыла дзіця вадой, куды сыпаўся авёс, каб дзіця не было плаксівым, а было шчаслівым [86, с. 329]. Звычай трансфармаваўся і зараз купаць дзіця на тэрыторыі Падзвіння рэкамендуецца роднай бабцы. Тлумачэнне, якое даюць рэспандэнты ўтрымлівае і рацыянальную і ірацыянальную кампаненту. Лічыцца, што бабулі, па-першае, "ужо ўмеюць і пакажуць маладым, як рабіць," па-другое, "старыя ўжо выгадавалі сваіх дзяцей, значыць у іх "лёгкая рука".[69] Цікава, што прыём першага купання бабулямі рэкамендуецца не толькі для першынца, але і для ўсіх наступных дзяцей. Падаецца, што гэта звязана з верай ва ўплыў першых актаў, якія ажыццяўляюцца над дзіцём на далейшы яго лёс. Пры купанні звычайна рэкамендуецца дадаваць у ваду зёлкі. Звычайна гэта чарада, рамонак, мята, валер'яна. Пералічаныя расліны аказваюць заспакойваючае і антысептычнае дзеянне. Калі на скуры з'яўляліся нейкія пашкоджанні ці высыпанні, народная медыцына Падзвіння рэкамендуе ўжываць чараду, якая расце ля бягучай вады, маўляў, *"з вадой сплывуць і болькі".*[70] Медыкі першыя тыдні жыцця дзіцёнка рэкамендуюць купаць яго ў ахалоджанай кіпеўшай вадзе. Народная традыцыя гэта рабіць не рэкамендуе. "*Нельга дзіця купаць у кіпені, а то будзе утрапёны"*[71] (гэта значыць дзіцё будзе неспакойным, мітуслівым чалавекам, што ў беларусаў з разважлівым і памяркоўным нацыянальным характарам лічылася ўяўным недахопам).

Стрыжка валасоў таксама важная гігіенічная і магічная працэдура. Паводле звестак 19 ст., яе рэкамендуецца не рабіць да года, у некаторых мясцовасцях да трох гадоў. На тэрыторыі Падзвіння такі звычай захаваўся да сучаснасці. Да года (у некаторых выпадках – трох гадоў) не стрыгуць валасы. Пажадана, каб першую стрыжку ажыццяўляў чалавек "з лёгкай рукой." Стрыжку валасой народная традыцыя рэкамендуе ажыццяўляць на маладзік, бо ён будзе расці і добра будуць расці валасы. Стрыжка пазногцяў немаўляці так строга не рэкамендуецца, аднак ёсць асаблівасць: некаторыя бабулі рэкамендуюць у вёсцы мамкам пазногчы дзіцёнку не стрыгчы, а адкусваць зубамі і закопваць у зямлю. Не ў якім разе не паліць, бо "*рабёнку будзе пячы і ён будзе трывожна спаць*." [72]

Закранем таксама такую далікатную праблему, як кармленне дзіцёнка. Карміць дзіця, паводле крыніц 19 ст. да 1,5 – 2 гадоў лічылася нормай. У савецкія часы, калі жанчына павінна бала найхутчэй вярнуцца да працы на карысць сацыяльстычнай дзяржавы, медыцына з поспехам даказвала шкоднасць груднога

---

[69] Запісала Андрыеўская С.У. ад Мамажэнка Г.Р., 1931 г.н., в. Ізгародзішча Чашніцкі раён Віцебскай вобласці.
[70] Запісала Андрыеўская С.У. ад Мамажэнка Г.Р., 1931 г.н. там жа.
[71] Запісала Андрыеўская С.У. ад Свірскай Ю.Б., 1934 г.н., в. Горкі Міёрскі раён Віцебскай вобласці.
[72] Запісала Андрыеўская С.У. ад Усовіч А.Ф., 1936 г.н., в. Горкі Міёрскі раён Віцебскай вобласці.



Polotsk SU

кармлення больш 9 месяцаў. Існаваў нават міф аб развіцці нейкіх невядомых паталогій. Ці варта казаць, што не ўсе жанчыны прытрымліваліся такіх "навуковых" рэкамендацый. Іншыя справы, што эканамічныя ўмовы прымушалі мацярок рана заканчваць кармленне. Сучасная медыцына даказала карыснасць груднога кармлення. Сусветная Арганізацыя Аховы здароў'я пры ААН рэкамендуе карміць дзіця да 2-3 гадоў [1, с. 10 – 12]. Народная традыцыя беларусаў Падзвіння цалкам пагаджаецца з найноўшымі дасягненнямі і рэкамендуе "*карміць рабёнка грудзямі, каб быў разумнейшы і здаравейшы."*[73]

Вядомы народнай медыцыне і сродкі павялічэння лактацыі ў жанчын. Каб было ў маткі малако традыцыйна рэкамендуецца: карміць дзіця "каб нихто не бачыў, бо сурочаць і малако прападзе," трэба таксама церці грудзі мужчынскай шапкай. Дарэчы, такі ж сродак рэкамендуецца і дзяўчатам-падлеткам, каб "цыцкі раслі." Для павялічэння лактацыі рэкамендуецца маці піць адвар цьміну, часцей даваць дзіцёнку ссаць грудзі. Сучасная медыцына ўзяла гэтыя народныя сродкі на ўзбраенне [1, с. 11].

У канцы XIX – пачатку XX ст. адным са сродкаў вяртання лактацыі ў мацярок былі крошкі хлеба з торбы жабрака ("старца"). Вось як апісвае лячэнне Н.Я. Нікіфароўскі: "Потерявшие молоко кормилицы спешат к суме «старцев» чтобы самолично выгрести из неё христарадные крошки, сто старец охотно и приветливо разрешает сделать" [71, с. 15].

Калі ў маці раптам прападае малако, то традыцыйна гэта звязваецца на Падзвінні з "*сурокам.*" У такім выпадку рэкамендуецца рабіць для кормячай мамкі ваду "*ад дрэннага вока*" з надзеяй на вяртанне лактацыі. Цалкам ірацыянальным з'яўляецца ўяўленне сярод вяскоўцаў на Падзвінні ўяўленне аб тым, што жанчына з малымі грудзямі будзе мець мала малака, а з вялікімі – шмат. Тут заўважна моцная аналогія з жывёльным светам, які вяскоўцы назіраюць напрацягу ўсяго жыцця. Адсюль у некаторых выказваннях аб матках перыяду кармлення дзіцяці паралелі з "кароўкай." Напрыклад, запрашэнне нарадзіўшай жанчыны да стала: "трэба ж і нашу кароўку карміць..." Дарэчы, пры выбары будучай жонкі вяскоўцы ўлічвалі не толькі матэрыяльны дастатак бацькоў нявесты, але і яе здароў'е. Імкнуліся ўзяць дзяўчыну "каб была кроў з малаком," забяспечыць такім чынам сабе ў гаспадарку добрую работніцу і здаровую маці для будучага патомства. У адносінах да дзяцей лічылася таксама, чым больш поўны дзіцёнак, тым ён здаравейшы. І сучасным маці (а асабліва бабулі) імкнуцца дасягнуць гэтага "ідэалу," што спараджае, пры наяўнасці штучнага кармлення дзяцей ранняга ўзросту, праблемы з залішняй вагой. Сучасная медыцына актыўна кантралюе гэтую праблему [1, с. 20].

Бытавыя ўмовы ўтрымання дзяцей залежаць ад магчымасцяў сучаных сямей. Аднак, і тут можна знайсці элементы, якія замацаваны традыцыяй. Так, у XX ст. наяўнасць асобнай калыскі (ложка) для дзіцёнка лічылася абавязковай. Сярод

[73] Запісала Андрыеўская С.У. ад Царавай В.Я., 1931 г.н., г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.

этнаграфічных звестак сустракаюцца паведамленні аб тым, што жанчыны часам маглі *“прыспаць”* (задушыць) дзіця вагой свайго цела, калі спалі разам з ім. Безумоўна, гэта вялікае гора для маці. Нажаль, сярод паведамленняў інфарматараў сустракаюцца звесткі аб тым, што і ў XX ст. з дзецьмі здараліся няшчасныя выпадкі з-за недагляду. Дзіўнай сёння можа падацца традыцыя *“навязваць”* дзяцей, якія яшчэ не навучыліся хадзіць у вёсцы. У калекцыі аўтара такіх паведамленняў некалькі. Такі звычай існаваў яшчэ ў 80 г. XX ст. сярод вясковых жанчын. Каб мець магчымасць выконваць працу ў хаце, ці на агародзе, жанчына прывязвала за ножку малое дзіця лентай да якога-небудзь буйнога прадмета мэблі (шафы, стала, ложка). Дзіця поўзала, гуляла, *“тузалася,”* але развязаць вузел не магло. Маці ў гэты час “*рабіла работы*.”[74] Без нагляду такое дзіця магло нанесці сабе шкоду.

### 3.3 Традыцыйныя метады і сродкі лячэння дзяцей

Значнае месца ў народнай медыцыне беларусаў Падзвіння належыць лячэнню дзяцей. Дзеці, з пункту гледжання народных уяўленняў, найбольш падвержаны хваробам, бо іх стан разглядаецца народнай традыцыяй як нетрывалы, пераходны, таму, адносна дзяцей варта выкарыстоўваць больш пільна магічныя сродкі засцеражэння ад хвароб і лекавыя сродкі. Невыпадкова, значнае месца сярод сродкаў народнай медыцыны займаюць сродкі лячэння дзіцячых хваробаў.

Найбольш вядомымі дзіцячымі хваробамі на Падзвінні з’яўляюцца “упуд” (“супуд,” “пуд”) і “урок” (“суроцы,” “сурок”). Амаль кожная рэспандэнтка прапанавала сціранне падалом сарочкі маці “пры суроку” і сплёўванне тры разы пры “упудзе” як універсальныя сродкі лекавання. Сярод іншых вядомых з “класічнай” этнаграфічнай літаратуры [57, с. 234], хваробаў намі зафіксавана інфармацыя пра “начніцы,” “крыксы,” “рожу” (некалькі відаў), “калтун,” “грыжу” (некалькі відаў), “лішай,” “наход”. Пы гэтым, заўважым, што сярод рэспандэнтаў не было такіх, якія б прызналіся што практыкуюць лячэнне замовамі. Большасць адзначалі, што выкарыстоўвалі народныя прыёмы лекавання ў адносінах сваіх уласных дзяцей. Звычайна, апісваліся дзеянні без вербальнага суправаджэння. Напрыклад: ад “*крыксаў*” маці трэба ўзяць малое дзіця ў свой падол і трэсці (“*палоць*”); ад “*начніц*”[75] – пакласці яго на падлогу і венікам каціць ад печы да парога (в. Нурава Верхнядзвінскі раён); ад “*упуду*” тры разы абнесці вакол хаты пацалаваць і сплюнуць, прагаварыўшы: “*Пуд, астанься тут!”*[76] (в. Ізгародзішча Чашніцкі раён); ад *“лішая”* пацерці па хворым месцы ў дзіцяці вільгаццю з ваконнага шкла і прагаварыць: “*Лішай, ідзі свінням мешай!*”[77](в. Горкі Мёрскі раён) і г.д. Веданне рэспандэнтам народных прыёмаў лекавання залежыць ад таго, ці былі ў яго жыцці

[74] Запісала Андрыеўская С.У. ад Міцкевіч К.Д., 1937 г.н., в. Горкі Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці.
[75] Запісала Андрыеўская С.У. ад Каевай Т.А., 1939 г.н, в. Нурава Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці.
[76] Запісала Андрыеўская С.У. ад Цвіль В.А., 1931 г.н., в. Ізгародзішча Чашніцкі раён Віцебскай вобласці.
[77] Запісала Андрыеўская С.У. ад Усовіч А.Ф., 1936 г.н., в. Горкі міёрскі раён Віцебскай вобласці.



PolotskSU

сітуацыі, калі яно было неабходна. Гэты пласт народнай культуры носіць латэнтны характар і актывізуецца толькі тады, калі з'яўляецца вострае запатрабаванне.

Цэнтральная роля ў знахарскіх практыках беларусаў Падзвіння належыць вадзе. Адносна дзяцей на Падвінні намі зафіксаваны багаты арсенал сродкаў з выкарыстаннем вады: купанне ў лекавых мэтах, сплёўванне, змыванне, выліванне і г.д. Выкарыстоўваючы вербальную магію, знахары замаўляюць вадзічку ("даюць вадзічку"), якая потым выкарыстоўваецца для абмывання хворага (частак яго цела), як лекавае піццё, а таксама "выліваюць" хваробу [76, с. 36].

Трэба адзначыць, што да знахараў звярталіся на Падзвінні ў крайніх выпадках у выпадку хваробаў дзяцей. Часцей маці імкнулася сама дапамагчы хвораму дзіцёнку. Народная традыцыя захавала да XX ст. цэлы арсенал сродкаў, якімі магла карыстацца маці ў хатніх умовах. Напрыклад, даць дзіцяці выпіць вады з самага дна калодзежа: "Много помогает от суроцев вода добытая именно со дна колодца…" [71, с. 36]. Увогуле, у літаратуры канца XIX ст. апісаны дзесяткі сродкаў лячэння "сурочаных" дзяцей на тэрыторыі Віцебскай губерні. Напрыклад, ад "начніц" (дзіця крычыць па начах) народная медыцына рэкамендуе прынесці і паставіць пад калыску дзіцяці ваду, ўзятую з трох месц і кінуць туды нож ці іголку. Калі немаўля хварэла "начніцамі," то на наступны дзень рэчы будуць пакрыты іржой, а дзіця будзе здаровым [71, с. 38]. У выпадку "наноса" ("находа"), які здарыўся ад таго, што ў адведкі пры нараджэнні дзіцяці прыйшла жанчына у час месячных (якая паводле народнай традыцыі лічылася "нячыстай"), то трэба купаць такое дзіця ў адвары шкарлупіння яек, з якога толькі вылупіліся птушкі [71, с. 41]. Да XX ст. захавалі далёка не ўсе магічныя прыёмы народнай медыцыны. Найбольш частымі ў XX ст. метадамі лекавання, язвязанымі з вадой з'яўляецца купанне. Паводле інфармацыі, сабранай у палявой этнаграфічнай экспедыцыі, да сучаснасці выкарыстоўваецца купанне як сродак пазбаўлення ад скураных хваробаў у дзяцей, змыванне "святой" (асвечанай у царкве вадой) ад "упуду," "суроку."[78]

Шматлікія тэрапеўтычныя і прафілактычныя сродкі лекавання дзіцячых хваробаў на Падзвінні звязаны з выкарыстаннем эманацыяў воднай стыхіі – сліны і мачы. Семантыка нечыстаты, сувязі з "нутраной "часткай цела чалавека абумовіла выкарыстанне сліны і мачы як прасцейшых сродкаў лекавання дзяцей [76, с. 37]. Найбольш дзейсным і часта распаўсюджаным сродкам лічыцца сплёўванне, напрыклад, калі дзіця спужаецца і зараз на тэрыторыі Дзісеншчыны яму раяць неадкладна сплюнуць тры разы і адразу ж памачыцца. Лічыцца, што "упуд" выйдзе разам з мачой і слінной. Калі дзіця само не магло выканаць маніпуляцыі, маці тройчы яго цалавала і сплёўвала. Нават калі малое ўпадзе, народная традыцыя раіла маці тройчы плюнуць на тое месца, каб засцерагчы яго ад нячысцікаў. Шырока распаўсюджаны звычай тройчы пляваць праз левае плячо, каб не сурочыць.

[78] Запісала Андрыеўская С.У. ад Царавай В.Я., 1931 г.н., г. Дзісна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.



Polotsksu

Нутраное паходжанне і непрыемны пах абумоўлівае эфектыўнасць як абярэгу сілы мачы. Напрыклад, у Полацкім павеце да “ксту” (хрышчэння) малое купалі ў ночвах, якія засцілаліся бруднымі пялюшкамі. Лічылася, што гэта засцерагае ад розных хваробаў і мацуе цельца дзіцяці [76, с. 25].

Значнае месца ў лекавай магіі Падзвіння належыць стыхіі агню. Напрыклад, агонь з’яўляецца важным чыннікам у рытуале “перапякання,” сімвалічнага “дароблівання” дзіцяці ў печы [76, с. 39]. Некаторыя з апытаных у экспедыцыі рэспандэнтаў узгадвалі, што ў выпадку асабліва цяжкай хваробы дзіцяці яшчэ ў першай палове XX ст. практыкавалася спальванне адзежы хворага. Лічылася, што разам з ёй згарае і хвароба. Моцнымі лекавымі сродкамі лічацца таксама прадукты спальвання – попел і вуглі. Нездарма, знахары Падзвіння, замаўляючы ваду, кідалі туды тры вугалькі (сімвалічнае сумяшчэнне стыхіі агню і вады). Многія з апытаных у палявой экспедыцыі інфарматараў раілі выкарыстоўваць попел для першага купання немаўлят як прафілактычны ці лекавы сродак. Вось, напрыклад, як апісвае працэс першага купання адна з рэспандэнтак з Чашніцкага раёна: “*Бабка прыходзіць. Ваду пагрэіць, пасыпіць папялку на начоўкі па краях. Тады рабёнка ў ваду апускаюць”*.[79] Асабліва лекавымі лічыліся прадукты гарэння (дым, попел, вуглі), атрыманыя у час гадавых святаў, напрыклад, на Каляды: “*у Каляды калі печку топіш, то гэтым попелам нада церці па спіне рабёнку, тады крактуны прападаюць*”.[80] Таксама лекавымі ўласцівасцямі, паводле народнага меркавання, валодаюць рэчы, звязаныя з агнём, напрыклад, качарга: “*нада рабёнку над качаргой, што агонь у печы мяшаюць, ліцо змываць ад зглазу памагаіць.*” [81]

На выкарыстанні магічнага дзеяння агню заснаваны і метад падкурвання. Звычайна яго выкарыстоўваюць пры лекаванні нервова-псіхічных захворванняў дзяцей (упуд, сурокі, начніцы, радзімец) [76, с. 40]. Лекавым лічыўся дым ад спальвання асвечаных у царкве зёлак: “*нада зёлкі, то на Яна асвечаны паліць і тым дымком рабёнка курыць ад упуду”, “А бываець, што ў дзяцей іспуг, то і сама можаш памагчы… Раней зажыгалі зёлкі асвячоныя на Дзевятнік*[82], ці ад спальвання валос, поўсці з чынніка хваробы: *“Еслі сабаку спужаецца, то нада курыць шэрсцю ад сабакі і даць рабёнку падыхаць тым дымком.”* [83]

Шырока выкарыстоўваўся ў лячэнні дзяцей на Падзвінні магічны рытуал прадзявання, працягвання. Як лічаць даследчыкі, гэты рытуал сімвалізаваў акт нараджэння (перараджэння). Рытуальна-магічныя маніпуляцыі з дзіркамі, паглыбленнямі, адтулінамі, развілкамі прынята называць “пранімальнай магіяй” [76, с. 42]. На Падзвінні лічылася, што памагае ад “суроцаў” калі маці, распранутая да сподняга, прадзявала дзіця паміж целам і кашуляй [76, с. 35]. На Падзвінні пры

---

[79] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шэмет Н. Ф., 1933 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці.
[80] Запісала Андрыеўская С.У. ад Іўкінай В.Ц., 1932 г.н, в. Ізгародзішча Чашніцкага раёна.
[81] Запісала Андрыеўская С.У. ад Федарэц Р.І., 1937 г.н., в. Зялькі Верхнядзвінскага раёна.
[82] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шынкевіч А.І., 1915 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна.
[83] Запісала Андрыеўская С.У. ад Ляшкевіч А.Ф., 1935 г.н., в. Горкі Міёрскага раёна.



Polotsk.su

лекаванні ад “сурокаў,” “находу,” “наносу” дзіця тры разы прапускалі праз хамут з кабылы, які потым надзявалі на яе [76, с. 36]. Пры лекаванні ад “упуду” (у некаторых варыянтах “уроку”) малое тройчы перадавалі пад сталом [Антонава Н.В., с. 25; Канапелькіна Л.Е., с. 65], пры цяжкай хваробе – перадавалі ў вакно [76, с. 43].

Увогуле, прапусканне праз любую адтуліну ў магічнай лекавай практыцы лічылася здольна аказваць лекавае ўздзеянне: *“Гэта ад сурокаў: праз клямку праліваюць і загаварываюць. Гэтую вадзічку даюць папіць. Тады ад супуду. У лесе нада найсці такі сучок, каб з дзірачкай. Тады тры разы праліваюць праз сучок і даюць папіць і змываюць дзіця”* [84]

Пры лекаванні дзіцячых хвароб выкарыстоўвалі на Падзвінні і сімволіку парога: “*калі дзіця часта крычыць, ды капрызіць, яго трэба адлупцаваць венікам на трох парогах*” [64, с. 133]; “*ад начніцы на пол рабёнка лажылі і венікам да парога каціл*і*, начніцу выганялі.*” [85]

З 2-й паловы ХХ ст. больш даступным для сельскага насельніцтва Падзвіння становіцца медыцынскае абслугоўванне, пашыраецца сетка аптэк і медыцынскіх установ: бальніц, фельдшарскіх пунктаў. Гэта прыводзіць да выцяснення з практыкі хатняга лекавання дзіцячых хваробаў магічныміі сродкамі. Часцей у хатняй практыцы лячэнння звярталіся да медыкаментаў: *“Ай, бывае, захварэе… Укрываеш, націраеш шкіпінарам з салам”.*[86] У канцы ХХ ст. адбываецца канчатковая страта пераемнасці магічных сродкаў лячэння дзяцей. Моцны ўплыў урбаністычнай культуры, сродкаў масавай інфармацыі, распаўсюджанне і даступнасць медыкаментаў прывялі да страты архаічнага пласта народнай культуры. Паступова паміраюць носьбіты народных медка-рытуальных практык не знайшоўшы пераймальнікаў і паслядоўнікаў. Найчасцей апытаныя намі ў этнаграфічнай экспедыцыі маладыя рэспандэнты адказваюць, што ў выпадку хвароб дзяцей звяртаюцца да сродкаў афіцыйнай медыцыны.

### 3.4 Дзіцячай мэбля, вопратка

Дзіцячая вопратка на тэрыторыі Падзвіння ў канцы XIX ст. не была разнастайнай. Народжанае немаўля апраналі звычайна ў “мятлік,” які ўяўляў сабой кавалак чыстага, мяккага палатна. У ім рабілася дзірка, куды прасоўвалі галаву дзіцяці. Прыкладна ў 4 – 6 месяцаў на немаўля апраналі кашульку (“рубашачку”). З нараджэння і да 6 – 9 месяцаў немаўля спавівалі, для гэтага выкарыстоўвалі чатырохвугольны кавалак палатна. Зверху спавіваюць “спавівач” (спецыяльны доўгі пояс) ці звычайны мужчынскі пояс. Прыкладна з 2-3 месяца на галоўку немаўляці апраналі шапачку (“чэпчык”). У такой шапачцы і кашульцы дзіця заставалася да

[84] Запісала Андрыеўская С.У. ад Іўкінай В.Ц., 1932 г.н, в. Ізгародзішча Чашніцкага раёна.
[85] Запісала Андрыеўская С.У. ад Каевай Т.А., 1939 г.н, в. Нурава Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці.
[86] Запісала Андрыеўская С.У. ад Іўкінай В.Ц., 1932 г.н, в. Ізгародзішча Чашніцкага раёна.



PolotskSU

таго часу, пакуль не пачынала добра хадзіць, пасля чаго на галаву дзяўчынцы завязвалі хустку, апраналі ёй кофту, а хлопчыку на доўгую кашулю апраналі жылетку. Штаны хлопцы пачыналі насіць пасля 4 гадоў, у некаторых выпадках і пазней. Прыкладна з гэтага ўзросту па сведчанні Я.Р. Раманава вызначался пэўная адзежа для дзяўчат і хлопчыкаў: дзяўчыты пачыналі насіць спадніцу і платок, а хлопчыкі – шапку. З дзіцячага абутку этнограф называе чаравікі і лапці [86, с. 23].

Паводле звестак палявога этнаграфічнага даследавання, адзежа дзяцей пачатку XX ст. таксама не была разнастайнай. Звычайна адзенне пераходзіла ад старэйшых дзяцей да малодшых. Пакупнога адзення было вельмі мала. Гэта тлумачылася беднасцю сялян і традыцыяй адносінаў да дзіцячай вопраткі: "*што стары з'есць, што малы зносіць – усё без толку,*" "*што п'яны з'еў, што малы знасіў –усё роўна*" [72, с. 14]. Часта адзенне для дзяцей перашывалі са старой вопраткі дарослых. Зафіксаваны цэлы комплекс народных "абгрунтаванняў" такой стратэгіі. У якасці прыклада прывядзем некалькі: "*Рабёнку трэба дзелаць пялёнкі са старых скацёрак-настольнікаў, тады яго жыццё будзе лёгкае, будзе ўсё жыццё гуляць*"[87] (в. Горкі Мёрскі раён); "*Рабілі са старога, каб адзежа добра насілася*"[88] (в. Стаўбцы Чашніцкі раён); "*Рабілі са старога, бо бедна жылі*"[89] (в. Заазер'е Полацкі раён) і г.д. Па ўспамінах рэспандэнтаў да трох гадоў дзеці хадзілі у доўгіх да калена (ці да падлогі) кашулях. Звычайна шылі дзецям адзенне з саматканага палатна, бо пакупное было дорага для сялянскай сям'і. З абутку большым дзецям куплялі боцікі, а зімой – "катанкі" (валенкі)[90]. Па словах рэспандэнтаў, часта адсутнасць вопраткі і, асабліва, абутку была прычынай па якой дзеці не хадзілі ў школу.

Лепей пачыналі апранаць дзяцей традыцыйна ў канцы падлеткавага – пачатку юнацкага перыяду, калі ім дазвалялася хадзіць на вечарынкі, знаёміцца і шукаць сабе пару. Асаблівую увагу надавалі вопратцы дзяўчат. У бліжэйшым горадзе імкнуліся набыць адрэзы тканіны на сукенкі, спадніцы, блузкі. Там жа набывалі упрыгожанні: сапраўдныя пацеркі, пярсцёнкі, завушніцы. Але такую магчымасць мелі далёка не ўсе [84, с. 141]. Па словах адной з рэспандэнтак, вясковыя дзяўчаты апраналіся бедна: "*Вот дачка падарыла мне начнушку. Адзела я яе, сяджу і думаю: каб мне такую ў моладасці, то, пэўна, на танцы ў ёй пайшла б… І была б самая красівая сукенка з усіх…*" [91]

Пачынаючы з 60 – 70 гг. XX ст. матэрыяльны ўзровень сямей павышаецца, становяцца даступнымі фабрычныя тканіны, абутак, прыходзіць у заняпад старажытнае ткацкае рамяство. Дзіцячую адзежу шыюць з фабрычных тканін, дзіцячыя рэчы можна набыць у крамах. У 70 – 90 гг. XX ст. для дзіцячага адзення характэрна падкрэсленае размежаванне палавой прыналежнасці (хлопчыкі –

[87] Запісала Андрыеўская С.У. ад Ляшкевіч А.Ф., 1935 г.н., в. Горкі Міёрскага раёна.
[88] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шэмет Н. Ф., 1933 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна.
[89] Запісала Андрыеўская С.У. ад Сенкевіч М.Ф., 1935 г.н., в. Семенец Полацкі раён Віцебскай вобласці.
[90] Запісала Андрыеўская С.У. ад Этміновіч Я.І., 1934 г.н., в. Іказнь Браслаўскага раёна.
[91] Запісала Андрыеўская С.У. ад Шэмет Н. Ф., 1933 г.н., в. Стаўбцы Чашніцкага раёна.



Polotsk SU

блакітнае, дзяўчаты – чырвонае, ружовае). Даследчыца Л.В. Ракава, напрыклад, падкрэслівае, што ў 2-й палове XX ст. адбываецца стандартызацыя дзіцячай вопраткі, яна страчвае сваю нацыянальную, сацыяльную, рэгіянальную адметнасць і набыла агульнаеўрапейскі характар [84, с. 147]. З гэтай высновай можна пагадзіцца.

Найбольш распаўсюджаны прадмет мэблі, прызначана непасрэдна для дзяцей – гэта калыска. На тэрыторыі Падзвіння калыскі выраблялі з дрэва, плялі з лазы існавалі і калыскі з тканіны (іх выкарыстоўвалі для таго, каб браць дзіця на працу ў поле). Дзіцячыя калыскі з тэрыторыі Падзвіння ў залежнасці ад прынцыпа дзеяння можна падзяліць на: зыбкі (мелі у канструкцыі спружыньваючыя элементы, дзякуючы якім "забаліся"), люлькі (па словах інфарматараў іх уласна і называлі "калыскі") – яны звычайна падвешваліся пасярэдзіне хаты "за бэльку", калыхаліся з боку ў бок. З дзіцячай калыскай звязаны цэлы комплекс архаічных традыцыйных вераванняў і забабонаў. Немаўля лічылася слаба абароненым ад ўздзеяння варожых сіл (нячысцікаў), і таму з яго пастаянным месцам знаходжання звязана такая колькасць забабонаў і перасцярог. У калыску дзіця не клалі да "кста," бо баяліся, што ў ёй "зыбаюцца" нячысцікі і могуць прычапіцца да немаўляці [71, с. 14]. На калыску не павінны свяціць сонцечныя і месяцовыя промні, бо яны з'яўляюцца дарогай да дзіцяці нячысцікаў. У калыску пырскалі ваду, асвячоную на Успенне, каб дзіця добра спала, клалі хлеб і соль, пшонны пірог, каб дзіця было паўнацелым [72, с. 24]. Праз калыску нельга было перадаваць ежу, інакш дзіця будзе "жарлівым," нельга было размаўляць, бо дзіця будзе "язычлівым," нельга было калыхаць калыску адразу удвух, інакш дзіця будзе плоха спаць і г.д. [Нікіфоровскій, с. 25 – 26]. Рэшткі старажытных забабонаў, звязаных з калыскай, дайшлі да нашых дзён у выглядзе розных забарон тыпу "*нельга калыхаць пустую каляску, бо рабёнак будзе хварэць"* і г.д. На Падзвінні пажадана было каб калыску зрабіў бацька, тады дзіця "будзе яго шанаваць," але калі дзеці ў сям'і часта паміралі, то імкнуліся пазычыць калыску ад тых людзей, у каго было шмат дзяцей. Таксама, калі ў сям'і часта паміралі дзеці, то ні маці ні бацька ні дапускаліся да ўсталявання калыскі, лічылася, што яе павінны ўладкаваць чужыя людзі [72, с. 23].

У фондах Нацыянальнага Полацкага музея-запаведіка захоўваецца некалькі палатняных люлек з тканіны. Іх выкарыстоўвалі для таго, каб маці маглі браць немаўлят з сабой у поле на працу. Усе люлькі датуюцца 1-й паловай XX ст.

Акрамя калыскі, шырока распаўсюджанымі прадметамі дзіцячай мэблі на Падзвінні ў кан. XIX – XX стст. былі: "стойка" і "хадуны." Іх функцыя – у абмежаванні рухаў дзіцяці, для таго, каб маці мела магчымасць выконваць працу па дому. Аб фізічным развіцці немаўляці ў такім выпадку турбаваліся мала, галоўнае было, каб яно "не нарабіла сабе шкоды". Па сведчаннях рэспандэнтаў, дзіця магло знаходзіцца ў іх некалькі гадзін запар, спраўляла ў іх натуральныя патрэбы.[92]

---

[92] Запісала Андрыеўская С.У. ад Ляшкевіч А.Ф., 1935 г.н., в. Горкі Міёрскага раёна.

У 1 – й пал. XX ст. прадметы дзіцячай мэблі (па ўспамінах інфарматараў) былі ў большасці самаробнымі. Толькі з 60-х г. XX ст. шырока распаўсюдзіліся прадметы прамысловай вытворчасці. Такія рэчы, як калыска, стойка часта перадавалі з пакалення ў пакаленне ці ад суседа да суседа ў вёсцы.

У кан. XX – пач. XXI стст. шырока распаўсюдзіліся даступныя, зробленыя з танных матэрыялаў "манежы," "хадуны," "стульчкі для кармлення," дзіцячая (паменшаных памераў) мэбля і г.д. Яны даступны як для гарадскога, так і для сельскага насельніцтва. Акрамя таго, іх функцыя, хутчэй, развіваць дзіця, даваць яму магчыма вольна і бяспечна рухацца, а не абмяжоўваць яго рухі, бо маці мае мае магчымасць надваць выхаванню дзіцяці больш часу.

Такім чынам, на працягу з кан. XIX да кан. XX стст. значна змяніўся асартымент дзіцячай мэблі, якую маглі выкарыстоўваць сем'і. Якасныя змены адбыліся і ў асартыменце дзіцячага адзення. Падобныя змены выкліканы не толькі паляпшэннем матэрыяльнага ўзроўню жыцця, але і зменай адносінаў да дзіцяці. Калі для кан. XIX ст. характэрна невысокая сацыяльная каштоўнасць дзяцей, то для канца XX ст – пачатку XXI стст., пры нізкай нараджальнасці, бацькі імкнуцца забяспечыць адзінае дзіця усім найлепшым.

Polotsksu

## ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ І ПРАКТЫЧНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ АТРЫМАНЫХ ВЫНІКАЎ

Вывучэнне асаблівасцей культуры розных рэгёнаў Беларусі з'яўляецца надзвычай перспектыўным напрамкам, бо дазваляе паглыбіць этналагічныя веды. Традыцыі выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі Падзвіння раней не даследаваліся ў рэгіянальным кантэксце. У дадзенай НДР такое даследаванне праведзена ўпершыню.

Атрыманыя ў выніку даследчай працы матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў выкладанні дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" у сярэдняй і вышэйшай школе, таксама ў выкладанні дысцыпліны "Этнаграфія Беларусі" у вышэйшай школе, у вучэбных курсах па падрыхтоўцы магістраў па спецыяльнасці 1 - 21 18 16 "Айчынная гісторыя."

Вынікі навукова-даследчай працы "Традыцыі выхавання и побыту дзяцей на тэрыторыі Падзвіння ў канцы XIX – пачатку XXI стст." знайшлі выкарыстанне ў рамках навуковага напрамку, прынятага ў адпаведнасці з Пастанаўленнем Савета Міністраў РБ ад 17 мая 2005 г. № 512 "Філасофска-светапоглядные перадумовы і логіка-метадалагічныя падставы грамадскага прагрэса і сацыяльнай устойлівасці, развіцця асобы, культуры і адукацыі, фарміравання ідэалогіі беларускага грамадства," у межах фундаментальнай праблемы, вырашаемай па дадзенаму напрамку УА "Полацкі дзяржаўны універсітэт": "Гістарычныя і сацыялагічныя даследаванні грамадскага і культурнага развіцця Полацкай зямлі."

Вынікі даследавання выкарыстоўваліся ў навучальным працэсе ў выкладанні дысцыпліны "Гісторыя Беларусі" у межах тэмы "Духоўнае і культурнае жыццё беларускага народа на мяжы XX – XXI стст.," таксама пры падрыхтоўцы студэнтамі да семінарскіх заняткаў, напісанні дакладаў і рэфератаў (акт аб укараненні вынікаў НДР).

Перспектыўным напрамкам для далейшых даследаванняў па праблеме з'яўляецца вывучэнне субкультуры дзяцей у XX ст., вывучэнне дзіцячага фальклору ў рэгіянальным кантэксце Падзвіння, вывучэнне традыцыйных метадаў лячэння дзяцей у народнай медыцыне Падзвіння.

Атрыманыя вынікі ў перспектыве таксама могуць выкарыстоўвацца ў выкладанні дысцыпліны "Этнаграфія Беларусі," для стварэння спец. курса "Этнаграфія дзяцінства" для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў спецыяльнасці "Гісторыя," пры падрыхтоўцы магістраў па спецыяльнасці "Айчынная гісторыя."

Polotsk SU

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Такім чынам, у выніку праведзенага даследавання па вывучэнню традыцый выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі Падзвіння ў кан. ХІХ – пач. ХХІ стст., можна зрабіць наступныя высновы.

Гістарыяграфія праблемы дастаткова шырокая, яе можна падзяліць на тры накірункі: этналагічныя працы, культуралагічныя і педагагічныя даследаванні. Недахопам даследаванняў з'яўляецца тое, што яны апісваюць побыт і выхаванне дзяцей, абагульняючы звесткі з розных этналагічных рэгіёнаў, не вызначаючы іх асаблівасці. Аднак, прыродныя і сацыяльныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі для кожнага этнаграфічнага рэгіёна з'яўляюцца ўнікальнымі, таму мэтазгодна разглядаць асаблівасці побыту і выхавання дзяцей у кожным з этнаграфічных рэгіёнаў асобна. Падзвінне мала вывучаны з пункту гледжання этнаграфіі дзяцінства рэгіён. Абагульняючых прац па этнаграфіі дзяцінства на тэрыторыі Падзвіння няма, што абумовіла неабходнасць дадзенага даследавання.

Традыцыйна выхаванне дзяцей ўплецена ў само жыццё народа. На тэрыторыі Падзвіння найбольш распаўсюджаным сродкам і метадам традыцыйнага выхавання з'яўлялася праца. Шырока на Падзвінні выкарыстоўваліся і этнакультурныя сродкі выхавання: прыказкі, прымаўкі, жарты, казкі, песні, звычаі, традыцыі. Умоўна можна вылучыць наступныя накірункі ў традыцыйным выхаванні на тэрыторыі Падзвіння: працоўнае, разумовае, фізічнае, маральнае, эстэтычнае, рэлігійнае выхаванне. Аднак, у рэальным жыцці гэтыя накірункі непарыўна звязаны і уключаны ў побыт. Таму асноўнымі прынцыпамі сямейнага выхавання з'уляюцца: цесная сувязь з жыццём, улік узроставых асаблівасцей, непарушнасць і пераемнасць выхаваўчага працэсу.

Важнае месца ў выхаванні дзіцей займала ўсведамленне імі сваёй ролі ў сям'і і грамадстве, што адбывалася праз сістэму роднасных і сваяцкіх адносінаў. Сям'я з'яўлялася асноўным асяродкам выхавання дзіцяці. Прынцыпамі сямейнага выхаванні былі: павага да продкаў, усведамленне дзецьмі важнасці сваёй ролі ў калектыўнай сямейнай працы, веданне сямейных роднасных сувязяў і падтрымка традыцый сваёй сям'і, рода.

Важнае месца для сацыялізацыі і выхавання дзяцей адырываў іх удзел у традыцыйных народных святах, абрадах. Для вясковага насельніцтва Падзвіння характэрна захаванне традыцый, звязаных са святкаваннем сямейных і календарных народных святаў. Некаторыя з іх захаваліся да ХХІ ст. Дзеці арганічна ўключаны ў сістэму традыцыйных абрадаў, святаў, народных вераванняў. Па дадзеных палявых даследаванняў яны адыгрываюць значную ролю ў святкаванні календарных свят і сямейных абрадаў. З дзецьмі звязана значная колькасць павер'яў і прыкмет, што сведчыць аб захаванні механізмаў перадачы нардных традыцый паміж пакаленнямі на працягу ХІХ – ХХ стст. Некаторыя архаічныя вераванні, прыкметы, рытуальныя дзеянні, звязаныя з дзецьмі, захаваліся аж да пачатку ХХІ ст.

Значную ролю ў традыцыйным выхаванні адыгрывалі цацкі і народныя гульні. Для тэрыторыі Падзвіння характэрны свой набор дзіцячых гульняў, якія адрозніваюцца ад іншых рэгіёнаў не толькі назвамі, але і асаблівасцямі іх правядзення. Цацкі Падзвінскага рэгіёна на працягу з кан. XIX да сяр. XX стст. захоўвалі архаічны выгляд і сюжэты. Вырабляліся майстрамі-рамеснікамі. Толькі пачынаючы з сяр. XX ст. змяняюцца матэрыялы з якіх вырабляюць цацкі, змяняецца іх асартымент, для шырокага кола дзяцей становяцца даступныямі пакупныя цацкі. Традыцыйныя ж цацкі, што вырабляюць народныя майстры ў XX ст. з дрэва, саломкі, гліны змяняюць свае функцыі і становяцца больш творамі мастацтва, чым дзіцячай забавай.

XX ст. стала перыядам змены дэмаграфічнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі ўвогуле і на тэрыторыі Падзвіння ў прыватнасці. Характэрная для традыцыйная грамадства ідэя шматдзетнасці сям'і знікае. У большасці сем'яў ў 2-й пал. XX ст. 1-2 дзіця, што прыводзіць да змены стаўлення да дзяцей. Змяняюцца якасна і ўмовы харчавання і побыту дзяцей на тэрыторыі Падзвіння. Калі для традыцыйнага грамадства кан. XIX ст. характэрна малая колькасць прадметаў дзіцячай мэблі і адзення, то для пач. XXI ст. характэрна значнае павелічэнне іх асартыменту. Значна змяніліся і ўмовы побыту, харчаванне, гігіенічныя прыёмы догляду за дзецьмі. Аднак, негледзячы на мадэрнізацыйныя змены, у народнай свядомасці насельніцтва Падзвіння засталося месца для традыцыйных народных магічных сродкаў лекавання дзяцей, яны перадаюцца з пакалення ў пакаленне. У выніку палявых даследаванняў знойдзена шмат прыкладаў захавання старажытных прыёмаў і метадаў, сродкаў лячэння дзяцей, забабонаў, павер'яў, рытуальных дзеянняў, якія практыкуюцца ў XX – пач. XXI ст., а вядомы яшчэ з кан. XIX ст.

Такім чынам, пастаўленыя ў навуковым даследаванні задачы вырашаны ў поўным аб'ёме, мэта даследавання дасягнута. Традыцыі выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі Падзвіння разгледжаны ў гістарычным генезісе з кан. XIX да пач. XXI стст.

Абраная методыка даследавання (этнаграфічнае назіранне, апісанне і абагульненне сабранага матэрыяла) дала магчымасць праслядзіць генезіс асноўных элементаў у працэсе выхавання дзяцей на працягу пазначанага гістарычнага перыяда. Тым не менш, дадзеная тэма не з'яўляецца вычарпанай. Магчымы далейшы працяг даследавання Падзвіння на вывучэнні рэгіянальнага дзіцячага фальклору, прыёмаў і метадаў лекавання дзяцей народнай медыцынай.

Матэрыялы, атрыманыя ў выніку даследавання, могуць быць выкарыстаны пры выкладанні спец. курса па "Этнаграфіі дзяцінства" для студэнтаў вышэйшых навучальных установ, таксама ў выкладанні тэм, звязаных з вывучэннем культуры па "Гісторыі Беларусі" ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Больш глыбокае вывучэнне народнай культуры, яе рэгіянальных адметнасцей спрыяе фарміраванню патрыятызму і нацыянальнай свядомасці ў навучэнцаў.

Polotsk SU

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Аверьянова, Н.И., Гаслова, А.А. Вскармливание ребёнка первого года жизни: Учеб. пособие / Н.И. Аверьянова, А.А. Гаслова. – Ростов-на-Дону: Феникс, 2007. – 192 с.
2. Андрыеўская С.У. Палявыя даследаванні Падзвіння па этнаграфіі дзяцінства летам 2010 г. // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А: Гуманитарные науки. – № 1 – 2011. – С. 92 – 98.
3. Андрыеўская С.У. Традыцыі сямейнага выхавання і побыт дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння: гістарыяграфія і крыніцы // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А: Гуманитарные науки. - №7. – 2009. – С. 71 – 74.
4. Андрыеўская С.У. Традыцыйныя прыёмы гадавання дзяцей на Падзвінні // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных даследаванняў у г. Полацку): зб. навук. прац рэспубл. навук.-практ. семинара. – Полоцк, 20-21 ноября 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 123 – 128.
5. Анимелле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. 2. – С. 111–268.
6. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Арлова Г.П. – Мн.: Народная асвета, 1993. – 120 с.
7. Арлова, Г.П. Прымаўкі і прыказкі – адна з крыніц маральнага выхавання / Арлова Г.П. // Народная асвета. – 1988. – №2. – С. 12 – 15.
8. Арлова, Г.П. Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: манаграфія / Г.П. Арлова, С.Р. Туболец; пад агульн. рэд. Г.П. Арловай – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава," 2008. – 162 с.
9. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора НАН Беларусі. – Фонд 6. – Воп. 11. – Спр. 247. – Л. 1 – 13; 2. – Спр. 261. – Л. 1 – 16; 3. – Спр. 273. – Сш.13. – Л. 1 – 30.
10. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. - СПб.: Наука, 1993 г. – 240 с.
11. Барташэвіч, Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г.А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 168 с.
12. Барташэвіч, Г.А. Фальклор у сістэме выхавання: этнапедагогіка // Адукацыя і выхаванне. Праблемы выхавання. – 1995. – № 1. – С. 71 – 75.
13. Беларусы: у 8 т. Т. 5. Сям’я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і інш.; Рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мн.: Бел. навука, 2001. – 375 с.
14. Болбас, В.С. Маральны ідэал этнічнай педагогікі беларусаў / В.С. Болбас


PolotskSU

// Народная асвета. – 1999. – № 6. – С. 148 – 153.
15. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С. Болбас – Мн.: Бел навука, 2004. – 173 с.
16. Вальченко, С.А. Фольклор как средство воспитания в народной педагогике Белорусов // “Скарына і наш час”: матэрыялы IV Международной научной конференции. Ч.2. – Гомель, 2008. – С. 145 – 149.
17. Витебская губерния: историко-географический и статистический обзор. Вып. 16. История. Природа. Население. Просвещение / В.М. Долгоруков. – Витебск, б.т. – 1890. – 387 с.
18. Воронецкая, Л.Н., Мелешко, Ю.В. Народная педагогика / Л.Н. Воронецкая, Ю.В. Мелешко. – Мн.: Красико-Принт, 2007. – 172 с.
19. Вяселле: Абрад./ Уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі; Муз. дадатак З. Я. Мажэйка; Рэд. тома В.К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 683 с. (Беларуская народная творчасць).
20. Грымаць, А.А. Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка : дапам. Для студэнтаў і выкладчыкаў / А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая. – Мн.: Бел. дзярж. пед ун-т імя М. Танка, 1996. – 191 с.
21. Грымаць, А.А. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч – Мн.: Універсітэцкае, 1999. – 254 с.
22. Григорьев, В.М. Народная педагогика игры. – Ч.2 / В.М. Григорьев – М.: ОДИ-International, 1996. – 86 с.
23. Гульні, забавы, ігрышчы / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы; уступ. арт., уклад., сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.Ю. Лозкі; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] – 3-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 530 с.
24. Даследаванне лакальных культур Беларусі / Міністэрства культуры РБ, УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.” – Мн.: Беларускі дзяржаўны ун – т культуры і мастацтваў, 2008. – 402 с.
25. Демидова, А.В. Семья и её институциональные изменения в Республике Беларусь: автореф. дис….канд.социол. наук: 22.00.01. / А.В. Демидова; Белорус. гос. ун-т, Мн., 2008. – 17 с.
26. Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах: дапаможнік / Склад. А.С. Емельянаў, Г.П. Харошка. – Віцебск: Выдавецтва УА “ВДУ імя П.М. Машэрава,” 2007. – 200 с.
27. Дзіцячы фальклор: зборнік фальклорных матэрыялаў / рэд. кал.: У.А. Васілевіч (навук. рэд.) і інш. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.
28. Дзіцячы фальклор / Склад., уступ. арт. Г.А. Барташэвіч; рэдкал. В.К. Бандарчык [і інш.]; рэд. тома К.П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 734 с.
29. Довнар-Запольский, М.В. Крестьянские игры в Минской губернии / М.В.

Polotsksu

Довнар-Запольский // Живая старина. – 1891. – Вып. 4. – С. 203–208.

30. Жлоба, С.П. Народная педагогика Полесья: по материалам этнографических исследований / С.П. Жлоба; науч. ред. Б.М. Лепешко. – Брест: БРГУ імя А.С. Пушкіна, 2002. – 324 с.

31. Жыцця адвечны лад: беларускія народныя прыкметы і павер'і / Кніга 2. / Уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча / Мінск: Беларусь, 2010. – 614 с.

32. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А.І, Гурскага; Уступ. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса. – 2-е выд., выпр. - Мн.: Бел. навука, 2003. – 429 с.

33. Кабакова, Г.И. Мать / Г.И. Кабакова // Славянские древности. Этнолингвистический словарь / Под ред. Н.И. Толстого. Т. 3. К (Круг) – П (Перепёлка). – М.: Международные отношения, 2004. – С. 203 – 208.

34. Казакова, І.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І.В. Казакова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 151 с.

35. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І.І. Калачова. – Мн.: НІА, 1999. – 179 с.

36. Калачова, І.І. Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI стст. / І.І. Калачова. – Мн.: "Беларуская навука," 2009. – 266 с.

37. Калачова, І.І. Этнапедагагічныя традыцыі беларусаў і іх уплыў на сучасную гарадскую сям'ю (з вопыту абследавання сямей г. Мінска) / І.І. Калачова. – Мн.: Бел. ун-т культуры і друку РБ, 1995. – 16 с.

38. Касцюкевіч С.У. Е.Р. Раманаў – даследчык побыту дзяцей беларусаў / С.У. Касцюкевіч // "Открыть миру душу белоруса..." Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння Еўдакіма Раманавіча Раманава (25-26 кастрычніка 2005, Гомель) / рэдкал.: А.Р. Яшчанка [і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – С. 138 – 141.

39. Касцюкевіч С.У. Семантыка і функцыі традыцыйных цацак беларусаў у XIX – XX стст.: аўтарэферат дысертацыі канд. іст. наук; спец. 07.00.07 / С.У. Касцюкевіч. – Мінск, 2004. – 20 с.

40. Касцюкевіч С.У. Цацка ў культуры беларусаў / С.У. Касцюкевіч // Праблемныя напрамкі развіцця мастацкай творчасці і вербальнай культуры нацыі: матэрыялы Міжнар. навук. канф. (20 – 21 ліст. 2003 г.). – Мн.: БДПУ, 2004. – С. 81 – 82.

41. Каспяровіч, М. Для чаго і як вывучаць быт дзяцей / М. Касьпяровіч // Наш край. – 1930. – № 3. – С. 15 – 20.

42. Киркор, А. Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографический сборник. – 1858. – Вып. 3. – С. 115 – 276.

43. Кон, И.С. Ребёнок и общество (историко-этнографическая перспектива) / И.С. Кон. – М.: Политиздат, 1967. – 383 с.

Polotsk SU

44. Кон, И.С. Материнство и отцовство в историко-этнографической перспективе / И.С. Кон // советская этнография. – 1987. – № 6. – С. 26 – 37.

45. Конан, У.М. Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У.М. Конан – Мінск: Маст. літаратура, 1989. – 238.

46. Костюкевич С.В. Традиционные суеверия белорусов в современном семейном воспитании детей / С.В. Костюкевич // Современная семья и проблемы семейного воспитания. Материалы международной научно-практической конференции в 2-х ч. Ч.1. – Могилёв: УО «Могилёвский государственный университет им. А. Кулешова», 2008. – С. 371 – 375.

47. Костюкевич С.В. Этнологическое изучение приёмов воспитания детей как направление краеведения / С.В. Костюкевич // Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ. Матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (28-29 сакавіка 2008 г.). Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна. – Брэст: “Альтэрнатыва,” 2008. – С. 84 – 88.

48. Крываносава, А.Э. Ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: Дысертацыя / Крываносава, А.Э. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 1998. – 106 с.

49. Кулинкович, К.А. Истоки этнической педагогики белорусов / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка / К.А. Кулинкович – Мн.: БГПУ, 1998. – 42 с.

50. Куновская, Л.П. Роль семьи в межпоколенческой трансляции национальных традиций / Л.П. Куновская // Социальные и социокультурные процессы в современной Беларуси: социол. анализ: сб. научн. трудов / редкол.: Е.М. Бабосов [и др.] – Мн., 2001. – Вып. 3. – С. 104 – 108.

51. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : кан. XIX – XX стст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

52. Кухаронак, Т.І. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэбна-метад. дапам. / Т.І. Кухаронак, В.Г. Кухаронак. – Мн.: Бел. дзярж. пед. ун-т, 2005. – 108 с.

53. Магілёўчык, З.К. Санітарна-гігіенічныя ўмовы хаты і двара беларускага сялянства / З.К. Магілёўчык // Наш край. – 1927. – №6 – 7. – С. 5 – 7.

54. Малахиев-Мирович, В. Воспитательное значение игрушек / В. Малахиев-Мирович // Игрушка. Её история и значение. Сб. ст. под ред. Н.Д. Бартрам [и др.]. – М.: тип. И.Д. Сытина, 1912. – С. 140 – 197.

55. Мид, М. Культура и мир детства: избранные произведения / М. Мид; пер. с англ. и коммент. Ю.А. Асеева; сост., авт. и послесл. и отв. ред. И.С. Кон. – М.: Наука, 1988. – 429 с.

56. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т.В. Валодзіна, А.І. Гурскі, Г.А. Барташэвіч. К.П. Кабашнікаў; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 439 с.

Polotsk SU

57. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / Собр. и приведена в порядок П.В. Шейном. Т. 1, Ч. 1. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – Санкт-Петерург: Императорская академия наук, 1887. – 585 с.

58. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / Собр. и приведена в порядок П.В. Шейном. Т. 1, Ч. 2. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – Санкт-Петерург: Императорская академия наук, 1890. – 712 с.

59. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / Собр. и приведена в порядок П.В. Шейном. Т. 2: Сказки, анекдоты, легенды, предания, воспоминания, пословицы, загадки, приветствия, пожелания, божба, проклятия, ругань, заговоры, духовные стихи и проч. – 1893. – XX, [1]. – 715 с.

60. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. / Собр. и приведена в порядок П.В. Шейном. Т. 3. Описание жилища, одежды, пищи, занятий, препровождения времени, игр, верований, обычного права наследства и проч. – СПб, 1902. – 535 с.

61. Маховская, И.С. Белорусская традиционная родинная обрядность в восточноевропейском контексте (кон. XIX – нач. XXв.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.07. / И.С. Маховская – Мінск, 1999. – 116 с.

62. Міхайлава, А.Л. Вопыт фарміравання маральнага і фізічнага здароўя дзяцей дашкольнага ўзросту у народнай педагогіцы / А.Л. Міхайлава // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия Е. Педагогические науки. – 2007. – № 5. – С. 61 – 65.

63. Міхайлава, А.Л. Фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы кан XIX - пач. XX стагоддзя: манаграфія / А.Л. Міхайлава. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава," 2007. – 153 с.

64. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі; уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай; навук. рэд А.С. Ліс. – Мінск: Беларуская навука, 2007. – 776 с.

65. Народная педагогіка беларусаў / У.М. Конан [і інш.] – Мінск : НІА, 1996. – 165 с.

66. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе/ М.П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 615 с.

67. Нарысы педагагічнай думкі беларускага народа / Я.І. Сярмяжка, Л.П. Паўлава, Л.Г. Зайцава. – Магілёў: МДУ, 1995. – 131 с.

68. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (НГА РБ). – Фонд 2502. – Воп. 1. – Спр. 707. – Л. 1 – 123.

PolotskSU

69. Нездемковская, Г. В. Актуальные проблемы развития этнопедагогики на современном этапе / Г.В. Нездемковская // Мир образования – образование в мире. Научно-методический журнал. – 2010. – № 1. – С. 66 – 73.

70. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии: Игры и игроки / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1897. – № 3. – С. 21 – 66.

71. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская тип., 1895. – 552 с.

72. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский; предисл. и коммент. А.М. Подлипского. – Х. – Витебск: Губ. типо-лит., 1897. – 336 с.

73. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / Рэд. кал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) і інш.; уклад тэкстаў, уст. артык. і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.

74. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого / Витебская губерния, тетрадь 1. – II – 1901. – 51 с.

75. Полацкі дзяржаўны рэгіянальны архіў. – Фонд 55. – Воп. 1. – Спр. 6. – Л. 1 – 12.

76. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып.1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1 / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 148 с.

77. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып.1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2 / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 332 с.

78. Покровский, Е.А. Физическое воспитание детей у разных народов преимущественно России / Е.А. Покровский // Известия императорского общества любителей естествознания, антропологии и этнографии. – 1884. – Т. 45. – Вып. 2. – 232 с.

79. Радзіны: Абрад. Песні / Уклад. і сістэм. тэкстаў Г.А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т.І. Кухаронак; уступ. арт. і камент. Г.А. Пятроўскай, Г.В. Таўлай, Т.І. Кухаронак; Рэдкал.: А.С. Фядосік і інш. – Мн.: Беларуская навука, 1998 . – 637 с.

80. Ракава, Л.В. Дынаміка структуры сям'і беларусаў / Л.В. Ракава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып.2 / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі; навук. рэд. А.І. Лакотка – Мн: Права і эканоміка, 2007. – С. 404 – 410.

81. Ракава, Л.В. Народная педагагічная сістэма / Л.В. Ракава // Адукацыя і выхаванне – 1996. – № 2. – С. 20 – 28.

82. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В.

Polotsk SU

Ракава – Мн.: Ураджай, 2000. – 111 с.
83. Ракава, Л.В. Традыцыйная мадэль дзяцінства: этнапедагогіка / Л.В. Ракава // Воспитание школьников. – 1998. – №5. – С. 29 – 35.
84. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л.В. Ракава. – Мн.: Беларуская навука, 2009. – 311 с.
85. Рожнова, П. Семья в народных традициях: этнопедагогика / П. Рожнова // Воспитание школьников. – 1998. – №5. – С. 29 – 35.
86. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вып. 8: Быт белоруса. – Вильно: Б. м., 1912. – 600 с.
87. Рудкоўская, А.Э. Маральны ідэал у беларускай народнай педагогіцы / А.Л. Рудкоўская // Веснік ВДУ. – 1997. – №2 (4). – С. 39 – 42.
88. Салееў, В.А Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы / В.А. Салееў. – Мн.: Нац. інстытут адукацыі, 1994. – 181 с.
89. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб.-метад. дапам / Аўтар-склад. Т.І. Кухаронак, В.Г. Кухаронак. - Мн.: БДПУ, 2005. – 108 с.
90. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
91. Сычова, І.С. Народная педагогіка Мазырскага Палесся. Метадычныя ўказанні і праграма-апытальнік для збора матэрыялаў па народным выхаванні для студэнтаў педагагічных ВНУ / І.С. Сычова. – Мазыр: Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І.П. Шамякіна, 2006. – 116.
92. Сычова, І.І. Прынцыпы эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / І.І. Сычова // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – № 10. – С. 65 – 74.
93. Сямёнава, В. Выхаванне ў беларускай сям'і: этнапедагогіка / В. Сямёнава // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – Вып.4. – С. 79 – 88.
94. Традиции семейного воспитания в народной педагогике: сборник материалов региональной научно-практической конференции (Брест, 27 апреля 2007 г.). – Брест: Бр ГУ, 2007. – 68 с.
95. Традыцыйная мастацкая культура Беларусаў. У 6 т. т. 2. Віцебскае Падзвінне. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мн., Бел. навука, 2004. – 910 с.
96. Туболец, С.Р. Сістэма метадаў эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / С.Р. Туболец // Народная асвета. – 2002. – № 11 – 12. – С. 50 – 52.
97. Фядосік, А.С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія / А.С.Фядосік. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 127 с.
98. Харузина, В.Н. Игрушки у малокультурных народов / В.Н. Харузина // Игрушка, её история и значение: сб. статей под ред. Н.Д. Бартрам [и др.]. – М.: Тип. тов-ва И.Д. Сытина, 1912. – С. 85 – 139.

99. Харузина, В.Н. Об участии детей в религиозно-обрядовой жизни / В.Н. харузина // Этнографическое обозрение. – 1911. – № 1 – 2. – С. 1 – 78.

100. Цітоў, В.С. Народная спадчына: матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў; навук. рэд. Г.В. Штыхаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

101. Чарадзейныя казкі: у 2 ч. Ч.1. / НАН Беларусі.ю Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч, рэд. выд. В.К. Бандарчыка. – 2-е выд., выпр.і. дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 639 с.

102. Чэчат, В.У. Педагогіка сямейнага выхавання: тэарэт.-метад. аспект / М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны інстытут адукацыі / В.У. Чэчат. – Мн.: НІА, 1995. – 195 с.

103. Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.М. Шпилевский. – Мн.: Беларусь, 2004. – 247 с.

104. Эльконін, Д.Б. Псіхологія ігры / Д.Б. Эльконін. – М.: Педагогіка, 1978. – 304 с.

105. Эстэтычнае выхаванне ў беларускай народнай педагогіцы: праграма і метадычныя рэкамендацыі да спец. курса студэнтам пед. ВНУ. – Мазыр: МПДУ, 2007. – 92 с.

106. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Беларус. сав. энцыкл., 1989. – 575 с.

107. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве / Т.А. Навагродскі. – Мінск: БДУ, 2009. – 335 с.

108. Якубінская, А.Д. Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX стагоддзяў: аўтарэф. ... дыс. канд. гіст.навук 07.00.07 / А.Д. Якубінская; Беларускі дзяржаўны універсітэт. – Мн., 2009. – 22 с.

109. Яцкевіч, Т.Д. Традыцыйная дзіцячая мэбля беларусаў і яе роля ў першапачатковым фізічным выхаванні / Т.Д. Яцкевіч // Традыцыйная фізічная культура беларусаў: гісторыя, тэорыя, практыка: матэрыялы II Рэсп. канф. па праблемах традыц. фіз. культуры беларусаў, Мінск, 15–16 крас. 1999 г. / БДПУ ім. М. Танка; рэдкал. Л.Н. Ціхаміраў [і інш.] – Мінск, 1999. – С. 140 – 142.

110. Матэрыялы інтэрнета / рэжым доступа: http://abcdefgh.livejournal.com/1072373.html / Час доступа: 03.01.2011.

PolotskSU